WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

16 ЛІСТАПАДА 2011 г.
СЕРАДА
№ 218 (27082)
Кошт 800 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## БЕЛАРУСЬ ПОЎНАСЦЮ ЗАБЯСПЕЧЫЛА СЯБЕ АСНОЎНЫМІ ВІДАМІ ПРАДУКТАЎ ХАРЧАВАННЯ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць немэтазгодным прыватызаваць прадпрыемствы харчовай галіны. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў у Барысаве, наведваючы Барысаўскі камбінат хлебапрадуктаў.**

«Ніякай прыватызацыі. Ні ў якім выпадку бяспеку (харчовую. — **Заўвага БЕЛТА**) людзей нельга аддаваць у чужыя рукі. Гэта ў крайнім выпадку. Якая тут можа быць прыватызацыя?!» — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Адносна арганізацый хлебапрадуктаў кіраўнік дзяржавы адзначыў, што калі хлеб усяму галава, то яе трэба трымаць у дзяржаўных руках. Ён падкрэсліў, што ў краіне была праведзена мадэрнізацыя камбінатаў па вытворчасці хлебапрадуктаў, арганізацый малочнай і мясной галіны. У гэта былі ўкладзены значныя дзяржаўныя сродкі. «Навошта нам сёння прадаваць тое, што працуе, прыносіць прыбытак?» — задаў рытарычнае пытанне Прэзідэнт.

«Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што калі іншаземец сюды прыедзе, то ён вывезе прыбытак. Ён нам не рэінвесціруе гэты прыбытак. А так гэты прыбытак застанецца ў дзяржаве, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Мы гэта прайшлі ўжо, калі нам абяцалі залатыя горы. Трэба спакойна развівацца самім. Нас ніхто цяпер не гоніць, і нам не трэба некуды бегчы. Таму бяздумнай прыватызацыі ў нас не было і не будзе».

Разам з тым Прэзідэнт не выключыў магчымасць работы ў гэтай сферы прыватных інвестараў, калі яны ствараюць новыя запатрабаваныя вытворчасці, рабочыя месцы. «Мы сыравінай дапаможам і іншым, калі ён стварыў гэту вытворчасць», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка патрабуе ў лістападзе-снежні спыніць шалёнае цэнаўтварэнне на прадукты харчавання. «Стратэгія такая, што гэта шалёнае цэнаўтварэнне да снежня трэба спыніць».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, часткова праблема з ростам цэн заключаецца ў тым, што ў Беларусі практычна няма антыманапольнага заканадаўства, а таму прадаўцы часам могуць беспакарана дамаўляцца аб кошце таго ці іншага тавару. «За гэта на Захадзе імгненна адкручваюць галаву, а ў нас усё гэта магчыма. Вось адкуль усё гэта цэнаўтварэнне».

«Таму ўсё, разбой скончыўся. З чым мы да новага года прыйдзем? Усё гэта ў лістападзе-снежні мы павінны зачысціць. Трэба ўсё ж на людзей глядзець больш. Вядома, людзі павінны варушыцца, працаваць, але і нельга людзей кожны дзень забіваць гэтымі цэнамі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама адзначыў, што на спажывецкім рынку станоўчую ролю адыграла правядзенне сезонных кірмашоў, дзе можна было купіць сельскагаспадарчую прадукцыю па цэнах вытворцаў.

Аляксандр Лукашэнка чакае зніжэння цэн на пастаўляемыя з Расіі энергарэсурсы ў 2012 годзе. «Я пакуль не гавару аб гэтым. Мы скажам з Дзмітрыем Мядзведзевым у бліжэйшы час, але цана ўжо і на прыродны газ будзе іншая, думаю, што і на нафту», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Гэта не значыць, што мы абвалім цану на нафту, на газ. Гэта мы ўсё збяром, накіруем у бюджэт для таго, каб падтрымаць людзей, у тым ліку пенсіянераў. Але замарожвацца нам трэба на гэтых цэнах».

Аграрыі Беларусі завяршылі ўсе палявыя работы. Па выніках уборачнай кампаніі краіна ў дастатковай колькасці забяспечыла сябе асноўнымі відамі прадуктаў харчавання, далажыў кіраўніку дзяржавы міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Міхаіл Русы. Кіраўнік дзяржавы актыўна цікавіўся станам спраў у малочнай і мясной галінах. Як далажыў міністр, і тут па ўсіх напрамках адзначаецца прырост вытворчасці. Беларусь у 2012 годзе паставіць у Расію 3,7 млн тон малочнай прадукцыі ў пераліку на малако і 220-280 тыс. тон цукру. Адпаведныя аб'ёмы паставак узгадняюцца з расійскім бокам, адзначыў Міхаіл Русы.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

## ВЫСОКАГА ПАЛЁТУ, САКОЛЕ!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сяргей ВУСАЎ з маладым паляўнічым сокалам па мянушцы Арлея.

**Упершыню ў гісторыі Беларусь будзе прадстаўлена сярод краін — членаў міжнароднай асацыяцыі па сакаліным паляванні на сустрэчы ў Абу Дабі, куды прыедуць прадстаўнікі краін, у якіх дазволена паляванне з лоўчымі птушкамі. Нашу краіну будзе прадстаўляць жыхар Віцебска Сяргей Вусаў — сапраўдны піянер у адраджэнні гэтага старажытнага віду палявання і адзін з лічаных яго аматараў. Некалькі гадоў таму камісія па справах ЮНЕСКА ўключыла сакалінае паляванне ў спіс нематэрыяльных культурных каштоўнасцяў як сапраўдны помнік сусветнай спадчыны.**

**Сягрей Вусаў быў адзін з ініцыятараў, якія дапамагалі распрацоўваць беларускае заканадаўства па правілах палявання. Дзякуючы гэтаму ў краіне з 2008 года з'явілася магчымасць развіваць пакуль экзатычнае для нас паляванне з крылатымі памочнікамі.**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### З ПАЧАТКУ ГОДА БЕЛАРУСЬ ПРЫЦЯГНУЛА 12,6 МЛРД USD ЗАМЕЖНЫХ ІНВЕСТЫЦЫЙ

**Паводле інфармацыі Нацыянальнага статыстычнага камітэта, сёлета за студзень—верасень у рэальны сектар эканомікі Беларусі (акрамя банкаў) замежныя інвестары ўклалі 12,6 млрд долараў інвестыцый, што ў два разы больш, чым за 9 месяцаў летась.**

Асноўнымі інвестарамі арганізацый нашай краіны былі суб'екты гаспадарання Расіі (47,8 працэнта ад агульнага аб'ёму замежных укладанняў), Аб'яднанага Каралеўства (21,3 працэнта), Кіпра (7,8 працэнта), Аўстрыі (6 працэнтаў). Самыя вялікія сродкі замежных інвестыцый былі накіраваны ў арганізацыі гандлю (33,7 працэнта ад усіх інвестыцый), транспарту (32,1 працэнта) і прамысловасці (25,7 працэнта).

Экспертамі падлічана, што пераважная большасць замежных інвестыцый была ўкладзена ў арганізацыі беларускай сталіцы (78 працэнтаў); на арганізацыі Гомельскай вобласці прыпадае 7,8 працэнта, Мінскай вобласці — 5,2 працэнта валавага паступлення замежных інвестыцый.

**Сяргей ПАЛІНІН.**

### ПАДРОБКІ НА 90 МІЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ

**Аператыўнікі па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі затрымалі ў абласным цэнтры больш за 3 тысячы кантрафактных дыскаў на суму амаль 90 мільёнаў рублёў, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

Гаспадаром нелегальнага тавару аказаўся афіцыйна непрацуючы жыхар беларускай сталіцы. У момант з'яўлення міліцыянераў ён рэалізоўваў частку прадукцыі мясцоваму прадпрымальніку, прычым ніякіх дакументаў прад'явіць не здолеў. Акрамя 133 дыскаў з запісамі, якія фігуравалі ў гэтай здзелцы, у мінчаніна былі яшчэ 3256 аналагічных адзінак, 900 DVD-дыскаў без запісу, а таксама футляры і паліграфічныя ўкладышы. Аператыўнікам гаспадар тавару паведаміў, што ў Гродна прыехаў па сваіх справах, а дыскі набыў для асабістага карыстання, перадаўшы частку з іх (дзе былі новыя фільмы) знаёмаму прадпрымальніку для прагляду.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

### ВАГОН СЫШОЎ З РЭЕК

**Адбылося гэта ў 19.50 у чацвер на 298-м кіламетры перагону «Жлобін Заходні — Чырвоны Бераг» падчас руху чыгуначнага саставу са станцыі «Жлобін» на станцыю «Асіповічы». З чыгуначнага палатна сышла хваставая частка паўвагона, які быў гружаны арматурай.**

Для выпраўлення наступстваў аварыі галаўную частку саставу адбуксіравалі на станцыю «Чырвоны Бераг», хваставую — на станцыю «Жлобін», паведамілі ў Цэнтры даследаванняў у галіне бяспекі жыццядзейнасці МНС. У 1.10 наступствы інцыдэнту былі ліквідаваны, пашкоджаны паўвагон знаходзіцца ў вагонарамонтным дэпо станцыі «Жлобін». Для высвятлення прычын здарэння створана камісія. Шкоды навакольнаму асяроддзю падчас зыходу з чыгуначнага палатна паўвагона не было. Рух цягнікоў на згаданым участку арганізаваны па другім пуці. Затрымкі ў руху не было.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

Міхаіл МЯСНІКОВІЧ:

# «ІНВЕСТАВАЦЬ У СУПРАЦОЎНІЦТВА З БЕЛАРУССЮ — НАДЗЕЙНА І ВЫГАДНА»

**Беларускі інавацыйны тыдзень учора пачаўся ў Мінску — у аглядзе экспазіцыі выставы інавацыйных праектаў беларускіх прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў, а таксама ў пленарным пасяджэнні прынялі ўдзел прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч, нобелеўскі лаўрэат Жарэс Алфёраў, а таксама прадстаўнікі 15 іншых дзяржаў.**

Прэм'ер-міністр пасля таго, як пазнаёміўся з найноўшымі распрацоўкамі беларускіх прадпрыемстваў, падчас свайго выступлення, звяртаючыся да ўдзельнікаў форуму, адзначыў, што дзейнічаць у інавацыйных галінах трэба рашуча і хутка:

— Трэба, каб ваша праца праходзіла па прынцыпе прамога дзеяння: рашэнні трэба прымаць хутка, дзейнічаць канкрэтна — ад ідэі і да выпуску прадукцыі. Для гэтага ў нас у краіне ёсць заканадаўства, адпаведная інфраструктура, фінансаванне і галоўная каштоўнасць — нашы высокакваліфікаваныя кадры навукоўцаў і спецыялістаў.

Міхаіл Мясніковіч нагадаў, што ў 2012 годзе прапануецца дадатковы пакет стымулаў для інавацыйнай і інвестыцыйнай дзейнасці: у прыватнасці, будзе зніжана стаўка падатку на прыбытак з 24 да 18%. Гэта, па яго меркаванні, у сукупнасці з укараненнем механізмаў пераносу страт на будучыя перыяды, паскоранай амартызацыі, зніжэння падаткаў для малога і сярэдняга бізнесу дадаткова пакіне ў распараджэнні прадпрыемстваў і арганізацый навуковай сферы каля 2 трыльёнаў рублёў.

— Таксама кіраўнік дзяржавы падтрымаў прапановы па змяненні Падатковага кодэкса ў частцы вызвалення ад падатку на прыбытак інавацыйнай прадукцыі, вызвалення ад падатку на нерухомасць і зямельнага падатку навуковых арганізацый, тэхнапаркаў, цэнтраў трансферу тэхналогій, — паведаміў прэм'ер-міністр. — Дадатковая лібералізацыя адбудзецца і ў аплаце працы вучоных: па рашэнні Прэзідэнта, якое прынята сёлета, на працягу 5 гадоў вызваляецца ад падаткаабкладання прыбытак, атрыманы ад перадачы маёмасных правоў на аб'екты прамысловай уласнасці. Для стымулявання непасрэдна вынаходнікаў і навукоўцаў на заканадаўчым узроўні прадугледжана, што аўтарам службовых твораў навукі будзе накіравана не менш за 40% сродкаў, атрыманых ад перадачы маёмасных правоў на гэтыя вынаходніцтвы. Такім чынам ствараюцца механізмы матывацыі непасрэдна для актывізацыі навуковай дзейнасці.

Дарэчы, па словах Міхаіла Мясніковіча, у наступным годзе дзяржава не плануе скарачаць выдаткі на развіццё навукі:

— Прапануючы на наступны год бездэфіцытны бюджэт і рэжым жорсткай эканоміі, урад, тым не менш, не скарачае, а, наадварот, плануе рэальны рост выдаткаў па трох галоўных артыкулах бюджэтных накіраванняў: навуцы, ахове здароўя і аплаце працы. Такім чынам, у дакументах сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2012 год прыярытэт аддаецца чалавеку, яго здароўю і інавацыйнаму патэнцыялу. На выкананне гэтых задач павінны працаваць усе — урад, мясцовыя органы, прадпрыемствы, прафсаюзы.

Прэм'ер-міністру спадабалася, што на выставе інавацыйных праектаў вельмі шмат праектаў, прысвечаных стварэнню камфортных умоў для жыцця чалавека, і ў прыватнасці — яго жылля. Гэта вельмі актуальна, бо ў наступным годзе з дзяржаўнай падтрымкай плануецца пабудаваць не менш за 2 мільёны квадратных метраў жылля:

— У 2012 годзе з дзяржаўнай падтрымкай мы пабудуем у краіне не менш за 2-2,5 мільёна кв.м. жылля, у стварэнні якога будзе прымаць удзел не толькі дзяржава, але і прафсаюзы, прадпрыемствы — яны таксама павінны рабіць важны ўнёсак у вырашэнне надзённых пытанняў чалавека. Для гэта ёсць усе падставы, — лічыць Міхаіл Мясніковіч. — Сёлета ў нас у эканоміцы значна вырасла рэнтабельнасць продажаў, прычым гэта тычыцца як прамысловасці, так і сельскай гаспадаркі. І выдатна, што наша прамысловасць ужо ў гэтым годзе перавысіла па аб'ёмах экспарту 60%-ы рубеж. Таму задача выйсці на 70% экспарту ад аб'ёмаў вытворчасці ў наступным годзе, якую ставіць урад, я мяркую, з'яўляецца рэальным рубяжом. Але для гэтага, безумоўна, павінна быць і канкурэнтаздольная інавацыйная прадукцыя.

Напрыканцы Міхаіл Мясніковіч запэўніў прадстаўнікоў замежных кампаній і іншых гасцей Беларускага інавацыйнага тыдня, што інвеставаць у нашу краіну выгадна.

СТАР. 2

### Беларускі рубель яшчэ ўмацаваўся

**Учора на адзінай сесіі Беларускай валютна-фондавай біржы долар патаннеў на 10 рублёў, еўра — на 140, расійскі рубель — на 4.**

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

**КУРСЫ НЕКАТОРЫХ БАНКАЎ НА 15 ЛІСТАПАДА**

**«Белінвестбанк»:** долар ЗША — 8650 і 8800; еўра — 11700 і 12100; расійскі рубель — 270 і 290.
**«Абсалютбанк»:** долар ЗША — 8670 і 8780; еўра — 11680 і 11950; расійскі рубель — 275 і 287.
**«Парытэтбанк»:** долар ЗША — 8700 і 8850; еўра — 11680 і 12100; расійскі рубель — 270 і 290.

## ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

В соответствии с условиями договоров срочного банковского вклада (депозита) ОАО «Белагропромбанк» сообщает об увеличении с 16 ноября 2011 года до 51% годовых размера **основной** процентной ставки по договорам срочного банковского вклада (депозита) «Двадцатка», заключенным в период с 21.03.2011 по 15.11.2011 года.

**Телефон Контакт-центра Банка – 136**
8.00-20.00 – рабочие дни, 8.00-18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

## ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

В соответствии с условиями договоров банковского вклада (депозита) до востребования «Пенсионный», заключенных на условиях, утвержденных протоколом Кредитного комитета ОАО «Белагропромбанк» от 04.04.2006 № 36, ОАО «Белагропромбанк» сообщает об установлении процентной ставки с 16 ноября 2011 года в размере 40% годовых.

**Телефон Контакт-центра Банка – 136**
8.00-20.00 – рабочие дни, 8.00-18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества | **Лот № 1.** Витрина барная, ширина 1,8 м. Описание: габаритные размеры 180х175 см, материал — металл, ДСП, стекло.<br>**Лот № 2.** Витрина барная, ширина 2,1 м. Описание: габаритные размеры 210х175 см, материал — металл, ДСП, стекло.<br>**Лот № 3.** Шкаф 3-секционный. Описание: габаритные размеры 60х20 см, материал – ДСП.<br>**Лот № 4.** Шкафчики для кухни (верх). Описание: габаритные размеры 2-х шкафчиков 80х65 см, материал – ДСП.<br>**Лот № 5.** Шкафчики для кухни (низ). Описание: габаритные размеры 2-х шкафчиков 80х85 см, материал – ДСП. |
| Собственник (владелец) имущества | ООО «Пэнлай» (г. Орша, ул. Комсомольская, 13/15, УНП 390285868) |
| Местонахождение (адрес) имущества | г. Орша, ул. Комсомольская, 13/15 |
| Стоимость имущества | Лот № 1 — 2 208 000 белорусских рублей (с учетом НДС).<br>Лот № 2 — 2 736 000 белорусских рублей (с учетом НДС).<br>Лот № 3 — 2 364 000 белорусских рублей (с учетом НДС).<br>Лот № 4 — 744 000 белорусских рублей (с учетом НДС).<br>Лот № 5 — 876 000 белорусских рублей (с учетом НДС) |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | Хозяйственный суд Витебской области г. Витебск, ул. «Правды», 32 16 декабря 2011 г. в 11.00 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Хозяйственный суд Витебской области. 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 324, http://vitebsk.court.by/ Судебный исполнитель Халков Дмитрий Вячеславович, тел./факс. (80212) 49 13 42, (8 029) 150 24 10, старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49 13 40 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670, не позднее 15.12.2011 г.<br>Минимальная величина первого шага — 5% стоимости лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

Супрацоўніцтва

### БЕЛАРУСЬ І АЗЕРБАЙДЖАН МАЮЦЬ НАМЕР НАРОШЧВАЦЬ ГАНДЛЁВА-ЭКАНАМІЧНЫЯ СУВЯЗІ

**БЕЛАРУСЬ і Азербайджан маюць намер нарошчваць гандлёва-эканамічныя сувязі. Імкненне да гэтага пацвердзілі прадстаўнікі дзвюх дзяржаў у час мерапрыемстваў у рамках афіцыйнага візіту ў Азербайджан дэлегацыі Нацыянальнага сходу Беларусі, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.**

У час візіту адбылася сустрэча кіраўніка беларускай парламенцкай дэлегацыі спікера Палаты прадстаўнікоў Уладзіміра Андрэйчанкі з прэзідэнтам Азербайджана Ільхамам Аліевым. Бакі абмеркавалі пытанні развіцця міждзяржаўных адносін і ўзаемадзеяння дзвюх краін у міжнародных арганізацыях. У цэнтры ўвагі была тэма нарошчвання гандлёва-эканамічных сувязяў і пашырэння кантактаў у гэтай сферы. «Старшыня Палаты прадстаўнікоў адзначыў нацэленасць беларускіх парламентарыяў на максімальнае садзейнічанне выніковым намаганням па ўмацаванні двухбаковага гандлёва-эканамічнага дыялогу», — праінфармавалі ў прэс-службе.

Для вядзення прадметнага дыялогу па развіцці эканамічнага супрацоўніцтва разам з беларускімі заканадаўцамі ў Баку прыбылі прадстаўнікі дзелавых колаў Беларусі. Візіт беларускай парламенцкай дэлегацыі ў Азербайджан прадоўжыцца да 17 лістапада.

### УКРАЛІ ЦЭЛЫ САД...

**У пенсіянера з в. Батчы (Кобрынскі раён), які арандаваў пладагадавальнік, невядомыя ўкралі 16 саджанцаў абрыкосаў, 10 — яблынь і 5 — груш.**

А рэкорд зладзеі паставілі ў Драгічынскім раёне, калі ў беспрацоўнага з в. Людвінова выкапалі 1000 саджанцаў маліны, 15 — туі, 10 — яблынь ды прыхапілі яшчэ і веласіпед. Заведзена крымінальная справа.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### ...А З ГАСПАДАРКІ ПІЛЫ

**У Аршанскі раённы аддзел унутраных спраў звярнулася кіраўнік сялянскай фермерскай гаспадаркі, якая паведаміла, што з тэрыторыі гаспадаркі нехта выкраў дзве цыркулярныя пілы.**

Страта ацэнена ў 5,6 мільёна рублёў. Падазраецца грамадзянін 1994 года нараджэння. Ён затрыманы. Заведзена крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### ПАДПАЛІЛА ДЗВЕРЫ...

**У інтэрнаце СЗАТ «Кварцмелпрам», які знаходзіцца ў в. Хаціслаў (Маларыцкі раён) успыхнуў пажар.**

Высветлена, што рабочая мясцовага СВК салляркай абліла дзверы аднаго пакоя і падпаліла іх. Агонь патушылі. Страты нанесены на 2,5 млн рублёў.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК» с 16 ноября 2011 г.

Вклады (депозиты) с плавающими процентными ставками, % годовых

| Сумма депозита, ед. валюты | 100 | 200 | 300 | 500 | 1 000 | 2 000 | 3 000 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Белорусские рубли** | | | | | | | |
| 1 – 1 000 000 | 45,00 | 46,00 | 47,00 | 51,00 | 51,15 | 51,25 | 51,35 |
| 1 000 001 – 10 000 000 | 45,50 | 46,50 | 47,50 | 51,10 | 51,20 | 51,30 | 51,40 |
| 10 000 001 и более | 46,00 | 47,00 | 48,00 | 51,15 | 51,25 | 51,35 | 51,50 |
| **Доллары США** | | | | | | | |
| 1 – 500 | 7,60 | 8,20 | 8,80 | 9,40 | 9,60 | 9,80 | 9,90 |
| 501 – 5 000 | 7,80 | 8,40 | 9,00 | 9,50 | 9,70 | 9,85 | 9,95 |
| 5 001 и более | 8,00 | 8,60 | 9,20 | 9,60 | 9,80 | 9,90 | 10,00 |
| **Евро** | | | | | | | |
| 1 – 500 | 7,60 | 8,20 | 8,80 | 9,40 | 9,60 | 9,80 | 9,90 |
| 501 – 5 000 | 7,80 | 8,40 | 9,00 | 9,50 | 9,70 | 9,85 | 9,95 |
| 5 001 и более | 8,00 | 8,60 | 9,20 | 9,60 | 9,80 | 9,90 | 10,00 |
| **Российские рубли** | | | | | | | |
| 1 – 15 000 | 8,60 | 9,20 | 9,80 | 10,40 | 10,60 | 10,80 | 10,90 |
| 15 001 – 150 000 | 8,80 | 9,40 | 10,00 | 10,50 | 10,70 | 10,85 | 10,95 |
| 150 001 и более | 9,00 | 9,60 | 10,20 | 10,60 | 10,80 | 10,90 | 11,00 |

Вклады (депозиты) с фиксированными процентными ставками, % годовых

| Сумма депозита, ед. валюты | 100 | 200 | 300 | 500 | 1 000 | 2 000 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Белорусские рубли** | | | | | | |
| 1 – 1 000 000 | 28,50 | 29,00 | 29,50 | 30,00 | 30,50 | 31,00 |
| 1 000 001 – 10 000 000 | 28,75 | 29,25 | 29,75 | 30,25 | 30,75 | 31,25 |
| 10 000 001 и более | 29,00 | 29,50 | 30,00 | 30,50 | 31,00 | 31,50 |
| **Доллары США** | | | | | | |
| 1 – 500 | 5,00 | 5,80 | 6,40 | 6,80 | 7,20 | 7,60 |
| 501 – 5 000 | 5,30 | 6,00 | 6,60 | 7,00 | 7,40 | 7,80 |
| 5 001 и более | 5,60 | 6,20 | 6,80 | 7,20 | 7,60 | 8,00 |
| **Евро** | | | | | | |
| 1 – 500 | 5,00 | 5,80 | 6,40 | 6,80 | 7,20 | 7,60 |
| 501 – 5 000 | 5,30 | 6,00 | 6,60 | 7,00 | 7,40 | 7,80 |
| 5 001 и более | 5,60 | 6,20 | 6,80 | 7,20 | 7,60 | 8,00 |
| **Российские рубли** | | | | | | |
| 1 – 15 000 | 6,00 | 6,80 | 7,40 | 7,80 | 8,20 | 8,60 |
| 15 001 – 150 000 | 6,30 | 7,00 | 7,60 | 8,00 | 8,40 | 8,80 |
| 150 001 и более | 6,60 | 7,20 | 7,80 | 8,20 | 8,60 | 9,00 |

Подробные условия вклада «Линия роста» в газетах: «Советская Белоруссия» № 49 от 16.03.2006, «Звязда» № 50 от 04.03.2006, на сайте банка в сети Интернет – www.belapb.by и в офисах ОАО «Белагропромбанк».
Информация о размере процентов, выплаченных по привлеченным средствам физических лиц в течение последнего финансового года, – в офисах и на сайте банка.
Полная сохранность и возврат денежных средств физических лиц, размещенных в ОАО «Белагропромбанк», гарантируются государством и осуществляются в соответствии с законодательством РБ.
Сведения о выплаченных процентах по привлеченным средствам физических лиц в 2010 году в эквиваленте, тыс. бел. руб.:

| | Январь | Февраль | Март | Апрель | Май | Июнь | Июль | Август | Сентябрь | Октябрь | Ноябрь | Декабрь | Итого |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Срочные вклады (депозиты) | 22 150 017 | 22 217 382 | 26 283 012 | 23 570 773 | 24 305 769 | 23 429 778 | 24 105 505 | 25 734 923 | 23 504 004 | 21 902 005 | 22 376 779 | 20 939 428 | 280 519 376 |
| До востребования | 109 717 | 112 167 | 154 527 | 147 164 | 130 440 | 153 009 | 175 320 | 208 613 | 207 977 | 209 476 | 234 959 | 253 869 | 2 097 239 |

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

Время работы Контакт-Центра Банка: 8.00 - 20.00 - рабочие дни; 8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни. Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) - по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

ISSN 1990 - 763X

**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.11.2011 г. (для б/н разлікаў)**

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 8 760,00 | 1 чэшская крона | 462,11 |
| ▼ 1 еўра | 11 930,00 | 1 польскі злоты | 2 700,74 |
| 1 латвійскі лат | 16 998,16 | ▼ 1 расійскі рубель | 286,00 |
| 1 літоўскі літ | 3 447,60 | 1 украінская грыўня | 1 091,93 |

**Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 30,6600 |
| 10 UAH | 38,2795 |
| 10000 BYR | 34,9601 |
| EUR | 41,6884 |

# ПЛАЦДАРМ

Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь

Выпуск № 7 (7)

## ДА ЎВАГІ АБІТУРЫЕНТАЎ!

*19 лістапада 2011 года ў 10.00 ваенны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта праводзіць дзень адчыненых дзвярэй.*

*Усіх цікаўных чакаюць па адрасе: г. Мінск, вул. Кастрычніцкая, 2 (праезд да станцыі метро «Першамайская»).*

*У праграме дня адчыненых дзвярэй: дэманстрацыя фільма аб ваенным факультэце БДУ, навучанні, жыцці і побыце курсантаў; сустрэча з камандаваннем факультэта; азнаямленне з жыццём і побытам курсантаў, элементамі вучэбна-матэрыяльнай базы ваеннага факультэта; тлумачэнне асаблівасцяў прыёму на ваенны факультэт у 2012 годзе.*

*Кантактныя тэлефоны:*
*(8 017) 209-52-83, (8 017) 209-52-81.*



# А ЗАЎТРА ЎЖО САЛДАТЫ

**Адпраўка новага папаўнення ва Узброеныя Сілы, іншыя войскі і воінскія фарміраванні пачалася ў Беларусі. 15 лістапада па ўсёй краіне было адпраўлена больш за 1200 прызыўнікоў. У Мінску ўрачыстыя мерапрыемствы прайшлі на базе Мінскага гарадскога зборнага пункта. Ужо праз месяц, 17 снежня, навабранцы Узброеных Сіл прымуць Ваенную прысягу.**

**Да 30 лістапада для праходжання тэрміновай ваеннай службы плануецца прызваць каля дзесяці тысяч чалавек. Акрамя гэтага, для праходжання службы ў рэзерве ў гэты перыяд плануецца адправіць каля дзвюх тысяч чалавек.**

**Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.**



Ёсць такая прафесія

# НА СУВЯЗІ!

**ВАЕННАЯ сувязь — неад'емны складнік сістэмы кіравання Узброенымі Сіламі краіны. Яна забяспечвае камандаванню магчымасць у маштабе часу, блізкім да рэальнага, рэагаваць на ўсе змены ў ваенна-палітычнай і ваенна-стратэгічнай абстаноўцы.**
**Сёння госць «Плацдарма» — начальнік сувязі Узброеных Сіл — начальнік упраўлення сувязі Генеральнага штаба Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь генерал-маёр Генадзь КАЗАКОЎ.**



### ПАДМУРАК

**— Генадзь Станіслававіч, якое значэнне можна даць сучаснай ваеннай сувязі?**

— Гэта найважнейшая частка тэхнічнай асновы сістэмы кіравання Узброенымі Сіламі, складаны шматфункцыянальны арганізм, што ўключае шматлікія вузлы сувязі рознага прызначэння, многія тысячы кіламетраў ліній радыё, радыёрэлейнай, трапасфернай, праваднoй і іншых відаў сувязі. Войскі сувязі знаходзяцца ў пастаяннай гатоўнасці да выканання задач па перадачы ўсіх відаў інфармацыі ў вызначаныя тэрміны.

**— Найноўшая тэхніка, сучасныя тэхналогіі?**

— Безумоўна! Развіццё айчыннай радыёэлектронікі і тэхнікі дазволіла перайсці да новых прынцыпаў стварэння сістэм сувязі і ўкараніць больш эфектыўныя комплексы сродкаў сувязі і аўтаматызацыі.

Аднак у той жа час сама па сабе тэхніка, якой бы дасканалай яна ні была, не вырашае ўсе задачы. Сувязь арганізуецца і забяспечваецца, перш за ўсё, людзьмі. Бесперапыннасць і якасць сувязі абумоўлена прафесійным майстэрствам кожнага: афіцэра, прапаршчыка, сяржанта, салдата.

**— Яшчэ ў старадаўнія часы якасць сувязі залежала ад канкрэтнага чалавека — яго рэакцыі, назіральнасці...**

— Сапраўды, у сваім развіцці ваенная сувязь прайшла вялікі і складаны шлях: ад найпрасцейшых гукавых і зрокавых сродкаў сувязі для перадачы сігналаў і каманд непасрэдна на полі бою да шырока разгалінаваных шматканальных аўтаматызаваных сістэм, здольных забяспечваць сувязь практычна на неабмежаваную далёкасць, як са стацыянарнымі, так і з рухомымі аб'ектамі, якія знаходзяцца на зямлі, на вадзе, пад вадой і ў паветры...

Як асобны род войскаў войскі сувязі былі створаны 20 кастрычніка 1919 года. У гэты дзень загадам Рэўваенсавета Савецкай Рэспублікі ў складзе Палявога штаба было сфарміравана ўпраўленне сувязі. Служба сувязі была выдзелена ў спецыяльную службу штабоў, а войскі сувязі — у самастойныя спецыяльныя войскі. Тым самым была закладзена структура сучасных войскаў сувязі.

Гісторыя войскаў сувязі не толькі вялікая, але і легендарная. У гады Вялікай Айчыннай вайны 303 воіны-сувязісты былі ўганараваны званнем Героя Савецкага Саюза, 12 чалавек сталі поўнымі кавалерамі ордэна Славы, амаль 600 часцей сувязі ўзнагароджаны ордэнамі, 58 сталі гвардзейскімі.

Высока ацанілі ўклад ваенных сувязістаў у агульную справу Перамогі над ворагам у Вялікай Айчыннай вайне вядомыя савецкія палкаводцы Георгій Жукаў, Аляксандр Васілеўскі, Канстанцін Ракасоўскі і іншыя. Нават прэзідэнт ЗША Тэадор Рузвельт у ліпені 1944 года ў тэлеграме Іосіфу Сталіну пісаў: «Імклівасць наступу Вашых армій дзівосная, і я вельмі хацеў бы мець магчымасць наведаць Вас, каб паглядзець, як Вам удаецца падтрымліваць сувязь з наступаючымі войскамі і гарантаваць забеспячэнне».

**— Гісторыя войскаў сувязі багатая на выдатныя баявыя традыцыі — а калі гаварыць пра дзень сённяшні?**

— Завершана рэфармаванне войскаў сувязі, яны здольныя выканаць усе задачы па забеспячэнні кіравання войскамі ў мірны і ваенны час. Адзначу, што гэта адзін з нямногіх радоў спецыяльных войскаў, які і ў мірны час выконвае не ўмоўныя, а рэальныя баявыя задачы.

**— ???**

— Рэальна перадаюцца сігналы баявога кіравання, усе віды інфармацыі, як у моўным выглядзе, так і ў плане перадачы звестак. Таму ўсе лініі сувязі, усе баявыя пасты працуюць рэальна.

Вопыт у арганізацыі сувязі нашы войскі назапашваюць у ходзе правядзення тактыка-спецыяльных і камандна-штабных вучэнняў, даследчых камандна-штабных ваенных гульняў. Калі, напрыклад, асабовы склад войскаў сувязі выходзіць на вучэнні для вырашэння пэўных задач, якія нечакана ўзніклі, разгортваецца палявы складнік, які нарошчвае стацыянарную сістэму сувязі, — і тут паток інфармацыі істотна павялічваецца.

### МАЙСТЭРСТВА

**— Войскі сувязі — у пастаяннай баегатоўнасці, і гэта яшчэ раз засведчыла сумеснае аператыўнае вучэнне «Шчыт Саюза-2011».**

— Гэта аксіёма: майстэрства дасягаецца неперапыннай падрыхтоўкай і ўдасканаленнем работы. Напрыклад, увесь гэты год праводзіліся розныя тактыка-спецыяльныя і камандна-штабныя вучэнні, радыёсеансы, трэніроўкі па сувязі, кантрольныя заняткі... Сумеснае аператыўнае вучэнне Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі «Шчыт Саюза-2011» стала, безумоўна, ключавым мерапрыемствам падрыхтоўкі войскаў сувязі ў гэтым годзе. Яно было накіравана, перш за ўсё, на праверку функцыянавання аб'яднанай сістэмы сувязі рэгіянальнай групоўкі войскаў (сіл).

Ставілася на мэце павышэнне ўзроўню гатоўнасці органаў ваеннага кіравання і войскаў сувязі нашых краін да арганізаванага разгортвання і ўстойлівага функцыянавання аб'яднанай сістэмы РГВ(С) пры адбіцці агрэсіі супраць Саюзнай дзяржавы.

У ходзе вучэння на палігонах Расійскай Федэрацыі была разгорнута камбінаваная сістэма сувязі і забяспечана яе спалучэнне з расійскай сеткай электрасувязі агульнага карыстання. Для яе разгортвання і эксплуатацыі была прыцягнута значная колькасць асабовага складу і тэхнікі сувязі.

На вучэннях было забяспечана функцыянаванне 30 вузлоў сувязі рухомых пунктаў кіравання, пабудавана 62 км радыёрэлейных і 37 км праваадных ліній сувязі, арганізавана 98 радыёсетак і радыёнапрамкаў, 5 напрамкаў спадарожнікавай сувязі. На вузлах сувязі пунктаў кіравання з РУП «Ростэлекам» было выдзелена 17 каналаў танальнай частаты і 6 лічбавых патокаў Е1, разгорнуты абаненцкія сеткі аўтаматычнай засакрэчанай і адкрытай сувязі РГВ(С).

Войскі сувязі апрабіравалі шырока разгалінаваную лічбавую сістэму сувязі РГВ(С), якая дазволіла прадаставіць баявому складу пунктаў кіравання інтэграваны трафік (мова, відэа, перадача даных) і забяспечыла ў поўным аб'ёме ўсе віды сувязі.

Баявое прымяненне сіл і сродкаў сувязі ў ходзе вучэння засведчыла арганізацыйную і тэхнічную сумяшчальнасць сістэм сувязі аб'яднанняў узброеных сіл Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Мы развіваемся ў адным накірунку, выкарыстоўваем адзіныя стандарты і пратаколы ў развіцці сродкаў сувязі.

### ПЕРСПЕКТЫВЫ

**— Якія кірункі дзейнасці па развіцці сістэмы сувязі найбольш прыярытэтныя?**

— Мы далі адказ на пытанне, якое аблічча павінна мець сістэма сувязі, каб забяспечыць непарыўнае кіраванне групоўкамі войскаў. Упраўленнем сувязі Генеральнага штаба Узброеных Сіл выбраны і абгрунтаваны сістэматэхнічныя рашэнні развіцця перспектыўнай лічбавай сістэмы сувязі — на падставе аналізу сусветных тэндэнцый развіцця ваенных сістэм сувязі, дасягненняў у галіне развіцця тэлекамунікацыйных тэхналогій, тэхнічных характарыстык перспектыўных лічбавых сродкаў і комплексаў сувязі, што распрацоўваюцца ў цяперашні час. Прычым удасканаленне сістэмы сувязі Узброеных Сіл вядзецца адначасова па некалькіх кірунках.

Мы ідзём па шляху мадэрнізацыі наяўных і стварэння новых сродкаў і комплексаў сувязі, што базуюцца на лічбавых метадах і спосабах перадачы ўсіх відаў паведамленняў. Ствараюцца сродкі адаптыўнай радыё-, радыёрэлейнай, трапасфернай сувязі, аўтаматызаваных камутуемых сетак валаконна-аптычнай сувязі з выкарыстаннем пакетнай перадачы інфармацыі, дзе функцыі каналаўтварэння, камутацыі, шыфравання і кіравання аб'яднаныя ў адно тэхнічнае прыстасаванне.

Усё гэта дазваляе скараціць колькасць абслуговага персаналу і тэхнікі сувязі, павысіць устойлівасць, мабільнасць і прапускную здольнасць сістэмы ў цэлым.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

### ВІЗІТОЎКА

Генадзь Станіслававіч Казакоў нарадзіўся ў студзені 1964 года ў вёсцы Семукачы Магілёўскага раёна.

У 1985 годзе з адзнакай скончыў Ульянаўскае вышэйшае ваеннае камандное вучылішча сувязі. Служыў у 86-й брыгадзе сувязі: камандзірам узвода сувязі дыстанцыйнага кіравання палявога вузла сувязі, памочнікам начальніка аператыўна-тэхнічнага аддзялення штаба брыгады, начальнікам радыёцэнтра палявога вузла сувязі, начальнікам штаба, начальнікам вузла сувязі брыгады.

Пасля заканчэння (з адзнакай) у 2000 годзе Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь — начальнік штаба — намеснік камандзіра 86-й брыгады сувязі, камандзір 127-й гвардзейскай брыгады сувязі.

У 2003—2005 гг. — слухач Ваеннай акадэміі Генеральнага штаба Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 жніўня 2005 года прызначаны начальнікам сувязі Узброеных Сіл — начальнікам упраўлення сувязі Генеральнага штаба Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Купальная акрабатыка

# У КАЛЫСЦЫ НЯБЁСАЎ

**Хто з нас у сваіх марах не лятаў над аблокамі? Хто хоць раз не ўяўляў сваё надземнае вандраванне? Упэўнена: многія ў снах луналі над прасторамі, былі вышэй за ўсё і за ўсіх, адчувалі асалоду ад палёту...**
**Ды не толькі ў сне — і ў рэальным жыцці даводзіцца бываць паміж небам і зямлёю ўдзельнікам Нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па парашутнай купальнай акрабатыцы.**

### Што за спорт такі?

Купальная акрабатыка з'яўляецца адным з самых відовішчных відаў парашутнага спорту. У каманду ўваходзяць чатыры спартсмены і відэаапаратар. Задача акрабатаў — за 90 секундаў выканаць максімальную колькасць перастраенняў з купалаў раскрытых парашутаў. Адлік часу пачынаецца тады, калі пабудавана першая так званая «этажэрка» з чатырох купалаў. Пасля гэтага верхні спартсмен павінен разарваць сувязь з другім і перамясціць свой парашут пад ніжняга акрабата. Затым наступны, хто падняўся ўгору, па такім жа прынцыпе апускаецца ўніз. Гэтая схема перастраенняў называецца ратацыяй, час выканання якой не павінен перавышаць 90 секундаў.

На жаль, каб паглядзець купальную акрабатыку, купіць білеты ў першым радзе недастаткова, ды і не патрэбна. Гледачу, які валодае нават самым лепшым зрокам, убачыць майстэрства спартсменаў проста немагчыма. А ўсё таму, што дзеянне адбываецца на вышыні 2,2 — 4,5 тысячы метраў над зямлёй.

Дык як тады журы ацэньвае акрабатаў? Для гэтага якраз і патрэбен відэаапаратар. Ён здымае спартсменаў ад моманту, калі яны пакідаюць верталёт, да таго, як ратацыя будзе выканана. Відэаапаратар тут значна адрозніваецца сваімі навыкамі ад тых людзей, якіх мы ўяўляем, называючы гэтую прафесію. У акрабатыцы — гэта спартсмен, задача якога не проста зняць сюжэт. У першую чаргу, відэаапаратар павінен быць добра падрыхтаваным, бо працуе ён таксама падчас палёту.

Зразумела, што пры здымках у такіх умовах павінна быць і камера спецыяльная. Яна ўяўляе сабой шлем з «вочкамі», які апаратар надзявае сабе на галаву. Ні дождж, ні снег не з'яўляюцца перашкодай для гэтага відэапрыстасавання. Такім чынам, вынік спаборніцтва ў многім залежыць ад апаратара, яго майстэрства і прафесіяналізму. Добрая відэаздымка — матэрыял, на падставе якога журы выносяць свой вердыкт.

Дарэчы, спаборніцтвы транслююцца ў прамым эфіры. Не па тэлебачанні, вядома, а на экранах у суддзяў, якія пры праглядзе лічаць колькасць перастраенняў і засякаюць час, каб ён не перавышаў вызначаны. Назіраць за парашутыстамі-акрабатамі могуць і гледачы ў спецыяльна адведзеных для іх месцах, дзе ўсталяваны аналагічныя экраны. Менавіта дзякуючы відэаздымцы трэнер пэўнай каманды можа зрабіць так званую работу над памылкамі.

### Пра чырвона-зялёныя парашуты і непранікальныя камбінезоны

Можа, я кагосьці і абнадзею, але ўсё ж павінна сказаць, што паўтарыць практыкаванні па купальнай акрабатыцы на звычайным парашуце практычна немагчыма. Для гэтага віду спорту прызначаны спецыяльныя парашуты. У чым іх асаблівасці? Па-першае, вялікая хуткасць. Па-другое, мінімальны час раскрыцця. Сярэдняя хуткасць парашута складае 18 метраў у секунду, што дазваляе зрабіць максімальную колькасць перастраенняў. Па-трэцяе, яны ўстойлівыя да любых умоў надвор'я. І, што немалаважна, парашуты беларускай зборнай па купальнай акрабатыцы па сваёй афарбоўцы нагадваюць дзяржаўны сцяг нашай краіны. Вось такая своеасаблівая візітная картка беларусаў на міжнародных спаборніцтвах.

Што датычыцца абмундзіравання спартсменаў, то варта адзначыць, што камбінезоны не гараць і пры кантакце са стропамі парашута. Ад тэмпературных перападаў і ветру твар абараняюць шлем і спецыяльныя акуляры. На руках — пальчаткі, на нагах — звычайныя красоўкі. Праўда, тэрмін службы такога касцюма нядоўгі: пры інтэнсіўных трэніроўках задумвацца аб абноўцы не прыходзіцца толькі год. Чаго не скажаш пра парашуты, трываласці якім хапае не менш як на тры гады.

### Сцежка перамог і планы на будучыню

Прадстаўляючы нашу краіну на міжнародным узроўні, Нацыянальная каманда па купальнай парашутнай акрабатыцы не раз вярталася на радзіму з добрымі вынікамі. На Кубку свету, які ў 2007 годзе праходзіў у Харватыі, спартсмены сталі двухразовымі сярэбранымі прызёрамі. Бронзу беларускія парашутысты атрымлівалі ажно тройчы: на чэмпіянаце свету ў Нідэрландах і двойчы на чэмпіянаце Расіі.

— Узровень падрыхтоўкі беларускай зборнай па купальнай акрабатыцы пераўзышоў шмат якія краіны, у якіх за плячыма вельмі значны вопыт, — гаворыць начальнік пошукава-выратавальнай і парашутна-дэсантнай службы 50-й змешанай авіяцыйнай базы, капітан Нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па парашутнай купальнай акрабатыцы маёр Генадзь Клішэўскі. — Наперадзе нас толькі французы і рускія. Таму нам ёсць яшчэ да чаго імкнуцца.

Зараз Нацыянальная зборная рыхтуецца да чэмпіянату свету, які хутка пройдзе ў Аб'яднаных Арабскіх Эміратах. Трэніруюцца спартсмены на базах часцей Ваенна-паветраных сіл. Наогул, парашутысты ўдасканальваюць свае навыкі на працягу цэлага года. Колькасць скачкоў за гэты час дасягае двухсот. Пастаянна набіраецца моладзь, якая ў будучыні стане годнай зменай дзейнаму складу каманды.



Незямная прыгажосць!

### Не толькі прыгожа «танцуюць», але і людзей ратуюць

Не толькі на міжнародным узроўні прадстаўляе каманда па купальнай акрабатыцы нашу краіну. Абараняе яна сваю радзіму і на тэрыторыі Беларусі: усе яе ўдзельнікі не толькі спартсмены, але і вайскоўцы пошукава-выратавальнай і парашутна-дэсантнай службы 50-ай змешанай авіяцыйнай базы Ваенна-паветраных сіл і войскаў СПА.

Як і ўсе ваеннаслужачыя авіяцыйнай базы, яны нясуць адказнасць за выратаванне экіпажаў паветраных суднаў, якія церпяць бедствы, дзень і ноч сочаць за бяспекай краіны. Зразумела, што сярод вайскоўцаў далёка не ўсе маюць шанцы трапіць у Нацыянальную зборную Беларусі па купальнай акрабатыцы, але патрабаванні да ваеннаслужачых аднолькавыя.

— Большасць кадраў для нас рыхтуе Добраахвотнае таварыства па садзейнічанні арміі, авіяцыі і флоту (ДТСААФ), — расказвае Генадзь Клішэўскі. — Мы прыглядаемся, знаёмімся з маладымі людзьмі і прапаноўваем ім прыходзіць да нас на службу. Але аднаго жадання мала. Не сакрэт, што спецыяліст па авіяцыі павінен мець добрае здароўе. Таму спецыялісты пошукава-выратавальнай і парашутна-дэсантнай службы абавязкова праходзяць ваенна-лётную камісію, а таксама пробныя выпрабаванні.

На высокім узроўні ў выратавальнікаў павінна быць і фізічная падрыхтоўка, што садзейнічае больш якаснаму выкананню абавязкаў. Немалую ролю адыгрывае і рэакцыя. Выратавальніку трэба хутка думаць і прымаць адпаведныя рашэнні. А самым галоўным вайскоўцы лічаць прыстойнасць, бо ў паветры людзі залежаць адзін ад аднаго. Акрамя таго, што ім трэба аказваць дапамогу пацярпелым, неабходна быць гатовым і да падстрахоўкі таварыша. Такую «школу выжывання» вытрымліваюць толькі тыя, каму гэта па сілах не толькі фізічна, а і псіхалагічна.

— Усе, хто працуе на авіяцыйнай базе, застаюцца тут надоўга, — гаворыць Генадзь Іванавіч. — А тым больш не пакідаюць сваёй любімай справы парашутысты. Не буду хлусіць, калі скажу, што купальная акрабатыка з'яўляецца самым прыгожым відам спорту. Хто, як не мы, за некалькі секундаў можа ўбачыць адразу трэцюю частку планеты?

**Вераніка КАНЮТА.**



**Капітан нацыянальнай каманды Беларусі па парашутнай купальнай акрабатыцы маёр Генадзь Клішэўскі, прапаршчык Аляксандр Мароз, старшы прапаршчык Сяргей Хлябіч, трэнер каманды старшы прапаршчык Пётр Грыгаровіч, капітан Яўген Рыбка.**

Тэрытарыяльная абарона

# Блакіраваць і знішчыць!

**На працягу некалькіх дзён, з 31 кастрычніка па 4 лістапада, па даручэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з мэтай праверкі эфектыўнасці сістэмы тэрытарыяльнай абароны прайшло камандна-штабное вучэнне з Узброенымі Сіламі, іншымі войскамі і воінскімі фарміраваннямі.**

Праходзіла вучэнне ў два этапы. На першым асаблівая ўвага надавалася планаванню тэрытарыяльнай абароны і арганізацыі яе ўсебаковага забеспячэння. На другім адпрацоўваліся пытанні кіравання сіламі тэрытарыяльнай абароны пры ліквідацыі наступстваў ужывання сапернікам зброі, а таксама падчас узброенай барацьбы.

Для ўдзелу ў камандна-штабным вучэнні ў штабы зон тэрытарыяльнай абароны і падраздзяленні тэрытарыяльных войскаў з запасу было прызвана каля 400 чалавек. Апрануўшы ваенную форму, яны аднавілі свае навыкі і ўменні.

Заключны этап камандна-штабнога вучэння з сіламі тэрытарыяльнай абароны адбыўся на Гожскім палігоне ў Гродзенскай вобласці. За ўмелымі дзеяннямі прызваных з запасу ваеннаслужачых назіраў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка.

У адпаведнасці з задумай вучэння былі адпрацаваны практычныя пытанні сумесных дзеянняў тэрытарыяльных войскаў, падраздзяленняў сіл спецыяльных аперацый, унутраных войскаў, Дзяржаўнага пагранічнага камітэта па ахове, абароне важных ваенных і дзяржаўных аб'ектаў, выяўленні, блакаванні і знішчэнні незаконных узброеных фарміраванняў.

Удзельнікам вучэнняў давялося аператыўна рэагаваць на розныя сітуацыі.

На адным з этапаў вучэння, паводле задумы, група ўзброеных асоб ажыццявіла прарыў праз Дзяржаўную мяжу Беларусі. У выніку сутыкнення з падраздзяленнямі Дзяржаўнага пагранічнага камітэта незаконнае ўзброенае фарміраванне панесла страты, а частка яго адарвалася ад пераследу і схавалася ў лесе. Сіламі пагранічнага атрада і падраздзяленняў унутраных войскаў МУС, дыслакаваных у Гродзенскай вобласці, у памежжы былі перакрыты найбольш верагодныя шляхі прарыву незаконнага ўзброенага фарміравання, ажыццяўляўся агляд транспартных сродкаў, каб выключыць пранікненне ў блакаваныя раёны аўтамабіляў са зброяй, выбухоўкай і харчам.

У выніку правядзення спецслужбамі і праваахоўнымі органамі краіны аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў стала вядома, што ўцалелая частка баевікоў сканцэнтравалася на адным з закінутых хутароў, дзе абсталявала базавы лагер. Тут жа ішло назапашванне зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў.

Камандуючаму сіламі спецыяльных аперацый Узброеных Сіл паставілі задачу правесці вайсковую аперацыю па блакаванні і знішчэнні выяўленага саперніка, быў распрацаваны план правядзення аперацыі.

Каб перашкодзіць дзеянням незаконнага ўзброенага фарміравання, раён ізалявалі, перакрылі найбольш верагодныя шляхі прарыву баевікоў, выставілі кантрольна-прапускныя пункты, абсталявалі блок-пасты.

На адным з магчымых кірункаў руху дыверсійнай групы быў выстаўлены кантрольна-прапускны пункт у складзе ўзвода тэрытарыяльных войскаў, экіпажу БТР мабільнай роты, стралковага ўзвода мабільнай заставы пагранічнай групы, а таксама экіпажу ДАІ.

Праз некаторы час з боку населенага пункта Гожа паказаўся аўтобус, які рухаўся ў кірунку КПП. Нарад, які нёс службу на КПП, загадаў кіроўцу спыніцца для праверкі дакументаў і правядзення агляду. Але ў адказ прагучалі стрэлы.

Падчас перастрэлкі баевікі былі знішчаны.

Камандзір мабільнага батальёна прыняў рашэнне на даразведку раёна меркаванага базавання незаконнага ўзброенага фарміравання з выкарыстаннем беспілотнага авіяцыйнага комплексу. Звесткі пра знаходжанне базавага лагера пацвердзіліся.

У выніку разведкі былі ўдакладнены каардынаты лагера, высветлены прыкладная колькасць баевікоў, іх узбраенне...

Камандзір мабільнага батальёна ўдакладніў задачу камандзірам падраздзяленняў сіл спецыяльных аперацый, унутраных войскаў, Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, тэрытарыяльных войскаў.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*



# НА СУВЯЗІ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)*

Айчыннымі прадпрыемствамі праводзіцца больш за 15 вопытна-канструктарскіх работ па мадэрнізацыі існуючых і распрацоўцы новых перспектыўных сродкаў і комплексаў сувязі.

Усе работы вядуцца з выкарыстаннем перадавых інфармацыйна-тэлекамунікацыйных тэхналогій і накіраваны на дасягненне ўмоў для інтэграцыі доступу і паслуг, высокай прапускной здольнасці і ўстойлівасці пры забеспячэнні кіравання войскамі (сіламі) і зброяй ва ўсіх звёнах упраўлення і ў любой абстаноўцы. Зроблена нямала. Пераважная большасць стацыянарных вузлоў сувязі перааснашчана на лічбавае тэлекамунікацыйнае абсталяванне. Спраектаваны і пабудаваны валаконна-аптычныя лініі сувязі агульнай працягласцю больш як 100 км. Арганізавана праца лічбавых сістэм перадачы інфармацыі. Зманціраваны сучасныя айчынныя лічбавыя АТС, аб'яднаныя ў адзіную міжгарнізонную аўтаматычную сетку сувязі.

Ужо сёння забяспечана тэхнічная магчымасць прадастаўлення канальнага рэсурсу, у тым ліку ў засакрэчаным выглядзе, для арганізацыі відэаканферэнцсувязі, перадачы даных у карпаратыўнай інфармацыйнай сетцы Узброеных Сіл з ахопам стацыянарных і рухомых пунктаў кіравання.

Дзеля далейшага развіцця тэрытарыяльнай сістэмы сувязі спраектаваны і вядуцца работы па будаўніцтве высокахуткасных магістральных лічбавых радыёрэлейных ліній сувязі. Гэта дазволіць значна павысіць устойлівасць і прапускную здольнасць сістэмы сувязі, а таксама знізіць фінансавыя выдаткі на арэнду каналаў сувязі.

Для кіравання лічбавай сістэмай сувязі УС створана аўтаматызаваная сістэма, якая вырашае задачы маніторынгу і аўтаматызацыі кіравання, кантролю і адлюстравання інфармацыі пра стан лічбавых сістэм перадачы і іх элементаў. Гэта сістэма дазваляе ў крызісных сітуацыях у кароткія тэрміны прымаць аптымальныя рашэнні і даводзіць каманды да падначаленых пунктаў кіравання сувяззю ў рэальным маштабе часу.

На сёння выканана значная частка работ па мадэрнізацыі рухомых комплексаў сувязі ваеннага прызначэння. Істотна пашыраны магчымасці комплексных апаратных сувязі Н-18-1М, станцый трапасфернай сувязі Р-423, радыёрэлейных станцый Р-409М, рухомых радыёстанцый сярэдняй магутнасці Р-140М і Р-161А2М, палявых аўтаматычных тэлефонных станцый П-178М, камандра-штабных машын Р-142Н і г.д. Больш як 110 адзінак тэхнікі, мадэрнізаванай сіламі і сродкамі войскаў сувязі, паступіла ў злучэнні і воінскія часці; яны пацвердзілі сваю эфектыўную і бесперабойную працу ў тым ліку ў час вучэнняў «Шчыт Саюза-2011».

Дадам, што мы сумесна з Дзяржаўным ваенна-прамысловым камітэтам развіваем сваю нацыянальную сістэму спадарожнікавай сувязі, і ўжо ў недалёкай будучыні ў нас будзе ўласная сістэма спадарожнікавай сувязі.

**— Сувязіст — прафесія перспектыўная. Дзе рыхтуюць спецыялістаў для войскаў сувязі?**

— У Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь, Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі. Улічваючы асноўныя тэндэнцыі развіцця сістэмы сувязі, аснашчэння войскаў сучаснымі сродкамі і комплексамі сувязі, адбываецца пераход ад падрыхтоўкі вузкапрофільнага спецыяліста да спецыяліста, здольнага эксплуатаваць сучаснае інфатэлекамунікатыўнае і сеткавае абсталяванне.

Для павышэння эфектыўнасці вучэбнага працэсу з 2012 года на факультэце сувязі і аўтаматызаваных сістэм кіравання Ваеннай акадэміі адкрываецца навучанне па новай спецыяльнасці «Эксплуатацыя сродкаў і сетак сувязі, кіраванне падраздзяленнямі сувязі».

Падрыхтоўка малодшых спецыялістаў сувязі вядзецца ў Вышэйшым дзяржаўным каледжы сувязі.

**ВЕРА**

**— Генадзь Станіслававіч, навучальныя ўстановы вы сам заканчвалі толькі з адзнакай — можна сказаць, выдатнік па жыцці... Вы як сувязіст, здымаючы тэлефонную трубку, прамаўляеце: «На сувязі»?**

— Не, згодна з ваеннай традыцыяй, прадстаўляюся: называю воінскае званне і прозвішча. Па-за службай — як і ўсе, звычайна: «Так» або «Слухаю вас».

**— Родам вы з вёскі Семукачы, менавіта там жывуць бацькі?**

— На жаль, у мяне толькі бацька, ён жыве ў Магілёве.

**— Якім відам сувязі аддаеце перавагу пры кантактах з роднымі?**

— Як і ўсе грамадзяне Беларусі, карыстаюся гарадскім тэлефонам або сотавым. Я не выкарыстоўваю нейкіх «звышнатуральных» відаў сувязі: мне дастаткова таго, што ў наяўнасці.

**— А складаецца ўражанне, што начальнік сувязі — ён абавязкова павінен быць на такой сувязі...**

— Не. А калі раптам трэба абмеркаваць з бацькам нейкія нашы сакрэты, еду да яго альбо выклікаю да сябе.

**— Не давяраеце сувязі?**

— Ну, могуць жа быць і нейкія вельмі прыватныя справы!

**— Кабінет шмат можа расказаць пра гаспадара. Побач з партрэтамі кіраўнікоў у вашым кабінеце — ікона Георгія Пераможцы.**

— Перад адпраўкай на вучэнні нас наведваюць прадстаўнікі Праваслаўнай Царквы. Сёлета перад адпраўкай на вучэнні ў Астраханскую і Ніжагародскую вобласці нас благаславіў айцец Георгій і ўручыў ікону Георгія Пераможцы. Яна пабывала з намі на вучэннях «Шчыт Саюза-2011», дапамагала паспяхова выканаць усе пастаўленыя задачы.

**— Вы чалавек веруючы?**

— Я хрышчоны чалавек, таму веру ва ўсё добрае.

**— А вось здымак, дзе вы з сям'ёй...**

— Гэты здымак зроблены на выпуску з Ваеннай акадэміі Генеральнага штаба — я разам з сынам Аляксеем і жонкай Аленай. Яны прыязджалі да мяне на выпуск у Маскву... Сям'я пастаянна са мной па жыцці, дапамагае і натхняе ў ваенных справах.

Сыну днямі споўнілася 18 гадоў, ён студэнт Вышэйшага дзяржаўнага каледжа сувязі.

**— Па вашым шляху пайшоў!**

— Спадзяюся, ён знойдзе сваё месца ў жыцці, і мы разам будзем забяспечваць плённае развіццё сувязі.

**— Жонка таксама мае дачыненне да сувязі?**

— Не, яна медыцынскі работнік.

**— Цікава, а чым займаецца кіраўнік войскаў сувязі ў вольны ад сувязі час?**

— Напэўна, вы звярнулі ўвагу, што ў маім кабінеце шмат кветак?

**— У кабінеце проста аранжарэя... Гэта ўсё — вы?**

— І сам, і разам з жонкай садзілі, і супрацоўнікі ўпраўлення сувязі дапамаглі.

**— Можна толькі здагадвацца, як добраўпарадкавана ваша дача...**

— Дачу пабудаваў уласнымі рукамі, толькі бацька дапамагаў... Вырошчваем там і кветкі, і бульбу, і памідоры... На рынак не хаджу: уся гародніна свая. Дарэчы, вырошчваем мы ў тым ліку і вінаград — прыязджайце, дам расаду!

**— Колькі ж у вас сотак?**

— Восем. Сам ару, сам кашу, сам сею і вырошчваю!

**— Сапраўдны беларускі мужчына! А родную мову, дарэчы, ведаеце?**

— І мову ведаю, і многія вершы нашых цудоўных паэтаў. Мая сястра — выкладчыца беларускай мовы і літаратуры, так што ёсць з кім папрактыкавацца!

**— Дзякуй за гутарку. А пажаданне ваенным сувязістам ад «Звязды» не будзе арыгінальным: няхай сувязь заўсёды будзе без заган!**

**Таццяна ПАДАЛЯК.**

Афіцэры

# ЛЁС — ЗВЫЧАЙНЫ? НЯЛЁГКІ, ВАЕННЫ!

**Ёсць людзі, пра жыццё якіх можна здымаць кіно. І ў Мінску жыве чалавек з яркім лёсам, вартым увагі кінарэжысёра. Гэта генерал-лейтэнант у адстаўцы Уладзімір Шаўцоў. У 57 ён пакінуў ваенную службу. Калі да выслугі дадаць яшчэ і 15 гадоў выкладання ў Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь, то агульны стаж складзе і наогул паўстагоддзя!**



## Дзяцінства з пахам пораху

Нарадзіўся Уладзімір Шаўцоў 2 лістапада 1937 года ў сям'і рабочага, у горадзе Новачаркаску Растоўскай вобласці. Яго дзяцінства бясхмарным не назавеш. Калі пачалася вайна, Валодзю было ўсяго чатыры гады. Але дзіцячая памяць зафіксавала многае: і самалёты, якія нізка ляцяць над вёскай, і падпаленыя палі, дзяцей і жанчын, якія ўцякаюць ад бамбёжак. Бацька пайшоў на фронт у 1941-м, шафёрам прайшоў усю вайну ў разведвальным падраздзяленні, сяржантам вярнуўся дадому. «Ён быў майстрам на ўсе рукі», — успамінае сын пра бацьку.

Памятае Уладзімір Ціханавіч і горад Мілерава. Тут ён вучыўся ў сярэдняй школе, тут жа закахаўся ў сваю аднакласніцу Людмілу, якая стала першым і адзіным яго каханнем і спадарожніцай на ўсё жыццё. У школе ён меў добрую рэпутацыю: вучыўся на «выдатна», сур'ёзна захапляўся футболам, актыўна займаўся грамадскай дзейнасцю, выбіраўся сакратаром камсамольскай арганізацыі. Дарэчы, дагэтуль яны з жонкай сустракаюцца са школьнымі таварышамі, каб успомніць юнацтва. Іх не палохае адлегласць. Шкада толькі, што з кожным годам за святочным сталом становіцца ўсё больш і больш пустых месцаў.

Пасля школы ў 1957 годзе, атрымаўшы павестку, Уладзімір Шаўцоў накіраваўся на ратную службу ў далёкую, невядомую тады яму Беларусь. Пункт знаходжання — станцыя Заслонава. За варотамі КПП — 100-ы асобны вучэбны танкавы батальён 3-й танкавай дывізіі 7-й танкавай арміі. Бязвусых, захопленых навабранцаў сустрэлі афіцэры, якія прайшлі Вялікую Айчынную вайну. Камандзір батальёна Бандарэнка, намеснік камандзіра батальёна Герой Савецкага Саюза Васільеў, камандзір роты Семірэнка... Уладзімір Ціханавіч, як па пісаным, пералічвае людзей, якія вучылі яго армейскаму жыццю. Мінула больш за пяцьдзясят гадоў, а ён дагэтуль памятае кожнага. Менавіта ў арміі сяржант Шаўцоў зразумеў: сваё далейшае жыццё ён абавязкова звяжа з ваеннай службай.

## Ад сяржанцкіх лычак да зорак генерала

Пасля звальнення ў запас у 1958 годзе амаль увесь узвод, у якім служыў Шаўцоў, адправіўся скараць ваенныя вучылішчы. Уладзімір выбраў гвардзейскае танкавае вучылішча ў Харкаве.

Па размеркаванні малады лейтэнант патрапіў у Паўночнакаўказскую ваенную акругу. У 1965 годзе афіцэра накіроўваюць для праходжання ваеннай службы ў горад Кяхту Забайкальскай ваеннай акругі. У 30 гадоў з пасады камандзіра роты Уладзімір Ціханавіч паступае ў Акадэмію бранятанкавых войскаў, пасля паспяховага заканчэння якой яго размяркоўваюць у Групу савецкіх войскаў у Германіі. Там за пяць гадоў ён прайшоў шлях ад камандзіра танкавага батальёна да камандзіра танкавага палка.

Затым была служба ва Уральскай ваеннай акрузе. У Свярдлоўску праслужыў пяць гадоў, а потым зноў яму прапанавалі... павучыцца. Гэтым разам у Акадэміі Генеральнага штаба Узброеных Сіл СССР. Менавіта там у 1982 годзе Уладзімір Ціханавіч атрымаў генеральскія зоркі і быў накіраваны ў Сімферопаль камандзірам 32-га армейскага корпуса.

Геаграфія службы афіцэра становіцца ўсё шырэй і шырэй. І вось амаль праз трыццаць гадоў лёс вяртае генерал-маёра Шаўцова ў той пункт, з якога пачынаўся яго армейскі шлях. У загадзе значылася: «Беларуская ваенная акруга. Горад Барысаў. Камандуючы 7-й танкавай арміі».

«Можа, нарэшце скончылася наша чамаданнае жыццё», — зацеплілася надзея ў сям'і афіцэра. Але «спакойная» служба доўжылася нядоўга. У верасні 1985 года Шаўцова выклікаў камандуючы акругі: «Ганарыся, міністр абароны прызначае цябе камандуючым 39-й арміі Забайкальскай ваеннай акругі». У той час 39-я армія дыслакавалася ў Мангольскай Народнай Рэспубліцы. У яе склад уваходзіла пяць дывізій агульнай колькасцю сто дванаццаць тысяч чалавек. Гэта было чарговае сур'ёзнае выпрабаванне для генерала, якое Уладзімір Ціханавіч вытрымаў з гонарам і годнасцю.

Ужо праз паўтара года ён атрымаў павышэнне па службе, прыняў пасаду начальніка штаба — першага намесніка камандуючага войскаў Прыкарпацкай ваеннай акругі. А затым была служба памочнікам прадстаўніка ГК ОВС дзяржаў — удзельніц Варшаўскага Дагавора ў Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы.

Здарылася так, што з Патсдама Шаўцоў вяртаецца зноў у Львоў. Але свет ужо не быў ранейшым. Неўзабаве затрашчаў і развалiўся Савецкі Саюз, служыць якому афіцэр прысягаў шмат гадоў. Перад ваеннымі людзьмі паўстала пытанне: «Што рабіць далей?». І многія, як і мой суразмоўца, прынялі адзінае правільнае для сябе рашэнне. Не прыняўшы прысягу на вернасць украінскаму народу, генерал-лейтэнант Уладзімір Ціханавіч Шаўцоў звольніўся ў запас.

На яго парадным мундзіры зіхацяць чатыры ордэны: «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» III ступені, Чырвонай Зоркі, Чырвонага Сцяга (Мангольскай Народнай Рэспублікі) і Дружбы народаў (Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі), больш за дваццаць медалёў. Пра іх я даведалася з асабовага лістка па ўліку кадраў афіцэра. Падчас гутаркі пра свае ўзнагароды ён сціпла змоўчаў, таму што не ўзнагародамі і не зоркамі на пагонах вызначае ён сваё жыццё. Застацца сабой у часы ўсеагульнай ломкі, калі поспех-няўдача мераўся грашыма, а ўяўленні пра афіцэрскі гонар часам ставіліся пад сумневы, значна важней.

## Мастацтва быць афіцэрам

Мы гутарым з Уладзімірам Ціханавічам пра тыя гады. Ён нешматслоўны. І відаць, што нялёгка даюцца яму гэтыя ўспаміны. Генерал-лейтэнант Шаўцоў пайшоў у запас. Але як сысці ў запас ад мінулага?

Кожны, хто звязаў свой лёс з ваеннай службай, ведае, што рана ці позна прыйдзе дзень развітання са службай, калі ў святочнай абстаноўцы будзе зачытаны адпаведны загад міністра абароны. Але, на жаль, у біяграфіі генерал-лейтэнанта Шаўцова гэтага ўрачыстага моманту не было. Ва ўпраўленні кадраў яму проста ўручылі выпіску з загада і падзяку міністра абароны. Не, ён не застаўся за бортам. Яго веды, велізарны жыццёвы досвед, ваеннае майстэрства аказаліся запатрабаванымі. Але няўжо такія праводзіны заслужылі людзі, якія ўсё сваё жыццё аддалі служэнню Айчыне? І хто б яны ні былі — прапаршчыкі або лейтэнанты, падпалкоўнікі або генералы — яны вартыя таго, каб у апошні дзень ваеннай службы на страявым пляцы пачуць на свой адрас словы ўдзячнасці.

Гэтаму сёння вучыць прафесар кафедры аператыўнага майстэрства Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь генерал-лейтэнант запасу Уладзімір Ціханавіч Шаўцоў і сваіх вучняў (дазвольце так назваць слухачоў камандна-штабнога факультэта Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь). Вучыць будучых военачальнікаў бачыць перад сабой перш за ўсё чалавека, а не пагоны. І як шкада, што некаторыя афіцэры, пакідаючы сцены акадэміі, забываюць урокі мудрага настаўніка. Авалодаўшы аператыўным майстэрствам у рамках вучэбнай праграмы, ваенныя людзі павінны не выпусціць важнае — заўсёды і ва ўсім быць Афіцэрам з вялікай літары.

## Прафесія — афіцэрская жонка

Уладзімір Ціханавіч і Людміла Данілаўна выхавалі дзвюх дачок і двух унукаў. Дарэчы, адзін з іх — старшы лейтэнант Дзяніс Кір'янаў — пайшоў па слядах дзеда і стаў ваенным, а дзесяцікласнік Максім пакуль толькі марыць пра афіцэрскія пагоны.

Асаблівай увагі заслугоўвае верная спадарожніца генерала Шаўцова. Памятаеце вядомы фільм «Афіцэры», дзе камандуючы, гутарачы з сябрам, паказвае яму свае ўзнагароды і ківае на жонку: «Палова — яе!». Нешта падобнае ў нашай гутарцы сказаў пра сваю жонку Уладзімір Ціханавіч: «Ды не пра мяне трэба пісаць, а пра яе, пра маю жонку, каханую і адзіную».

Ажаніўшыся ў далёкім 1965 годзе, яны праз гады пранеслі каханне, клопат і пяшчоту. Людміла Данілаўна чакала каханага з арміі, з ваеннага вучылішча, а затым памяняла разам з мужам трынаццаць (!) месцаў службы. За 48 гадоў сумеснага жыцця яна асвоіла самую цяжкую прафесію — быць афіцэрскай жонкай.

## Пасляслоўе

У кожнага чалавека лёс індывідуальны. Не будзе адкрыццём і тое, што час і месца дзеяння накладваюць свой адбітак на людзей. І ў гэтым сэнсе генерал Шаўцоў — не выключэнне. У чымсьці ён самабытны і арыгінальны, у ім адчуваецца прыроджаная інтэлігентнасць і празмерная сціпласць, але ў нейкіх паваротах жыццёвага шляху ён паўтарае лёс сваіх аднагодкаў і сучаснікаў. Сказаць, што лёс у яго нялёгкі — гэтага мала.

«Калі трэба было б пачынаць у жыцці ўсё з нуля, то, не раздумваючы, зноў выбраў бы ваенную службу». Гэтую фразу ён вымавіў не дзеля «краснага слоўца»...

**Алена ЗАЦІРКА,**
**Ваеннае інфармацыйнае агенцтва «Ваяр».**

Шэфскія сувязі

# ЦЯПЛО СЭРЦАЎ — ДЗЕЦЯМ

Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь не толькі выхоўвае будучых афіцэраў нашай краіны, але і шэфствуе над іншымі навучальнымі ўстановамі. Такіх адрасоў шэсць. Сярод іх сацыяльны прытулак Першамайскага раёна для дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, Мінскі дзіцячы дом-сад № 2 для дзяцей дашкольнага ўзросту з цяжкімі парушэннямі мовы, 2-я дзіцячая бальніца, псіханеўралагічны дыспансэр № 2, Дом-інтэрнат для пенсіянераў і інвалідаў, Уздзенская школа-інтэрнат для дзяцей з захворваннямі органаў стрававання, сардэчна-сасудзістай і эндакрыннай сістэм.

Менавіта гэтую навучальную ўстанову нядаўна наведалі яе даўнія сябры — курсанты Ваеннай акадэміі. У актавай зале пасля дэманстрацыі фільма аб галоўнай ваеннай ВНУ краіны прайшоў урок мужнасці, які правёў падпалкоўнік запасу, удзельнік баявых дзеянняў у Афганістане, а цяпер — рэдактар акадэмічнай газеты Ігар Шалудкоў. Творчы «дэсант», у склад якога ўвайшлі Аляксандр Малевіч і Яўген Бутар (3-ці курс агульнавайсковага факультэта), Руслан Явіца і Арцём Кузняцоў (5-ты курс факультэта сувязі і АСК), Станіслаў Смеяновіч і Дзяніс Праватароў (3-ці курс факультэта сувязі і АСК), Дзмітрый Яцэнка і Ільля Шутко (3-ці курс факультэта СПА), а таксама Валерый Вязевіч (5-ы курс агульнавайсковага факультэта), даў вялікі тэматычны канцэрт «Песні вайны, песні Перамогі».

Школа-інтэрнат працуе са зменным дзіцячым кантынгентам, прымае па 157 вучняў 4—9 класаў Мінскай вобласці на дзве чвэрці, выконваючы трыадзіную задачу — аздараўленне, навучанне і выхаванне. Для лячэння дзяцей тут маецца ўсё неабходнае медыцынскае абсталяванне, у практыку работы медыцынскага персаналу школы пастаянна ўкараняюцца дасягненні сучаснай педыятрыі. Калектыў школы — гэта каманда аднадумцаў, для якой галоўнае — пошук, творчасць і аптымізм.



Галоўная дзейная асоба тут — дзіця, усё падпарадкавана таму, каб яно адчувала сябе патрэбным, упэўненым і паспяховым.

Прадстаўнікі Ваеннай акадэміі тут заўсёды жаданыя госці: яны не толькі дапамагаюць палепшыць матэрыяльную базу ўстановы, але і заўсёды стараюцца падарыць цяпло сваіх сэрцаў, шчасце, шмат станоўчых эмоцый і самую сапраўдную ўтульную хатнюю атмасферу з падарункамі, песнямі і танцамі.

**Наталля ЛЯДНЁВА.**
**Фота аўтара.**

# У МІНСКУ ПАВІНЕН З'ЯВІЦЦА ПОМНІК МАРФЛОТАЎЦАМ

**У межах праекта «Марское брацтва непарушнае!» 26-27 лістапада пройдуць урачыстыя мерапрыемствы «Флот памятае ўсіх, а значыць, і мяне!» з удзелам дэлегацый Санкт-Пецярбурга, Калінінграда, Масквы, Смаленска, Геленджыка, Лугана (Швейцарыя).**

Паводле слоў аўтара і каардынатара праекта «Марское брацтва — непарушнае!» Арсенія КРЫЦКАГА, 300-гадовы якар — галоўны элемент будучага помніка «Маракам зямлі беларускай ад удзячнай Расіі» прыбудзе ў Мінск 26 лістапада ў суправаджэнні дэлегатаў расійскіх гарадоў ваенна-марской славы, ветэранаў, удзельнікаў праекта «Марское брацтва — непарушнае!». У беларускай сталіцы да імправізаванага шэсця па вул. Ігнаценкі, 7, далучацца нашы ветэраны і маладыя патрыёты. 27 лістапада акцыя працягнецца ў культурна-гістарычным комплексе «Лінія Сталіна».

Дарэчы, помнікі беларускім ваенным маракам ужо ёсць у Вілейцы, Пінску, Гомелі і Рэчыцы. Аднак «марскія ваўкі» хацелі б, каб і ў сталіцы таксама было месца для сустрэч падчас прафесійнага свята. Праект новага манумента гатовы, і цяпер ідзе абмеркаванне, дзе менавіта ён мог бы быць усталяваны. Адным з магчымых і лагічных месцаў называецца Севастопальскі парк. Пакуль жа якар усталюецца на тэрыторыі вучэбнага цэнтра ДАСААФ.

Сёння ў Беларусі прыжывае 200 тысяч чалавек, якія служылі ў розныя гады ў часцях ВМФ СССР. Ва ўсе часы і на ўсіх марах беларусы змагаліся і неслі баявую вахту разам з расіянамі. 30 адміралаў-беларусаў прысвяцілі сваё жыццё ваенна-марскому флоту. Акцыя «Марское брацтва — непарушнае!» задумана па ініцыятыве ветэранскіх арганізацый ВМФ Расіі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

Жывы і помні

# СКУЛЬПТУРА — ГЕРОЮ, ПАМЯЦЬ — УСЯМУ ЧАЛАВЕЦТВУ

**КАЖУЦЬ, няма ў жыцці нічога выпадковага. І гэта сапраўды так. Бо як растлумачыць, што прыйшла я на ваенна-тэхнічны факультэт БНТУ пазнаёміцца з гісторыяй стварэння скульптуры Карбышава... менавіта ў дзень нараджэння героя? Мяне гэта вельмі ўразіла, як і шмат што іншае. Але пра ўсё па-парадку.**

## «Галоўнае — не скарыцца, не ўпасці на калені перад ворагам»

Дзмітрый Міхайлавіч Карбышаў нарадзіўся 14 кастрычніка 1880 года ў Омску. Скончыў Сібірскі кадэцкі корпус, Мікалаеўскую ваенна-інжынерную акадэмію. Доктар ваенных навук, прафесар, Герой Савецкага Саюза (пасмяротна) удзельнічаў у руска-японскай вайне, быў будаўніком фартоў Брэсцкай крэпасці. Дзмітрый Міхайлавіч усё жыццё быў верным сваёй справе: падчас Першай сусветнай вайны ён кіраваў інжынернымі работамі ў 8-й і 11-й арміях, у грамадзянскую вайну служыў інжынерам Калегіі па інжынернай абароне дзяржавы. Таксама займаў такія пасады, як старшыня Інжынернага камітэта Галоўнага Ваенна-інжынернага кіравання РККА, загадчык кафедры ў акадэміі імя Фрунзэ, намеснік загадчыка кафедры ў акадэміі Генштаба. Яго педагагічная праца спрыяла майстэрству многіх военачальнікаў.

Напачатку Вялікай Айчыннай вайны Карбышаў быў на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Цяжка кантужаны трапіў у палон. Нягледзячы на пакуты, Дзмітрый Карбышаў катэгарычна адмовіўся перайсці на службу да фашыстаў. А яшчэ і наадварот, з'яўляючыся вязнем лагераў смерці (Замасць, Майданэк, Асвенцім і інш.), праводзіў сярод ваеннапалонных актыўную антыфашысцкую падпольную работу. У лютым 1945 года ў канцлагеры Маўтхаўзен быў абліты вадой на марозе і загінуў.

Ён стаў сімвалам нязломнай волі і стойкасці.

Вядомыя яго словы актуальныя і сёння: «Галоўнае — не скарыцца, не ўпасці на калені перад ворагам».

## Урачыстае адкрыццё скульптуры

Дзякуючы намаганням рэктара БНТУ, акадэміка НАН Беларусі Барыса Хрусталёва, а таксама кафедры ваенна-інжынернай падрыхтоўкі, адкрыццё скульптуры Дзмітрыю Карбышаву на ваенна-тэхнічным факультэце адбылося 21 студзеня 2011 года. Дата таксама не стала выпадковай. Менавіта ў гэты дзень 310 гадоў назад было створана першае інжынернае войска. А Дзмітрый Міхайлавіч — ці не галоўная асоба гэтага віду войскаў.

Вось і сёння стаіць ён, такі ж высокі і мужны, у прасторнай зале ваенна-інжынернай кафедры. Толькі вочы выдаюць адважнага генерал-лейтэнанта: боль за лёс народа, за яго будучыню не пакідае яго, нават цяпер. Побач са скульптурай — звесткі з біяграфіі змагара, копія ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні Дзмітрыю Карбышаву звання Героя Савецкага Саюза, кветкі, капсула са святой зямлёй з Буйніцкага поля.

У адкрыцці скульптуры Героя Савецкага Саюза Дзмітрыя Карбышава ўдзельнічалі ветэраны вайны, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, прадстаўнікі інжынерных войскаў Узброеных Сіл краіны, выкладчыкі і курсанты. Былі і тыя, хто мае адносіны непасрэдна да скульптуры: кіраўнік Студыі ваенных мастакоў, народны мастак Беларусі Мікалай Апіёк і дачка скульптара Віктара Мурашова, аўтара скульптуры Дзмітрыя Карбышава, член Беларускага саюза мастакоў Вольга Мурашова.

Скульптура, а таксама строй афіцэраў і курсантаў былі асвечаны выпускніком ваеннай кафедры БНТУ святаром Алегам Кунцэвічам.

## Падзяка за светлую будучыню

Ідэя адкрыцця скульптуры Дзмітрыю Карбышаву на ваенна-тэхнічным факультэце БНТУ належыць народнаму мастаку краіны Мікалаю Апіёку. Ён сябраваў з Віктарам Мурашовым, таму дакладна ведаў, што некалі скульптар стварыў помнік герою.

— Гіпсавая мадэль скульптуры знаходзілася ў дачкі майстра Вольгі Мурашовай, — расказвае Мікалай Апанасавіч. — Але твор быў не ў лепшым стане. Я прыйшоў да Вольгі Віктараўны і прапанаваў адрэстаўраваць скульптуру і перадаць БНТУ.

Дачка Віктара Мурашова, таксама скульптар, адразу пагадзілася. І праца пайшла хутка.

— Фігура вельмі адметная ў нашай гісторыі — Дзмітрый Карбышаў, — працягвае Мікалай Апіёк. — Велічыня такога маштабу!.. Я задаволены, што прыняў удзел у рэканструкцыі. Яшчэ нядаўна запыленая, пакінутая скульптура сёння натхняе курсантаў, будучых герояў. Здаецца, мы выканалі духоўны і маральны абавязак. Гэта мінімальная частка падзякі таму, хто паклаў жыццё за нашую будучыню.

## «Нам ёсць на каго раўняцца»

Для курсантаў і ваеннаслужачых асоба Дзмітрыя Карбышава з'яўляецца сімвалам мужнасці, невычэрпнай энергіі і прафесіяналізму, якія ён паказаў у мірным жыцці і ў ваенны час.

— З гісторыі вядома шмат імёнаў, вартых увагі і памяці, — гаворыць начальнік ваенна-тэхнічнага факультэта Мікалай Селівончык. — Але такой стойкасцю, на мой погляд, не валодаў ніхто. Да апошняга змагаўся Карбышаў з ворагам. Толькі некалькі месяцаў не хапіла, каб дачакацца Перамогі. Мы схіляем галовы перад сілай яго волі. Нам ёсць на каго раўняцца.

На кафедры ваенна-інжынерных войскаў зарадзілася новая традыцыя. Падчас урачыстага выпуску маладыя лейтэнанты, а таксама ўвесь узвод аддаюць даніну памяці, ускладаючы перад скульптурай кветкі.

Ёсць цікавасць да асобы Карбышава і ў сучасных школьнікаў. З мэтай выхаваўча-прапагандысцкай работы ваенна-тэхнічны факультэт наведваюць навучэнцы сталічных і рэгіянальных школ.

— Асоба генерал-лейтэнанта Дзмітрыя Карбышава — напамін усяму свету аб афіцэрскім гонары, высокай маральнасці і прыстойнасці, — гаворыць намеснік начальніка ваенна-тэхнічнага факультэта БНТУ па ідэалагічнай рабоце палкоўнік Міхаіл Махнач. — Гэта важна памятаць не толькі будучым афіцэрам-інжынерам, увогуле ўсёй беларускай арміі, але і кожнаму, чый лёс абараняў легендарны герой.

Не толькі памятае, але і шануе герояў сённяшняе маладое пакаленне.

**Вераніка КАНЮТА.**



***На здымку:** каля скульптуры Дзмітрыя Карбышава — палкоўнік, начальнік кафедры ваенна-інжынернай падрыхтоўкі Юрый Мазур; генерал-лейтэнант у адстаўцы, ветэран інжынерных войскаў Павел Гутэнка; палкоўнік запасу, ветэран інжынерных войскаў і Узброеных Сіл Беларусі Аляксей Зайчэўскі; палкоўнік запасу, удзельнік баявых дзеянняў у Афганістане Дзмітрый Козел; палкоўнік у адстаўцы, прафесар, кандыдат ваенных навук Уладзімір Тамела.*

# Блакіраваць і знішчыць!

*(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)*

Пасля гэтага падраздзяленні, якія прыцягваліся для выканання задачы па зачыстцы раёна, рушылі на межы правядзення пошуку. Па гучнай сувязі саперніку прапанавалі здацца. Аднак у вызначаны тэрмін гэта не было зроблена.

Калі ж вораг не здаецца — яго знішчаюць! Такое непарушнае правіла.



Па раёне базавання незаконнага ўзброенага фарміравання і верагодных маршрутах яго адыходу адкрыў агонь гаўбічны артылерыйскі ўзвод. Пара верталётаў Мі-24 нанесла групавы ўдар і, прыкрываючы адзін аднаго, працягнула дзяжурства ў паветры ў гатоўнасці да нанясення агнявога паражэння баевікам у выпадку спробы іх выхаду з раёна блакіравання.

Пасля нанясення агнявога паражэння камандзір мабільнага батальёна прыняў рашэнне на зачыстку раёна базавання баевікоў. Пры гэтым яго блакіраванне ажыццяўлялася сіламі чатырох стралковых рот тэрытарыяльных войскаў.

Аднак невялікай групе баевікоў на дзвюх машынах усё ж удалося вырвацца са шчыльнага кола.

Дзве разведвальныя групы на двух верталётах Мі-8МТ з пляцовак падскоку метадам беспарашутнага дэсантавання з выкарыстаннем альпінісцкага рыштунку высадзіліся на шляху руху баевікоў да Дзяржаўнай мяжы. Адначасова на перахоп рушылі на трох аўтамабілях узвод тэрытарыяльных войскаў і на трох БТР-80 рэзерв мабільнага батальёна — мабільны ўзвод. У баевікоў не заставалася ніякіх шанцаў на выратаванне.

**Аляксандр МАКАРАЎ,**
**фота Алены ЗАЦІРКІ.**
**Ваеннае інфармацыйнае агенцтва Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь «Ваяр» — спецыяльна для газеты «Звязда».**

## НАША ДАВЕДКА

Тэрытарыяльная абарона з'яўляецца найважнейшай складовай часткай абаронных мерапрыемстваў, якія ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з Планам абароны Рэспублікі Беларусь дзяржаўнымі органамі, органамі мясцовага кіравання, арганізацыямі, тэрытарыяльнымі войскамі ва ўзаемадзеянні з Узброенымі Сіламі, іншымі войскамі, воінскімі фарміраваннямі і ваенізаванымі арганізацыямі. Тэрытарыяльная абарона будуецца па адміністрацыйна-тэрытарыяльным прынцыпе.

Мэтамі тэрытарыяльнай абароны з'яўляюцца наданне абароне дзяржавы ўсенароднага характару; павышэнне магчымасцяў ваеннай арганізацыі дзяржавы па абароне суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь; стварэнне ўмоў для ўстойлівага функцыянавання дзяржаўных органаў і арганізацый, эканомікі, аб'ектаў інфраструктуры і жыццядзейнасці насельніцтва краіны пры ўзнікненні ваеннай пагрозы і ў ваенны час.

**Найважнейшыя задачы тэрытарыяльнай абароны:**

— ахова і абарона аб'ектаў;

— выкананне асобных баявых задач сумесна са злучэннямі і воінскімі часцямі Узброеных Сіл пры адбіцці акта ўзброенай агрэсіі;

— барацьба з дэсантна-дыверсійнымі сіламі і незаконнымі ўзброенымі фарміраваннямі;

— вядзенне ўзброенай барацьбы на часова акупаванай сапернікам тэрыторыі;

— удзел ва ўзмацненні аховы ўчасткаў Дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь;

— удзел у ліквідацыі наступстваў прымянення сапернікам зброі;

— удзел у выкананні мерапрыемстваў па забеспячэнні падтрымання рэжыму ваеннага становішча і іншых мерапрыемстваў па абароне Рэспублікі Беларусь.

Карыснае харчаванне

# ПЕРШ ЧЫМ СПАЖЫВАЦЬ — ЧЫТАЙ ЭТЫКЕТКУ!



**КАЛІ вы спрабуеце вызначыць, ці падыходзіць канкрэтны харчовы прадукт для вашага рацыёну, то этыкетка з саставам — асноўны ваш памагаты. Галоўнае — навучыцца разумець інфармацыю, якая там пазначана.**

***Што павінна быць напісана на этыкетцы?*** Этыкетка павінна змяшчаць не толькі назву прадукту і яго вытворцы, але і колькасць бялкоў, тлушчаў, вугляводаў і калорый на 100 г прадукту. Састаў прадукту выглядае як спіс — у радок праз коску або слупок. Яркія надпісы «без ГМА», «натуральны», «дыетычны», якія размяшчаюцца на этыкетцы, да саставу прадукту ніякага дачынення не маюць.

Калі на прадукце замежнай вытворчасці няма наклейкі з перакладам на беларускую (рускую) мову і каардынатамі пастаўшчыка ў рэспубліцы, прадукт, хутчэй за ўсё, трапіў на рынак нелегальна і можа быць няякасным. Купляйце прадукты толькі з этыкеткамі, якія добра чытаюцца і на якіх пазначаны харчовая каштоўнасць і састаў прадукту.

***Звяртайце ўвагу на выгляд этыкеткі.*** Калі этыкетка сцерлася, пераклеена або передрукавана панад старым тэкстам — такі прадукт лепш не купляць.

***Як павінен быць пазначаны тэрмін захоўвання?*** Тэрмін захоўвання прадукту можа быць нанесены некалькімі спосабамі. «Прыдатны да» азначае, што ў пэўную дату і час прадукт страчвае прыдатнасць. Калі нанесены канкрэтны тэрмін захоўвання, на ўпакоўцы трэба шукаць дату і час вырабу прадукту і разлічваць, калі тэрмін захоўвання ў яго заканчваецца. Харчовых прадуктаў з неабмежаваным тэрмінам захоўвання не бывае. Выбірайце толькі тыя прадукты, тэрмін захоўвання якіх пазначаны яўна і яшчэ не закончыўся.

***Як выглядае дата вырабу?*** Дата вырабу не можа быць нанесена на ўпакоўку шарыкавай ручкай або фламастарам — яна выбіваецца на краі ўпакоўкі спецыяльным станком або друкуецца штампам на этыкетцы.

***Як чытаць састаў прадуктаў?*** Назвы інгрэдыентаў у спісе размяшчаюцца строга ў парадку змяншэння па колькасці, якая ўвайшла ў гэты прадукт. На першым месцы стаяць асноўныя інгрэдыенты. У мясных прадуктах гэта можа быць толькі мяса, у хлебе — мука, у малочных прадуктах — малако.

***Састаў на 100 г або на адну порцыю.*** Састаў звычайна прынята паказваць на 100 г прадукту. Ва ўпакоўцы можа быць і больш, і менш за гэтую колькасць. Таму колькасць тых або іншых інгрэдыентаў прыйдзецца пералічыць на рэальную вагу ўпакоўкі. Часам састаў прадукту паказваецца з разліку на порцыю вагой часцей за ўсё менш за 100 г, і іх ва ўпакоўцы можа быць некалькі. У такім разе трэба ўважліва паглядзець, колькі порцый змяшчае ўпакоўка і як іх адмераць. Заўсёды звяртайце ўвагу не толькі на састаў прадукту, але і на вагу ўпакоўкі і колькасць порцый у ёй.

***Абястлушчаны — не значыць карысны.*** Калі прадукт абястлушчаны, ён не абавязкова нізкакаларыйны. Каларыйнасць і смакавыя якасці часта дабіраюцца за кошт дабаўлення цукру. Калі цукар стаіць на першым або другім месцы ў спісе — такі прадукт нельга назваць карысным. Параўнайце абястлушчаны прадукт з яго «тлустым» суседам па паліцы. Калі адрозненні ў колькасці калорый нязначныя, шукайце альтэрнатыву.

***Што азначае «Без халестэрыну»?*** Гэты рэкламны слоган часам размяшчаецца на прадуктах, якія ніколі і не змяшчалі халестэрын, — для прыцягнення дадатковай увагі. Напрыклад, яго няма ў любых алеях, бо халестэрын — прадукт выключна жывёльнага паходжання. Прадукты без халестэрыну неабавязкова вельмі карысныя для здароўя. Напрыклад, няма халестэрыну ў спрэдах, зробленых на аснове алеяў, многіх кандытарскіх тлушчах і танных маргарынах. Гэтыя прадукты высокакаларыйныя і змяшчаюць транстлушчы.

***Як выявіць хуткія вугляводы?*** Не ўсе вугляводы — гэта цукар. Калі ў прадукце шмат вугляводаў, але цукру ў спісе інгрэдыентаў няма або ён стаіць на апошніх месцах — прадукт змяшчае ў асноўным павольныя вугляводы. Аднак нават у прадукт з надпісам «без цукру» вытворца можа дадаць лішнія хуткія вугляводы. Цукроза, мальтоза, кукурузны сіроп, патака, цукровы трыснёг, цукар-сырэц, мёд, фруктовы канцэнтрат — гэта таксама цукар. Старанна кантралюйце колькасць любога цукру ў прадуктах — гэта заўсёды лішнія калорыі.

***Дзе шукаць лішні цукар?*** Лішнія хуткія вугляводы ёсць у салодкай газіроўцы, нектарах, соказмяшчальных і энергетычных напоях. У шклянцы звычайнай шыпучкі можа быць да 8 чайных лыжак цукру. Асабліва ўважліва вывучайце састаў так званых здаровых прадуктаў: мюслі, збожжавых батончыкаў, каш хуткага прыгатавання і прадуктаў для дзяцей — вытворцы часта дадаюць туды лішні цукар. Старайцеся наогул не купляць прадукты са «схаваным» цукрам — з-за іх каларыйнасць рацыёну можа канчаткова выйсці з-пад кантролю.

***Шукайце «схаваныя» тлушчы ў саставе.*** Уважліва глядзіце на каларыйнасць прадуктаў, у якіх тлушчы не вызначаюцца візуальна. Шмат «схаванага» тлушчу ў вараных каўбасах і сасісках, тартах, шакаладзе і піражных. Працэнт тлушчу можна вызначыць па яго колькасці на 100 грам. Паспрабуйце выключыць са спісу пакупак прадукты са «схаванымі» тлушчамі. Яны нятанныя і занадта каларыйныя.

***Як выявіць транстлушчы?*** Транстлушчы — гэта форма малекул тлустых кіслот, якія ўтвараюцца падчас вырабу маргарыну з алею. Дыетолагі рэкамендуюць абмяжоўваць іх спажыванне, бо яны, як і насычаныя тлустыя кіслоты, істотна павышаюць рызыку развіцця сардэчна-сасудзістых захворванняў. Таму наяўнасць у саставе прадукту гідрагенізаваных або насычаных раслінных тлушчаў павінна насцярожваць. Асабліва важна гэта для прадуктаў, якія змяшчаюць раслінныя тлушчы, штучна зробленыя цвёрдымі (маргарыны, кулінарныя тлушчы, спрэды) — танных цукерак, шакаладу і печыва. Адмоўцеся ад танных тлушчаў і прадуктаў на іх аснове — колькасць і якасць сапраўдных сметанковага масла і раслiннага алею кантраляваць прасцей.

***Дзе звяртаць увагу на соль?*** Соль у саставе прадукту можа пазначацца і як «соль», і як «натрый». Уважліва глядзіце на колькасць солі ў прадукце — чым бліжэй яна да пачатку спісу прадуктаў, тым большая яе доля ў ежы. Бяспечная для здароўя доза солі ў дзень — каля 5 г (чайная лыжка). У пераліку на натрый —1,5—2,0 г натрыю, якога ў солі каля траціны. Лішняя соль прысутнічае ва ўсіх прадуктах з перапрацаванага мяса: каўбасах, вяндліне, вяленым і салёным мясе, мясных кансервах. Шмат солі ў цвёрдых сырах, салёнай і вэнджанай рыбе, кансервах, марынаванай гароднiне, чыпсах, сухарыках , фаст-фудзе і нават у хлебе. Прасцей кантраляваць колькасць солі ў рацыёне, калі гатаваць дома.

***Пастэрызаваны або стэрылізаваны?*** Пастэрызаваны прадукт апрацаваны пры тэмпературы 75—90 градусаў Цэльсія на працягу пэўнага часу. Розныя шкодныя мікраарганізмы ў ім загінулі, а карысныя ўласцівасці значна не змяніліся. Такія прадукты захоўваюцца ад некалькіх дзён да тыдняў. Стэрылізацыя прадугледжвае апрацоўку пры тэмпературы 100 і вышэй градусаў, пры гэтым гінуць не толькі самі мікраарганізмы, але і іх споры. Стэрылізаваны прадукт захоўваецца даўжэй, чым пастэрызаваны, і часам не патрабуе нават халадзільніка. Але за магчымасць доўгага захоўвання даводзіцца плаціць стратай карысных якасцяў прадукту.

***Што ўсё-такі азначаюць розныя «Е»?*** Усе яны азначаюць наяўнасць харчовых дабавак у саставе. Навошта? Для надання прадуктам усяго, чаго насамрэч у іх няма: прыгожага колеру, правільнай кансістэнцыі, водару, смаку. Кожнай дабаўцы прысвоены кодавы нумар, які пачынаецца з той самай літары «Е». У нумарацыі дзейнічае дакладная сістэма: фарбавальнікі (Е100—Е199), кансерванты (Е200—Е299), антыакісляльнікі (Е300—Е399) і так ажно да дзвюх тысяч. Некаторыя з іх цалкам бяспечныя, напрыклад, малочная кіслата (Е270); некаторыя нават карысныя, напрыклад, Е440 — яблычны пекцін; некаторыя лічацца шкоднымі — нітрыт натрыю (Е250), глютамат натрыю (Е621), а некаторыя ўвогуле забаронены.

Галоўнае правіла — чым менш «Е» на ўпакоўцы, тым лепш.

***Якія кансерванты найболей распаўсюджаныя?*** Кансерванты — гэта рэчывы, якія перашкаджаюць размнажэнню бактэрый і псаванню прадуктаў. Найбольш распаўсюджаныя прамысловыя кансерванты — сарбінавая і бензойная кіслоты і іх солі. Шукайце на этыкетцы назву натуральных кансервантаў: лімонная кіслата, яблычная кіслата, паваранная соль. Гэтыя інгрэдыенты выкарыстоўваюцца і пры хатнім кансерваванні.

***Навошта патрэбныя эмульгатары?*** Эмульгатары пачалі ўжывацца ў харчовай прамысловасці ў апошнія дзесяцігоддзі для вытворчасці нізкатлустых прадуктаў, калі патрэбна стварыць бачнасць тлустай тэкстуры. Часцей за ўсё выкарыстоўваецца натуральны эмульгатар лецыцін.

***Ці шкодныя мадыфікаваныя крухмалы?*** У гэтых рэчывах (мадыфікаваны бульбяны крухмал, мадыфікаваны кукурузны крухмал) няма нічога небяспечнага для арганізма чалавека. Іх функцыя — зрабіць прадукт больш густым. Просты крухмал уяўляе сабой вуглявод з доўгай разгалінаванай структурай. Адна з асаблівасцяў крухмалу — гэта здольнасць звязваць ваду. Пры гэтым крухмал набрыньвае, што можа выклікаць змацавальны эфект. Для таго, каб крухмал не выклікаў змацавальнага эфекту, у харчовых прадуктах часта выкарыстоўваецца мадыфікаваны крухмал: яго структура разбіта на больш дробныя часткі і выраблаецца ён з натуральных крухмалаў. Таму не блытайце мадыфікаваныя прадукты з геннамадыфікаванымі.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

## ДРЭННЫ ПОЧЫРК УРАЧА — ПАГРОЗА ДЛЯ ЖЫЦЦЯ ПАЦЫЕНТА

Праблема неразборлівага почырку ўрачоў, аказваецца, актуальная для ўсіх краін свету. Швейцарскія спецыялісты правялі даследаванне, у ходзе якога высветлілася, што ў 52 працэнтах выпадкаў почырк у медыцынскіх рэцэптах вельмі дрэнны, а ў 4 працэнтах — прызначэнне ўвогуле не чытаецца. Больш за тое, з 200 смяротных выпадкаў па прычыне няправільнага прызначэння пацыентам медыкаментаў у 25 працэнтах трагедыя здарылася з-за таго, што аптэкар элементарна не змог разабраць урачэбнае «пасланне».

Адзіны спосаб выправіць сітуацыю, лічаць даследчыкі, гэта афармляць рэцэпты праз аўтаматычны ўвод у камп'ютары. Але не многія краіны могуць укараніць такую сістэму. Таму большасці пацыентаў застаецца толькі адно — не забываць удакладняць, які прэпарат ім выпісаў урач. Магчыма, гэта выратуе ім жыццё?

**Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ
### об открытом аукционе по продаже права на заключение договоров аренды земельных участков 22 декабря 2011 года в 11.00

| № лота | Сведения о предмете аукциона на право заключения договора аренды земельного участка для размещения объекта строительства | | Условия развития инфраструктуры застраиваемой территории, характеристика расположенных на земельном участке инженерных сооружений | Условия предоставления земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Адрес земельного участка/кадастровый номер/размер/срок аренды/арендодатель | Целевое назначение земельного участка | | | | |
| 1 | Брестская область, Кобринский район, г. Кобрин, ул. Дзержинского (район АЗС)/ кадастровый номер участка – 124350100001006596/ общая площадь участка 0,7030 га/ срок аренды 50 лет/ арендодатель – Кобринский райисполком | Строительство и обслуживание торгового объекта | 0,6820 га – земли под древесно-кустарниковой растительностью; 0,2189 га – земли под временной стройплощадкой. Земельный участок имеет ограничения в использовании земель на площади 0,0120 га в санитарно-защитной полосе водоводов и водопроводов, на площади 0,1148 га в охранной зоне сетей и сооружений канализации, на площади 0,1358 га в охранной зоне подземных кабельных линий электросвязи и радиофикации, на площади 0,0693 га в охранной зоне подземных кабельных линий электропередачи напряжением 10 кВ, на площади 0,1370 га в охранной зоне газопровода среднего давления и на площади 0,0803 га в охранной зоне сетей и сооружений теплоснабжения. | - внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка;<br>- возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения в сумме:<br>по лоту № 1 – 1 435 780 руб. и расходов на публикацию данного извещения;<br>по лоту № 2 – 1 537 060 руб. и потерь сельскохозяйственного производства в сумме 13 961 100 руб. и расходов на публикацию данного извещения;<br>по лоту № 3 – 1 355 290 руб. и расходов на публикацию данного извещения;<br>- организация и регистрация юридического лица (его филиала) в г. Кобрине при вводе объекта в эксплуатацию (по лоту № 1);<br>- заключение с Кобринским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в 2-х месячный срок после принятия решения о предоставлении участка и государственной регистрации прав на него;<br>- начало освоения земельного участка – после утверждения проектно-сметной документации на строительство объектов, но не позднее 2-х лет (по лотам № 1 и № 2) и 6 месяцев (по лоту № 3) с даты государственной регистрации прав на земельный участок;<br>- обеспечение целевого использования земельного участка в течение срока аренды;<br>- осуществление в соответствии с разработанной проектно-сметной документацией строительства торгового объекта (по лоту № 1), строительство автомобильной мойки (по лоту № 2) и установку торгового павильона (по лоту № 3) и благоустройство прилегающей территории;<br>- вынос или защита инженерных коммуникаций с территории застройки в соответствии с техусловиями их владельцев (по лоту № 1). | 879 340 980 | 88 000 000 |
| 2 | Брестская область, Кобринский район, г. Кобрин, ул. Пролетарская (район АГЗС)/ кадастровый номер участка 124350100002004397/ площадь участка 0,2014 га/ срок аренды 50 лет/ арендодатель – Кобринский райисполком | Строительство и обслуживание автомобильной мойки | 0,1266 га – пахотные земли; 0,0748 га – прочие неиспользуемые земли. Ограничений в использовании земли нет. | | 99 619 710 | 10 000 000 |
| 3 | Брестская область, Кобринский район, Киселевецкий сельсовет, дер. Борисово, пересечение улиц Центральной и Борисовской/ кадастровый номер участка 124383001101000248/ площадь участка 0,0121 га/ срок аренды 10 лет/ арендодатель – Кобринский райисполком | Установка и обслуживание торгового павильона | Земли общего пользования. Ограничений в использовании земли нет. | | 1 500 000 | 150 000 |

## ИЗВЕЩЕНИЕ
### об повторном открытом аукционе по продаже земельных участков в частную собственность 22 декабря 2011 года в 11.30

| № лота | Сведения о предмете аукциона по продаже земельного участка в частную собственность | | Условия развития инфраструктуры застраиваемой территории, характеристика расположенных на земельном участке инженерных сооружений | Условия предоставления земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Адрес земельного участка/ кадастровый номер/размер | Целевое назначение земельного участка | | | | |
| 1 | Брестская область, г. Кобрин, ул. Рокоссовского, 4/ кадастровый номер участка 124350100001006430/ площадь участка 0,1500 га | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома | Прочие неиспользуемые земли.* Ограничений в использовании земли нет. | - внесение победителем аукциона платы за земельный участок в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка;<br>- возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения в сумме:<br>по лоту № 1 – 712 300 руб.;<br>по лоту № 2 – 1 038 620 руб.;<br>по лоту № 3 – 679 780 руб.,<br>и расходов на публикацию данного извещения;<br>- осуществление в 2-месячный срок после принятия решения о предоставлении участка государственной регистрации прав на него;<br>- к строительству жилых домов и хозяйственных построек приступить после получения разрешения на их строительство, но не позднее одного года с момента регистрации прав на земельный участок;<br>- снять на предоставляемом земельном участке плодородный слой почвы под строящимися зданиями и использовать его для благоустройства придомовой территории. | 47 358 150 | 4 735 800 |
| 2 | Брестская область, г. Кобрин, ул. Гусарская, 6/ кадастровый номер участка 124350100001006427/ площадь участка 0,1314 га | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома | Прочие неиспользуемые земли.* Ограничений в использовании земли нет. | | 41 485 740 | 4 148 600 |
| 3 | Брестская область, г. Кобрин, ул. Гусарская, 12/ кадастровый номер участка 124350100001006426/ площадь участка 0,1382 га | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома | Прочие неиспользуемые земли.* Ограничений в использовании земли нет. | | 43 632 650 | 4 363 300 |

** инженерные коммуникации на участках отсутствуют*

**Аукционные торги состоятся 22 декабря 2011 года** по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, зал заседаний, 1 этаж.

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

копию платежного поручения (с отметкой банка отправителя об исполнении) о внесении задатка на расчетный счет 3632002160014 в филиале № 113 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 237, УНП 200042468, получатель – Кобринский райисполком – **по 19 декабря 2011 г. включительно;**

**Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

**Физическое лицо:** паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица, – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и земельными участками на местности.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену.

Аукционные торги признаются не состоявшимися в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае райисполком в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении земельного участка с увеличением его начальной цены на 5%).

**Заявления на участие в аукционных торгах с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, райисполком, каб. 404 с 8.00 до 16.00 по рабочим дням по 19 декабря 2011 г. включительно. Тел. для справок 8(01642) 2 28 11, 2 33 68.**

**Полная информация об аукционе размещена на сайте www.brest-region.by**


## Інфарм-укол

### РЫБНЫХ ДЗЁН — ПАБОЛЕЙ!

**Рэгулярнае ўжыванне рыбы дазваляе знізіць рызыку з'яўлення арытміі сэрца, сцвярджаецца ў адным амерыканскім даследаванні. Рыба змяшчае тлустыя кіслоты амега-3, дзеянне якіх забяспечвае зніжэнне рызыкі з'яўлення збояў у рабоце сэрца, зніжае ўзровень халестэрыну, змяншае тромбаўтварэнне, а таксама паляпшае дзейнасць галаўнога мозгу.**

У Францыі вучоныя прыйшлі да высновы, што да 30 працэнтаў усіх выпадкаў раку ў насельніцтва развітых краін узнікае пад уплывам няправільнага харчавання. Пры гэтым людзі, якія харчуюцца пераважна рыбай, а не мясам, радзей пакутуюць ад раку тоўстага кішэчніка.

Паводле слоў **валеолага 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Алены ГАРНІЦКАЙ,** рыба — гэта не толькі поліненасычаныя тлустыя кіслоты, але і высакаякасны бялок з незаменнымі амінакіслотамі, а таксама вітаміны A, D, E, групы B, мікраэлементы — жалеза, фосфар, кальцый, магній, цынк, селен, ёд, дзякуючы якім стравы з рыбы шырока выкарыстоўваюць у харчаванні лячэбным, дыетычным і дзіцячым.

### ЖЫЦЦЁ ПАВІННА БЫЦЬ РАЗНАСТАЙНЫМ

**У пажылым узросце ёсць некалькі асноўных прычын, якія спрыяюць дэпрэсіі.**

Па-першае, гэта выхад на пенсію (у гэты перыяд чалавек сутыкаецца з вялікай колькасцю жыццёвых цяжкасцяў — смерць блізкіх, родных, сяброў, пагаршэнне матэрыяльнага стану, зніжэнне ступені самапавагі, пачуццё страты сацыяльнага рангу, незапатрабавальнасці і адзіноты). Другая прычына — саматычныя захворванні (артэрыяльная гіпертэнзія, рэўматоідны артрыт і інш.). Трэцяя — прыём вялікай колькасці лекаў (кортыкастэроідаў, бэта-блакатараў, супрацьгіпертанічных, антыалергічных і інш.). Чацвёртая — узроставае зніжэнне сератаніну ў галаўным мозгу.

**1.** Калі вы аказаліся ў няпростай жыццёвай сітуацыі, не губляйцеся і пазбягайце крайнасцяў.

**2.** Змяніце абстаноўку (асабліва пасля смерці блізкіх) — часова з'едзьце куды-небудзь у санаторый ці дом адпачынку.

**3.** Пазбягайце лячэння «нетрадыцыйнымі метадамі».

**4.** Перагледзьце свае жыццёвыя мэты на гэтым адрэзку часу.

**5.** Унясіце ў сваё жыццё больш задавальненняў — глядзіце цікавыя фільмы, набывайце новыя рэчы, заводзьце новыя знаёмствы і інш.

**6.** Падтрымлівайце высокі ўзровень самапавагі — любіце сябе.

**7.** Падтрымлівайце добрую фізічную форму — правільна і рэгулярна харчуйцеся, сачыце за вагой, наладзьце сон.

**8.** Зрабіце сваё жыццё разнастайным — важна, каб жыццё мела як мага больш складнікаў (дом, сям'я, хобі, сябры).

**9.** Падтрымлівайце гарманічныя адносіны з сябрамі, сваякамі.

**10.** Дэпрэсіі не пачынаюцца ў адзін дзень, і калі вы адчулі яе раннія прыкметы, наведайце ўрача-псіхіятра або псіхатэрапеўта. Для гэтага можаце звярнуцца ў Мінскі гарадскі цэнтр памежных станаў і псіхатэрапіі па вул. Мендзялеева, 4 . Тэлефон рэгістратуры: 245 61 74.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**


УНП 500833225.

**ГРОДНЕНСКИЙ ФИЛИАЛ РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» сообщает, что в извещении, опубликованном в газете «Звязда» 18 октября 2011 года № 198 (27061) по продаже имущества ОАО «Гроднооблавтотранс», ВНЕСЕНЫ ИЗМЕНЕНИЯ:**

**Вместо:** «Земельный участок – кадастровый № 440100000001006162. Площадь земельного участка 0,5169 га, назначение – земельный участок под незавершенное строительство «Корпус по изготовлению электродов» и склад № 3».

**Читать следующее**: «Земельный участок – кадастровый № 440100000001006162. Площадь земельного участка 0,4685 га, назначение – земельный участок под незавершенное строительство «Корпус по изготовлению электродов» и склад № 3».



## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ КОНКУРСОВ

**ГОСУДАРСТВЕННЫЙ КОМИТЕТ ПО ИМУЩЕСТВУ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ ИНФОРМИРУЕТ О ПРОВЕДЕНИИ КОНКУРСОВ ПО ПРОДАЖЕ ПРИНАДЛЕЖАЩИХ РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ АКЦИЙ ОТКРЫТЫХ АКЦИОНЕРНЫХ ОБЩЕСТВ.**

Конкурсы состоятся **21 декабря 2011 г.** по адресу: г. Минск, переулок Краснозвездный, 12.

Организатор конкурсов – Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12.

| № | Полное и сокращенное наименование, место нахождения акционерного общества | Размер уставного фонда, штук акций | Номинальная стоимость акции, рублей | Доля государства в уставном фонде | | Количество продаваемых акций | | Начальная цена продажи акций, рублей | Условия конкурса |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | штук акций | в % к УФ | штук акций | в % к УФ | | |
| 1 | Открытое акционерное общество «Западэлектросетьстрой» (ОАО «Западэлектросетьстрой») 220090, г. Минск, ул. Кольцова, 39/1, ком. 3 | 3 043 280 | 3 600 | 2 991 277 | 98,3 | 213 030 | 7,0 | 5 199 600 000 | Приобретение его победителем в течение двух лет со дня заключения договора купли-продажи акций дополнительно выпускаемых открытым акционерным обществом «Западэлектросетьстрой» акций на сумму, эквивалентную 8,5 млн. долларов США по курсу Национального банка на дату их приобретения;<br>победитель конкурса обеспечивает в течение двух лет со дня заключения договора купли-продажи акций заказы для открытого акционерного общества «Западэлектросетьстрой» на строительство высоковольтных линий электропередачи и трансформаторных подстанций напряжением 110 кВ и выше на территории стран Европейского союза на сумму не менее 5 млн. долларов США. |
| 2 | Открытое акционерное общество «АТЭК-Могилев» 212004, г. Могилев, ш. Чаусское, 4 | 257 509 | 2 000 | 239 933 | 93,2 | 108 591 | 42,2 | 3 389 025 000 | Предоставить открытому акционерному обществу «АТЭК-Могилев» в течение 1 года с даты подписания договора купли-продажи акций заем под 1% годовых: нерезидентом Республики Беларусь – в сумме 97 тыс. долларов США; резидентом Республики Беларусь – в сумме 97 тыс. долларов США либо в сумме, эквивалентной 97 тыс. долларов США. |
| 3 | Открытое акционерное общество «БелГрузМагистраль» (ОАО «БелГрузМагистраль») 220024, г. Минск, п/у Колядичи, ул. Бабушкина, 27 | 2 084 275 | 4 400 | 2 076 956 | 99,6 | 998 340 | 48,9 | 13 812 000 000 | Предоставить открытому акционерному обществу «БелГрузМагистраль» в течение 1 года с даты подписания договора купли-продажи акций заем под 1% годовых: нерезидентом Республики Беларусь – в сумме 1 175,0 тыс. долларов США; резидентом Республики Беларусь – в сумме 1 175,0 тыс. долларов США либо в сумме, эквивалентной 1 175,0 тыс. долларов США. |
| 4 | Открытое акционерное общество «Алеся» (ОАО «Алеся») 220123, г. Минск, ул. Старовиленская, 131, ком. 305 | 214 040 371 | 30 | 169 993 104 | 78,7 | 169 993 104 | 78,7 | 34 850 000 000 | Внести в уставный фонд открытого акционерного общества «Алеся» в течение 2 лет с даты подписания договора купли-продажи акций в виде вклада денежные средства: нерезидентом Республики Беларусь – в сумме 2,4 млн. евро; резидентом Республики Беларусь – в сумме 2,4 млн. евро либо в сумме, эквивалентной 2,4 млн. евро, с направлением указанных средств на развитие общества.<br>Обеспечить сохранение в течение 5 лет с даты подписания договора купли-продажи акций количества рабочих мест и профиля деятельности общества. |
| 5 | Открытое акционерное общество «Ковры Бреста» (ОАО «Ковры Бреста») 224020, г. Брест, ул. Я. Купалы, 1 | 317 834 679 | 130 | 317 476 345 | 99,9 | 317 476 345 | 99,9 | 172 072 000 000 | Внести в уставный фонд открытого акционерного общества «Ковры Бреста» в течение 2 лет с даты подписания договора купли-продажи акций в виде вклада денежные средства: нерезидентом Республики Беларусь – в сумме 8,2 млн. долларов США; резидентом Республики Беларусь – в сумме 8,2 млн. долларов США либо в сумме, эквивалентной 8,2 млн. долларов США, с направлением указанных средств на развитие общества.<br>Обеспечить сохранение в течение 5 лет с даты подписания договора купли-продажи акций количества рабочих мест и профиля деятельности общества. |
| 6 | Открытое акционерное общество «Гомельжелезобетон» (ОАО «Гомельжелезобетон») 246027, г. Гомель, ул. Борисенко, 13а | 3 623 005 | 4 200 | 3 596 646 | 99,3 | 3 596 646 | 99,3 | 38 000 000 000 | Внести в уставный фонд открытого акционерного общества «Гомельжелезобетон» в течение 2 лет с даты подписания договора купли-продажи акций в виде вклада денежные средства: нерезидентом Республики Беларусь в сумме 2,4 млн. долларов США; резидентом Республики Беларусь в сумме 2, 4 млн. долларов США либо в сумме, эквивалентной 2,4 млн. долларов США, с направлением указанных средств на развитие общества.<br>Обеспечить сохранение в течение 5 лет с даты подписания договора купли-продажи акций количества рабочих мест и профиля деятельности общества, а также в течение не менее 5 лет с согласия учреждения образования «Белорусский государственный университет транспорта» существующих условий деятельности на территории ОАО «Гомельжелезобетон» филиала кафедры «Строительное производство» этого университета. |
| 7 | Открытое акционерное общество «Оргпищепром» (ОАО «Оргпищепром») 220014, г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 2 | 413 525 | 3 300 | 405 447 | 98,1 | 405 447 | 98,1 | 28 400 000 000 | Внести в уставный фонд открытого акционерного общества «Оргпищепром» в течение 3 лет с даты подписания договора купли-продажи акций в виде вклада денежные средства: нерезидентом Республики Беларусь – в сумме 3,3 млн. долларов США; резидентом Республики Беларусь – в сумме 3,3 млн. долларов США либо в сумме, эквивалентной 3,3 млн. долл. США, с направлением указанных средств на развитие общества.<br>Обеспечить сохранение в течение 5 лет с даты подписания договора купли-продажи акций количества рабочих мест и профиля деятельности общества. |

Время проведения конкурсов по продаже принадлежащих Республике Беларусь акций:

ОАО «Западэлектросетьстрой» – 9.30; ОАО «АТЭК-Могилев» – 10.00; ОАО «БелГрузМагистраль» – 10.30; ОАО «Алеся» – 11.00; ОАО «Ковры Бреста» – 11.30; ОАО «Гомельжелезобетон» – 12.00; ОАО «Оргпищепром» – 12.30.

Для участия в конкурсе по продаже акций соответствующего акционерного общества в срок **до 16.00 5 декабря 2011 г.** по адресу: г. Минск, пер. Краснозвездный, 12, каб. 409 представляются документы, перечень которых размещен на официальном сайте Государственного комитета по имуществу **www.gki.gov.by** в разделе «Продажа акций» в подразделе «Аукционы-конкурсы». На сайте также размещена дополнительная информация об объявленных конкурсах.

Задатки для участия в конкурсах уплачиваются в размере 10 процентов от начальных цен продажи акций в срок до **19 декабря 2011 г.** согласно договорам о задатке, заключаемым с Фондом государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь: в бел. рублях на счет № 3642974000028; в EURO на счет № 3642974005036; в USD на счет № 3642974005052; в рос. рублях на счет № 3642974008046 в филиале № 529 «Белсвязь» ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 720; получатель платежа – Фонд государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь, УНП 102314789.

Участники конкурсов, выигравшие соответствующий конкурс, обязаны возместить затраты на организацию и проведение конкурсов в течение 3 рабочих дней с даты их проведения.

Договора купли-продажи акций по результатам конкурсов заключаются в течение 20 календарных дней с даты их проведения.

При расчетах в белорусских рублях по суммам, указанным в долларах США, применяется курс белорусского рубля по отношению к доллару США, установленный Нацбанком Республики Беларусь на дату внесения денежных средств.

**Контактные телефоны Фонда государственного имущества: (017) 284 91 13, 284 47 00.**

# КНІГА СКАРГАЎ ~~ДЛЯ~~ НА СПАЖЫЎЦОЎ

**ХТО з нас не выказваў незадаволенасць наконт працы прадаўцоў, цырульнікаў, афіцыянтаў, натрапіўшы на непаважлівае стаўленне да сябе? Часам наведаешся ў кавярню альбо зойдзеш у атэлье, каб адрамантаваць маланку ў куртцы, а табе ў аказаную паслугу ўключаць сапсаваны настрой. Кніга скаргаў — выйсце для прынцыповых. Многія так і робяць. Пішуць і скардзяцца. А тыя, на каго скаргі накіраваныя, часам цікавяцца, чаму не існуе такой жа кніжкі, каб запісаць туды ўсе крыўды і скаргі на спажыўцоў.**

## ПАВОЛЬНАЯ «ХУТКАЯ»

**Дар'я працуе медсястрой на «хуткай дапамозе».** Ночы і дні, калі даводзіцца дзяжурыць, даюцца вельмі цяжка, бо трацяцца сілы не толькі фізічныя:

— Першы час, калі толькі скончыла вучыцца, было проста невыносна. Хоць і маю медыцынскую адукацыю, і, здаецца, павінна нармальна ставіцца да таго, што бачу на працы, але... Я прыходзіла дадому і плакала, бо бачыць за адзін дзень столькі (а мы ж выязджаем і на аварыі, і да дзядулек-бабулек, якія ляжаць не адзін год) здавалася невыносным.

Па словах Дашы, самай папулярнай прэтэнзіяй, якую выказваюць ёй людзі, з'яўляецца тое, што «хуткая» ездзіць надта марудна:

— Я разумею, што значыць чакаць, калі табе самому альбо твайму блізкаму патрэбна дапамога, а ніхто не едзе. Але што ж мы можам зрабіць? Не па сваёй жа волі мы не аказваемся ў неабходным месцы ў тры імгненні. Вось, напрыклад, зімой значная частка выклікаў — калі неабходна ехаць ратаваць якога-небудзь выпівоху, што спіць і мерзне на прыпынку. Не паехаць нельга, а на месцы аказваецца, што ўсё з ім нармальна і адзіная дапамога, якая была патрэбна — разбудзіць. А так нейкі чалавек яго шкадуе, тэлефануе ў «хуткую», брыгада траціць свой час і можа не паспець да кагосьці сапраўды хворага. На жаль, не раз было, што мы прыязджалі, і адзінае, што ўжо патрабавалася на той момант — канстатаваць факт смерці.

Наступная катэгорыя незадаволеных працай «хуткай дапамогі» — маладыя маці.

— Вось прыедзеш да дзіцяці, стараешся спакойна тыя ж уколы рабіць, асабліва калі маленькае, хвалюешся, а мама яго тым часам ходзіць вакол і стогне. То я з холаду, а ў дзіцяці тэмпература, то ўзяла яго не так, то плача яно занадта гучна, значыць, я зрабіла нешта няправільна. Аднойчы на маю сяброўку, якая таксама на «хуткай» працуе, такая маці паскардзілася. Нібыта пасля дадзенага лякарства ў яе сына пачалося атручэнне. Непрыемна было, бо тыя лекі гэткага эфекту аказваць не могуць. Высветлілася ўсё толькі тады, калі дзяўчыне ўжо ледзь не далі вымову: маці сама ёй патэлефанавала і прасіла прабачэння, бо ўспомніла, што сама не дагледзела і забылася — малы з'еў пірожнае «ўзростам» у некалькі дзён.

## «А ДЗЕ Ж МАЯ ПАСЫЛКА?»

Пятнаццаты дзень кожнага месяца, калі людзі прыходзяць, каб аплаціць усё неабходнае, **Ірына, аператар паштовай сувязі з Брэста,** узгадвае з жахам:

— Ой, мне бывае вочы на акенца няма часу падняць. Людзі ідуць суцэльным патокам, і ў мяне такі алгарытм працы: паперкі-камп'ютар.

Такі тлум выклікае мала прыемных эмоцый як у працаўнікоў пошты, так і ў яе наведнікаў:

— Кнігу скаргаў людзі просяць у асноўным тады, калі гэта сапраўды патрэбна. Не станеш жа разводзіць скандал на пустым месцы. Але часам я проста не ўяўляю, як можна так сябе паводзіць, ды пры гэтым яшчэ і на кагосьці скардзіцца, каб яго пасля пакаралі. Аднойчы прыйшоў кліент, каб грошы на тэлефон пакласці, падаў мне паперку з прозвішчам і нумарам. Напісана было неразборліва, і ў чэку прозвішча я выбіла няправільна. «Вы што, чытаць не ўмееце? « — мужчына, відаць, быў у дрэнным настроі, таму з-за такой драбязы і пачаў сварыцца. Хацеў скаргу напісаць, што на нашай пошце да яго непаважліва паставіліся. Я ўжо ледзь не плакала, таму супакойваць яго не стала, а проста запыталася: «Скажыце, ну чым я вас пакрыўдзіла?». Нечакана гэта яго астудзіла, і пісаць мужчына нічога не стаў.

Яшчэ адну гісторыю Ірына ўзгадвае адначасова са смехам і з жалем:

— Да нас прыйшоў па пасылку пажылы чалавек. Ён гэтую пасылку забраў, а праз два дні вярнуўся зноў, каб... атрымаць тую ж пасылку. Яму ўсё растлумачыла, паказала дакументы, дзед, здаецца, супакоіўся. А праз тыдзень прыйшоў ізноў. Ну што, я яму нейкую іншую пасылку павінна выдаць? Тут ужо мужчына пачаў сварыцца і казаць, што я падманваю старога чалавека, дурня з яго раблю. Захацеў паскардзіцца майму начальніку, што і зрабіў. Пасля аказалася, што мужчына мае праблемы з псіхікай. Зразумела, мне нічога не зрабілі з-за гэтай скаргі, але пахвалявацца прыйшлося, пакуль усё не высветлілі.

## ЗА КАПРЫЗЫ КЛІЕНТАЎ НЕ ДАПЛАЧВАЮЦЬ!

У кавярнях і рэстаранах звычайна скардзяцца на дрэнна прыгатаваную ежу, брудны посуд і непачцівых афіцыянтаў.

— У кавярні, дзе працую, афіцыянты заказ не прымаюць і не прыносяць, а толькі прыбіраюць са стала, — расказвае **Наталля**.

Здаецца, на што тут ужо скардзіцца: стасункі наведнікаў і афіцыянтаў мінімальныя, канфлікты могуць узнікнуць хіба што з-за заўчасна прыбранага посуду, у якім яшчэ добрая частка ежы не кранутая. Аказваецца, знайсці, за што пасварыцца — зусім не праблема:

— Я была ў зале, калі мяне аклікнуў хлопец і папрасіў падысці. Я здзівілася: стол там дрэнна выцерты, ці што? Аказваецца, не. Проста дзяўчыне, якая з ім прыйшла, не спадабаўся шакаладны торт. Яна захацела іншы, з ёгуртам. Вось хлопец і папрасіў мяне прынесці новы дэсерт, а дапласціць ён пасля. Я, зразумела, пачала тлумачыць, што прыносіць нешта — зусім не мае абавязкі, а маладому чалавеку, відаць, няёмка было перад сваёй дзяўчынай, што нейкая там афіцыянтка з ім у спрэчкі ўступае. І ён папрасіў паклікаць майго начальніка. Думаючы, што праўда на маім баку, я пайшла не марудзячы, а начальнік наш, аказваецца, гэтага хлопца ведаў, часта ён да нас ходзіць і заказвае шмат. Таму мне сказалі нешта накшталт «не пераломішся» і папрасілі прынесці той торт. Я адмовілася, хлопец і дзяўчына пасля некалькіх хвілін скандалу сышлі. Мне пасля паўгадзіны выгаворвалі, як я павінна сябе паводзіць. Тым, што мне не даплачваюць за капрызы наведнікаў, я нікому нічога давесці не змагла.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

### Каментары спецыялістаў

### На каго больш за ўсё скардзяцца?

Тлумачыць **Валянціна ГРЫГАРЦЭВІЧ, галоўны спецыяліст сектара па абароне правоў спажыўцоў упраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама**:

— За 9 месяцаў бягучага года 45% скаргаў, разгледжаных у нашым упраўленні, былі на няякасныя бытавыя паслугі. У асноўным спажыўцы незадаволеныя паслугамі па вытворчасці мэблі, працай СТА і атэлье па пашыве і рамонце адзення. 34% скаргаў належаць катэгорыі «Іншыя паслугі». Сюды ўваходзяць звароты, звязаныя з сувяззю і страхаваннем. На трэцім месцы па скаргах — няякасны рамонт мабільных тэлефонаў. Тут лічба складае 7% ад усёй колькасці зваротаў.

### А калі скарга несправядлівая?

Тлумачыць **Ганна СУША, старшыня Беларускага таварыства абароны спажыўцоў**:

— Нават калі прэтэнзія заведама несправядлівая, у любой установе грамадзяніну павінны даць кнігу скаргаў па першым жа патрабаванні. На працягу 15 дзён на запіс патрэбна даць адказ, і тады высветліцца, хто ў гэтым выпадку вінаваты.

# ЛАВІСЯ, РЫБА, ТОЛЬКІ ВЯЛІКАЯ!

**Зараз у рыбаводаў краіны бадай што самая гарачая пара — яшчэ некалькі дзён, і масавы асенні адлоў рыбы завяршыцца.**

**У рыбгасе «Волма» праца кіпіць — выпаў першы снег, але рыбакі на сажалках.**







**Восем рыбаводаў цэха сартавальнай базы за дзень «прапускаюць» каля 40-50 тон рыбы — гэта карп і амур, таўсталобік, сом, карась.**

**На абедзенны перапынак збіраюцца ўсе ахвотныя каля вялікага катла, а вось рыбакам адвозяць тэрмасы адразу на сажалкі. На працягу васьмі гадоў повар Тамара Лычкоўская штодзень варыць каля пяцідзесяці літраў смачнай юшкі і корміць усіх супрацоўнікаў рыбгаса.**

**Вылавіць рыбу без чалавека немагчыма — цэлы дзень па калена, а то і вышэй, у вадзе. За адзін раз шэсць рыбакоў дастаюць больш за дзесяць тон, адгружаюць у машыны — каб свежая рыба хутка трапіла на нашы сталы.**

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**

*Чэрвеньскі р-н.*

Асабістае

# ЖЫЦЦЁ... «ДРУГОГА ГАТУНКУ»?

**ЁСЦЬ рэчы, паўплываць на якія немагчыма. Яны існавалі, існуюць і будуць існаваць незалежна ад нашага жадання ці нежадання, падпарадкоўваючыся выключна сваім унутраным законам. Як усход і захад сонца, як змена пораў года, як бег часу і як тое, што ўсе мы, якімі б маладымі, прыгожымі і поўнымі сіл ні былі, рана ці позна састарэем.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Зразумела, калі табе 30 ці 40, ты не надта абцяжарваеш мозг падобнымі думкамі. Безумоўна, ты ведаеш пра наяўнасць пажылых людзей і здагадваешся, што калі-небудзь трапіш у іх шэрагі. Але пакуль што, сёння і цяпер, яны жывуць у іншым вымярэнні, у іншай плоскасці, якія з тваёй плоскасцю і тваім вымярэннем практычна не перасякаюцца. Старых быццам не існуе. Згадванне пра іх псуе настрой тым, у каго яшчэ ёсць сям'я, праца, сябры, здароўе, запатрабаванасць і перспектывы.

У нашым двары, дзе «кучкуецца» некалькі дзевяціпавярховікаў, не так даўно адкрылі новую прадуктовую краму. Ад усіх іншых яна адрозніваецца больш высокімі цэнамі і відавочнай прэтэнзіяй на пэўную элітарнасць. Кантынгент пакупнікоў у асноўным адпавядае цэннікам. Дамачкі не мітусяцца, выбіраюць тавар без напружання, арыентуючыся не на цану, а на якасць, на вытворцу... І раптам — затор у аддзеле кулінарыі. Пажылая жанчына ў паношаным дэмісезонным паліто просіць узважыць ёй шэсць курыных крылцаў. Але, зірнуўшы на электронныя лічбы, бянтэжыцца і просіць прадаўца адняць ад шасці крылцаў спачатку два, потым яшчэ адно. Тая ж самая гісторыя паўтараецца з фаршам. Ёй узважваюць каля кілаграма. Потым, па просьбе пакупніцы, «кучка» змяншаецца напалову, а ў выніку на вагах застаецца грамаў дзвесце. «І пакладзіце яшчэ вось гэтай салаты з капусты і буракоў, — просіць жанчына. — Толькі калі яна вострая, то шмат не трэба, бо ў мяне са страўнікам праблемы». Дама, якая стаіць за ёю, не вытрымлівае. Гучна выдыхнуўшы паветра і нервова страсянуўшы выбеленай грыўкай, яна з'едліва вымаўляе — быццам пад нос, але так, каб пачулі астатнія: «Дома трэба было думаць... Павыпаўзалі тут...» Безумоўна, жанчына гэта чуе, але не рэагуе ніяк. Магчыма, яна выхаваны чалавек, які губляецца і адступае перад праявамі хамства. Магчыма, проста прывыкла да такой рэакцыі, да такога стаўлення і навучылася з імі суіснаваць: у паліклініцы, у краме, у ЖЭСе — там, куды яна перыядычна «выпаўзае», каб задаволіць немудрагелістыя жыццёвыя патрэбы.

«І куды ўсе яны пруцца?» — абураемся мы ў «час пік», незадаволеныя колькасцю асоб пенсійнага ўзросту на квадратным метры аўтобуснай плошчы. «Ім бы ўсё па паліклініках цягацца!» — моршчымся, седзячы ў чарзе да ўчастковага тэрапеўта. «І што ён там так доўга пералічвае?» — бурчым у спіну чалавеку, які зайшоў у аддзяленне сувязі па пенсію. Мы ўсур'ёз перакананыя, што сталыя людзі бессаромна крадуць наш час, уступаючы з намі ў бессэнсоўныя размовы і непатрэбныя дыскусіі. І паблажліва пазіраем на іх з п'едэстала сваёй маладосці, адукаванасці і «прасунутасці». І дазваляем сабе кпіць — часам адкрыта і недвухсэнсоўна, часам — элегантна і вытанчана... Дарэчы, дастаецца не толькі простым смяротным. Вядомыя і славутыя гэтага свету, перасягнуўшы «запаветную» ўзроставую мяжу, таксама могуць лёгка апынуцца ў шэрагах «аб'ектаў для біцця». Не так даўно прачытала ў адным з беларускіх выданняў вельмі дзіўнае (мякка кажучы) інтэрв'ю з Маргарытай Церахавай, у якім аўтар прадставіў вядомую актрысу не інакш, як... старую «развaліну» (даруйце, іншых слоў не падбяру), у якой паехаў «дах». Чаго вартае адно толькі апісанне таго, як, седзячы з журналістам у тэатральнай кавярні, народная артыстка (дама, як вядома, ужо не маладая) спачатку прагна накідваецца на купленыя для яе пірожныя, а потым неўпапад адказвае на пытанні, перыядычна замаўкаючы, нібыта «ўпадае ў спячку». Аўтар артыкула не дараваў беднай Маргарыце Барысаўне ні адсутнасці макіяжу, ні зблытаных валасоў, ні «абвіслай» скуры, ні мешкаватага адзення... Інакш кажучы, не дараваў адпаведнасці свайму ўзросту — маўляў, хацеў убачыць дзіву, а прыйшла... старая цётка з відавочнымі праблемамі са здароўем, з чаго аўтар і павысцёбваўся ад душы...

Напэўна, яму падалося, што інтэрв'ю атрымалася сенсацыйным... Асабіста ў мяне яно не выклікала ніякіх эмоцый, акрамя гідлівасці — у дачыненні да аўтара, які прынізіў не зусім адэкватную пажылую жанчыну, прычым прынізіў прынародна... Бог яму, як той казаў, суддзя.

Старасць, на жаль, рэдка бывае прыгожай. І на яшчэ большы жаль, далёка не заўсёды бывае элементарна дагледжанай. Безумоўна, ёсць розныя людзі і розныя лёсы, розныя стасункі ў сем'ях. Бацькоўская нелюбоў да дзіцяці бумерангам вяртаецца ў старасці... Але ж і ў нармальных, так бы мовіць, сярэднестатыстычных сем'ях людзі старэйшага пакалення нярэдка адчуваюць сябе адзінокімі. Нават жывучы са сваімі роднымі пад адным дахам. Саромеюцца лішні раз патрывожыць, патурбаваць, паскардзіцца на свае «балячкі». Баяцца нарвацца на грубасць, на абыякавасць, на раздражнёнае: «Адчапіся, і без цябе моташна!..» Баяцца не там сесці, не туды стаць, не тое ўзяць, не так адказаць... І адкладваюць, адкладваюць, адкладваюць са сваіх невялікіх пенсій грошы ўнукам на вучобу, дзецям на тэлевізар, сабе на... пахаванне.

Не так даўно, седзячы ў чарзе да акуліста, разгаварылася з адной мілай пажылой жанчынай. Дакладней, яна сама падсела да мяне, каб пацікавіцца, што я чытаю. І была вельмі ўражана, убачыўшы кнігу Франсуазы Саган. «Я думала, яе творы ўжо нікога не цікавяць, — сказала яна. — Мне таксама вельмі падабаецца чытаць. Раней літаральна «глытала» кнігу за кнігай, а цяпер стала дрэнна бачыць. Гэта такая бяда — не мець магчымасці чытаць тое, што напісалі разумныя людзі... Але мяне выратоўвае ўнучка — па вечарах чытае ўголас. Я такая шчаслівая ад гэтага!..»

Яна глядзела на мяне празрыстымі, як веснавое неба, вачыма, у якіх чыталіся яснасць думак і заспакоенасць. Тая заспакоенасць, якую могуць даць толькі любоў і разуменне блізкіх людзей.

**Наталля КАРПЕНКА.**

Нататкі «ўнутранага турыста»

# І скрыпка — «франтавік»

**МАЛЕНЬКІЯ гарадкі, пасёлкі нашай любай Беларусі... Колькі цудоўных людзей тут жыве! І прыезджым ёсць чаму падзівіцца. У музеі Бешанковічаў ёсць насамрэч унікальныя экспанаты. У прыватнасці, асабіста для мяне вельмі сімвалічна было ў сумную гадавіну пачатку Вялікай Айчыннай вайны ўбачыць унікальную скрыпку, якую салдат-музыкант пранёс праз усю вайну. І на футарале інструмента адзначаў гарады, якія былі ўзяты нашымі войскамі.**

## Сучасны Дом культуры

А ўсё распачалося, як часта бывае, падчас гутаркі з мясцовымі жыхарамі. Як і ў Полацк, Оршу, пра што ўжо пісаў у першых нататках, прыехаў у Бешанковічы з шасцігадовым сынам Міхаілам. Вядома, хацелася нешта цікавае паказаць хлопчыку. Дапамагла наша чытачка, **начальнік аддзела культуры Бешанковіцкага райвыканкама Наталля АПАНАСЁНАК**. На пачатку размовы Наталля Мікалаеўна падзялілася прыемнымі навінамі. Пасля завяршэння капітальнай рэканструкцыі адчыніўся раённы Дом культуры. Гэта дало магчымасць запрашаць на выступленні ў гарадскі пасёлак прафесійных артыстаў, і «зоркі» айчыннай эстрады ўжо парадавалі публіку сваім майстэрствам, а артысты Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа паказалі спектакль.



Старажытны абрус у бешанковіцкім музеі.

Разам адправіліся ў прыгожы Дом культуры. Шыкоўная глядзельная зала з сучасным абсталяваннем, добрыя пакоі для заняткаў гурткоўцаў. У Доме культуры працуе больш за дзесяць клубаў, пяць з іх маюць званні «народны» або «ўзорны»: народны хор, аркестр народных інструментаў, дзіцячы ансамбль «Званіца», ансамбль народнай песні «Весялуха» і клуб «Ветэран». Ёсць і вакальна-інструментальны ансамбль «Усё спачатку», тэатральны калектыў, тэатр мініяцюр, створаны клуб аматараў гітары. З прыходам маладога спецыяліста аднавіў працу харэаграфічны калектыў сучаснага танца. Усё не горш, чым у вялікіх гарадах. Падчас экскурсіі не мог не запытаць: як вырашаецца, бадай, «вечная» для глыбінкі кадравая праблема?

## Працуюць навучэнцы

Высветлілася, што сёлета была прынятая раённая праграма «Кадры культуры: 2011—2015 гады».

— У раёне, безумоўна, не без кадравага «голаду». Ёсць вакантныя пасады дырэктараў (у двух аграрных гарадках), мастацкага кіраўніка, акампаніятара, — расказвае Наталля Апанасёнак. — Так, па мэтавым накіраванні адпраўляем мясцовую моладзь на вучобу. І хлопцы, дзяўчаты паступаюць у профільныя ўстановы адукацыі на льготных умовах. Але ж пры гэтым узнікае праблема. Атрымлівае, напрыклад, чалавек дыплом у каледжы мастацтваў, чакаем мы яго, а ён паступае далей у ВНУ. А яшчэ, калі дзяўчына выходзіць замуж — ці вернецца?

Як выходзім са становішча? Дамовіліся з дырэктарамі віцебскіх каледжаў (музычнага, мастацтваў), каб яны прапанавалі навучэнцам старшых курсаў падпрацаваць. Такім чынам, у аграрным гарадку Ула, дзе не хапала ў музычнай школе выкладчыкаў па класе баяна, фартэпіяна, цяпер працуюць іх навучэнцы. Па суботах, калі заняткаў у іх няма. Працуюць на палову стаўкі. У месяц тысяч па трыста рублёў атрымліваюць, што для навучэнцаў нядрэнна. Праезд стараемся кампенсаваць — прэміруем. І дзяўчына, якая працуе такім чынам, ужо вырашыла папрасіцца на працу ў наш раён. Хлопец падпрацоўвае акампаніятарам на 0,25 стаўкі — быццам бы, няшмат, але для навучэнца 100 і больш тысяч рублёў — нядрэнна. Таксама хоча працаваць у нашым раёне.

З-за адсутнасці спецыялістаў ва ўстановах культуры працуюць тыя, хто не атрымаў спецыяльнай адукацыі. Напрыклад, ёсць бухгалтар, які працуе загадчыкам сельскага клуба. Але пры гэтым стараюцца падбіраць такіх людзей, якія не без творчых здольнасцяў.

— У навучальных установах культуры на дзённым аддзяленні навучаецца 44 чалавекі, з іх 27 — у вышэйшых, 17 — у сярэдніх спецыяльных. З іх 11 па кантрактнай форме. Завочна навучаецца 15 работнікаў, — працягвае начальнік аддзела культуры. — Вядома, кадравую праблему цяжка вырашыць без прадстаўлення жылля маладым спецыялістам. Старшыня райвыканкама Леанід Пянькоўскі стараецца дапамагчы ў вырашэнні пытання. Напрыклад, выдзелілі пакой у інтэрнаце для маладога спецыяліста. Каб неяк дадаткова замацаваць моладзь у глыбінцы, безумоўна, патрэбна жыллё. Калі раней зняць аднапакаёвую кватэру ў Бешанковічах абыходзілася долараў у дзесяць — у месяц, то зараз — у некалькі разоў даражэй. Для маладых спецыялістаў грошы немалыя. Ды і знайсці кватэру ў арэнду вельмі складана ў маленькім гарадку. Што тычыцца заробку работнікаў культуры, асабліва маладых, то не «разбагацееш». А працаваць прыходзіцца і па вечарах, да позняй ночы часта, па выхадных і з выездам у вёскі.

А ці паспяхова аказваюцца платныя паслугі?

Аказалася, што большасць культурна-масавых мерапрыемстваў праводзіцца менавіта так. Напрыклад, у раённым Доме культуры план аказання платных паслуг выкананы на 176 працэнтаў — гэта за дзевяць месяцаў. Кожную нядзелю працуе клуб выхаднога дня, у праграме якога танцавальна-забаўляльныя, гульнявыя праграмы, лялечныя спектаклі, атракцыёны, настольныя гульні для дзяцей і дарослых... Тры разы на тыдзень у глядзельнай зале Дома культуры для дзяцей і дарослых праходзіць паказ кіна- і відэафільмаў.

## Скрыпка-«франтавік»

У раённым гісторыка-краязнаўчым музеі беражліва захоўваюць усе экспанаты і, зразумела, ганарацца ўнікальнымі. Ёсць сярод іх і скрыпка, з якой ураджэнец гэтых месцаў Даніла Паўлавіч Аўчыннікаў прайшоў усю вайну. На жаль, яго ўжо няма з намі даўно. Скрыпку падарыла музею ягоная ўдава.

У раёне плануюць адзначыць наступным летам 200-годдзе вайны з войскамі Напалеона. Ужо прапрацоўваюцца разам з упраўленнем культуры аблвыканкама планы. Славутая бітва пад Астроўна прадстаўлена ў музеі ў якасці дыярамы.

Стараннямі работнікаў культуры ў вёсцы Двор Нізгалава створана экспазіцыя, якая дае ўяўленне аб тым як калісьці жылі беларусы. І ўжо нават іншаземныя турысты — з Расіі, Германіі — падзівіліся ўбачанаму.

Не без гонару работніцы музея паказалі карэспандэнту «Звязды» традыцыйныя беларускія прадметы побыту, зробленыя ў XIX стагоддзі. Ёсць жбаны, якія рабілі толькі на бешанковіцкай зямлі. Ёсць і спарыш, у якім работнікам у поле прыносілі адразу і «першую», і «другую» стравы.

## Іншаземцам падабаюцца... прасы

У Бешанковіцкім раённым Доме рамёстваў старанна захоўваюць традыцыі продкаў. Рамёствамі займаюцца ў гуртках па пляценні з саломы, керамікі, ганчарства, выцінанкі, ткацтва, вышыўкі і гэтак далей. Сярод гурткоўцаў ёсць і людзі з абмежаванымі магчымасцямі. Такіх шэсць чалавек. Займаюцца першы год. Хаця, калі бачыш іх творы, хочацца сказаць, што аўтары — з неабмежаванымі магчымасцямі!

Супрацоўніцы Дома народных рамёстваў ездзяць у этнаграфічныя экспедыцыі па вёсках. Прывезлі сярод іншага прасы, жбаны мінулых стагоддзяў. І сучасныя ганчары на іх узор робяць свае вырабы.

Прадстаўлена пастаянна дзейная выстава гурткоўцаў Дома рамёстваў і клуба народных майстроў «Мая зямля — мая Радзіма». Вельмі падабаюцца гасцям з-за мяжы экспанаты. Шведам, у прыватнасці, вельмі спадабаліся керамічныя прасы. Яны даступныя па цане і беларусам — усяго 25 тысяч рублёў за штуку.

Пры Доме рамёстваў працуе і народны клуб «Скарбонка», у склад якога ўваходзіць 35 народных майстроў. Галіна Мікалаеўна Ханяк з'яўляецца членам Саюза майстроў Беларусі. Сёлета яна адзначана дыпломам за ўдзел у абласным свяцеконкурсе лапікавага шыцця.

Не мог не паразмаўляць з майстрамі. Марыя Ісакаўна Калкова якраз займалася вышыўкай. Расказала, што налета трэба будзе абараніць званне «народны» клуба, якім яна кіруе, таму гурткоўцы вельмі хвалююцца. Творы яе — іконы, карціны — заваражваюць сваёй прыгажосцю. Майстар расказала, што ўсяму навучылася сама. Цікава, дарэчы, што вышыўкай сярод гурткоўцаў займаецца і мужчына...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ. Фота аўтара.**

*Бешанковічы—Віцебск.*



Дыярама бітвы пад Астроўна в бешанковіцкім музеі.

# Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 40 (419)

## Салата

**Расліна холададаўстойлівая. Усходы вытрымліваюць замаразкі да мінус 3—5 градусаў. Аптымальная тэмпература для росту і развіцця расліны — 15—20 градусаў. Ад усходаў да спажывання, у залежнасці ад гатунку, праходзіць 40—80 дзён.**

Адрозніваюць наступныя салаты: ліставую, качанную і рамэн. Ліставая салата мае лісты яйкападобнай або адваротнаяйкападобнай формы з суцэльнымі або махровымі краямі.

У качаннай салаты лісты акруглай, пупышкападобнай, авальнай або амаль трохвугольнай формы з роўным або зубчастым краем.

У салаты рамэн лісты падоўжаныя, даволі шчыльныя, утвараюць качаны падоўжана-авальнай формы.

Салата багатая на розныя вітаміны. У яе лістах ёсць нікацінавая, лімонная і іншыя кіслоты, солі калію, кальцыю, жалеза, злучэнні фосфару. У ліставой салаты ў ежу ўжываюць лісты, а ў качаннай — лісты і храпку. Салата належыць да каштоўных дыетычных раслін, якія асабліва карысныя для дзяцей і хворых. Дзякуючы ўдаламу спалучэнню соляў калію і натрыю гэтая культура спрыяе падтрыманню раўнавагі воднага балансу ў чалавечым арганізме. Арганічныя кіслоты, у прыватнасці, лімонная, павышаюць працаздольнасць чалавека. Сок расліны на смак гаркаваты, падобны на малако. У ім знойдзена каштоўнае рэчыва лактуцын, якое супакойвае нервовую сістэму і паляпшае сон. А яшчэ салата багатая на вітамін Р, які ўмацоўвае крывяносныя сасуды. Расліна стымулюе выдаленне з арганізма халестэрыну.

Вырошчваюць салату ў адкрытым і ахаваным грунце. Познаспелыя гатункі паспяхова вырошчваюць як ушчыльняльнік капусты. Высяваюць на градцы радкамі. Адлегласць паміж радкамі 15—20 см, паміж раслінамі 7—10, да 15—20 см, у залежнасці ад разнавіднасці і гатунку.

Догляд раслін заключаецца ў сістэматычным рыхленні міжрадкоўя, праполцы пустазелля, паліванні і прарэджванні раслін, калі радкі загушчаныя.

Каб падоўжыць тэрмін выкарыстання салаты на вясенне-летні-асенні час, мэтазгодна сеяць яе ў 3—4 тэрміны прыкладна праз 20 дзён.

## ОХ УЖО ГЭТЫ ДРАЦЯНІК

*«Бульба сёлета на сотках вырасла неблагая, але са скразнымі дзіркамі: відаць, драцянік пагаспадарыў. Як жа пазбавіцца ад яго?»*

Снапкоў А. І.,
*Маладзечанскі раён.*

**Трэба ў першую чаргу захоўваць севазварот, часта і старанна рыхліць глебу, знішчаць пустазелле, асабліва пырнік, своечасова вапнаваць кіслыя глебы. З хімічных сродкаў рэкамендуецца ўнесці ў глебу пры пасадцы бульбы 10-працэнтны грануляваны базудзін. Можна таксама вылоўліваць лічынак пры дапамозе прынад: кавалачкі нарэзанай бульбы або буракоў закопваюць у глебу праз 10 см на глыбіню 5—15 см і галінкамі адзначаюць месца іх знаходжання праз 3—4 дні прынады з лічынкамі, якія абляпілі клубень, выкопваюць і знішчаюць. Гэты прыём трэба паўтарыць некалькі разоў.**

**Калі ў вас няма магчымасці вызначыць кіслотнасць глебы лабараторным шляхам, прыглядзьцеся ўважліва, што расце летам на вашым участку. Калі шмат конскага шчаўя, хвашчу, трыпутніку, верасу, падбелу, мяты палявой, асакі — значыць, глеба кіслая. У разліку на 1 метр унясіце на глiністых і сугліністых глебах 700 г вапнавых угнаенняў, на супясчаных — 450, на пясчаных — 350 грамаў.**

## Торф як угнаенне

**Калі мы гаворым пра такое ўгнаенне, як торф, то звычайна маем на ўвазе аднародную чорную, часта вельмі вільготную масу. Яна ўтваралася стагоддзямі. Спецыялісты дзеляць тарфянікі на верхавыя, нізінныя і змешаныя (ці яшчэ пераходныя).**

Угнаенні з верхавых і пераходных балот не маюць вялікай каштоўнасці (хіба толькі для тых раслін, якія любяць кіслую глебу, у прыватнасці, буякі садовыя). Да таго ж яны не багатыя на пажыўныя рэчывы. А вось для расады, калі іх узбагаціць макра- і мікраэлементамі, падыдуць. Лепш за ўсё — нізінныя тарфянікі. Іх асушаюць і здабываюць торф. Вы, відаць, бачылі вялізныя пірамiды торфу. Такім спосабам ён рыхтуецца на ўгнаенні. Шкодныя рэчывы выветрываюцца, недаступныя раслінам элементы сілкавання робяцца даступнымі.

Дзеянне торфу ўзмацняецца, калі ён пасля прасушкі і праветрывання пройдзе праз кампосты, дзе будзе ўзбагачаны гноем. Гэта рэкамендуецца яшчэ і таму, што ў торфе мала фосфару і асабліва калію, што і папоўніць гной (вадкі і цвёрды).

Вельмі добра замульчыраваць дробным торфам пасеяную моркву, пятрушку, чарнушку на насенку, агуркі, буракі, фасолю і многія іншыя культуры.



На дачных участках і ля вясковых хат ямы туалетаў абавязкова прысыпаюць торфам. Змесціва гэтых ям прымяняюць для міні-кампостаў. Пасля двух гадоў вылежкі такі кампост можна выкарыстоўваць у садзе.

## Цыбуля расце

**Для цыбулі характэрна такая асаблівасць — у час захоўвання расці: складзеш на зіму ў мяшкі — і раптам заўважаеш, што ў цыбулін з'яўляюцца карэньчыкі. Тое ж самае адбываецца, калі цыбуля знаходзіцца ў мяшках у сховішчах. Спецыялісты кажуць, што аптымальны спосаб захоўвання цыбулі — заплятаць у «коскі». Вось чаму ў нашых бабуль цэлыя вянкі з заплеценых у «коскі» цыбулін знаходзіліся на печы або перад печчу.**

Вырошчваць цыбулю можна практычна на ўсіх глебах. Гідрапоніку цыбуля недалюблівае — яна падгнівае. Бывалыя агароднікі рэкамендуюць высяваць цыбулю паміж радкоў іншых культур, напрыклад, бульбы, капусты ці клубніц. Тады фітанцыды адпужваюць тлю, матыльноў і вусеняў. Калі ж пасадзіць на леташнюю цыбульную градку бульбу, тады і драцянік менш будзе нападаць на пасадкі бульбы. Па некаторых звестках, поле, дзе расла цыбуля, за кошт вялікай колькасці выдзяленняў з каранёў цыбулі ў глебе перашкаджае нашэсцю каларадскіх жукоў.

Адзінае, чаго не любіць цыбуля — гэта арганічныя ўгнаенні. Не варта класці пад пасадкі цыбулі гной — яна можа згарэць. А вось падкормка драўнінным попелам дазволіць вам дасягнуць высокага ўраджаю. І яшчэ. Цыбуля, намочаная ў час нарыхтоўкі, можа хутка згнісці.

## Хатняя «Фанта»

**Гарбузовы сок вельмі карысны, але на смак не вельмі прыемны. Таму з яго можна прыгатаваць хатнюю «фанту».**

Прапусціце гарбуз праз сокавыціскалку і на 1 літр соку дабаўце адзін дробна нарэзаны (са шкуркай і без костачак) апельсін. Папярэдне абдайце яго кіпнем, каб у скурцы не было горычы. Цукар дабаўляйце на смак. Сок пастаўце на агонь і давядзіце да кіпення. Пераліўшы яго ў стэрылізаваныя слоікі, адразу ж закатвайце. А хочаце — піце так, толькі спачатку астудзіце «фанту». Гэтак жа сама можна зрабіць і з кабачком. Але замест апельсіна дабаўце лімон. На літр соку дастаткова яго палавінкі.

Адходы вытворчасці — кабачковыя жамерыны — таксама спатрэбяцца. Дадайце ў іх нацёртую моркву, дробна нарэзаную рэпчатую цыбулю, памідоры. Пасаліце, папярчыце. Засталося ўсё гэта патушыць — і кабачковая ікра гатовая.

### Кватэрнае пытанне

# ПАЕХАЦЬ... КАБ ВЯРНУЦЦА?

***Наш зяць уладкаваўся на працу ў Маскве. Туды ж хоча перавезці і сваю сям'ю (гэта значыць, маю дачку і ўнучку). У Мінску ў іх аднапакаёвая кватэра. Па даўнейшых законах, наколькі ведаю, яе можна было на год, два, тры забраніраваць. Ці можна зрабіць гэта цяпер, бо мне вельмі хочацца, каб яны вярнуліся?***

Г.З., *Мінскі раён.*

Сапраўды, у заканадаўстве (арт. 70—78 Жыллёвага кодэкса БССР, які дзейнічаў да 1 ліпеня 1999 г.) такія нормы існавалі.

У новых сацыяльна-эканамічных умовах змест жыллёвых адносін значна змяніўся, і рэгуляванне іх ажыццяўляецца на прынцыпова новай аснове.

Дзейны Жыллёвы кодэкс Рэспублікі Беларусь (увайшоў у сілу з 1 ліпеня 1999 г.) не змяшчае нормаў аб браніраванні жылых памяшканняў.

За грамадзянамі — уласнікамі жылых памяшканняў, згодна з законам, захоўваюцца іх правы ўладання, карыстання і распараджэння жылымі памяшканнямі, якія ім належаць, і ў выпадках іх выбыцця з месца пастаяннага пражывання не патрабуецца браніраванне гэтых жылых памяшканняў.

Што датычыцца наймальнікаў жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду, то яшчэ ў 1996 годзе Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь прызнаў не адпавядаючым Канстытуцыі арт. 70 Жыллёвага кодэкса (захаванне жылога памяшкання за часова адсутнымі грамадзянамі) і палічыў яго страціўшым сілу з моманту прыняцця адпаведнага Заключэння ад 25 чэрвеня 1996 г. № 3-38/96. На думку Суда, вышэйназваная норма ЖК, якая прадугледжвала захаванне жылога памяшкання за часова адсутнымі грамадзянамі на працягу пэўных тэрмінаў, парушала канстытуцыйныя правы грамадзян на жыллё. Часовая адсутнасць наймальніка або членаў яго сям'і не мяняе прызначэння жылога памяшкання і не парушае правы і законныя інтарэсы іншых асоб, калі пры гэтым выконваюцца ўмовы дагавора найму жылога памяшкання.

**Віктар САВІЦКІ.**

## ІП не маюць даўгоў

Паводле звестак Віцебскай абласной інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах, толькі за першыя дзевяць месяцаў года ў кансалідаваны бюджэт Прыдзвінскага краю суб'ектамі малога прадпрымальніцтва выплачана 464,3 мільярда рублёў падаткаў і збораў. Паступленні ад юрыдычных асоб склалі 376,8 мільярда рублёў, а ад індывідуальных прадпрымальнікаў — 87,5 мільярда рублёў.

У Віцебскай вобласці на пачатак кастрычніка на падатковым уліку знаходзілася 34,4 тысячы суб'ектаў малога прадпрымальніцтва, сярод якіх 8,2 тысячы юрыдычных асоб і 26,2 тысячы індывідуальных прадпрымальнікаў. Што тычыцца даўжнікоў па выплаце падаткаў, то іх сярод прадстаўнікоў бізнэсу нямнога. Па звестках на кастрычнік, у ліку даўжнікоў перад бюджэтам было толькі пяць суб'ектаў малога бізнэсу. І іх агульная запазычанасць склала ўсяго 116,5 мільёна рублёў. Што цікава, ІП запазычанасці па выплаце падаткаў не маюць.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

ОАО «Брестский КСМ» приобретает на баланс общества простые (обыкновенные) акции, выпущенные ОАО «Брестский КСМ», в количестве до 5080 штук по цене 300000 рублей за одну акцию с оплатой денежными средствами с целью последующего пропорционального распределения среди акционеров. Срок, в течение которого акционеры должны предоставить предложение о продаже принадлежащих им акций — с 17.11.2011 г. по 25.11.2011 г. по адресу: г. Брест, ул. Московская, 360.

Выкуп простых (обыкновенных) акций произвести в период с 28.11.2011 г. по 21.01.2012 г. с оформлением сделок купли-продажи акций пропорционально поданным заявлениям.

Адрес, по которому будут заключаться договоры купли-продажи акций: г. Брест, ул. Московская, 360.

Сроки, форма и порядок оплаты — перечисление денежных средств на счет продавца не позднее 30 банковских дней с момента заключения сделки. Конт. тел. 8 0162 95 02 10. УНП 200295903

**Продается котел отопительный водонагревательный Kriger квм(а) 0,3 с автоматической подачей топлива 300 кВт, на твердом топливе (торф, дрова, щепа, опилки) для обогрева промышленных помещений (новый, с хорошей скидкой). Обращаться по телефону: (017) 292 86 62.** УНП 191023112

**Утерянные полисы страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест»** по гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии ВС № 7061646, № 7061647, 7061648, № 7061649, № 7061651, квитанции формы 1-СУ серии КС № 3252456, № 3252457, № 3252458, № 3252459 **считать недействительными**. УНП 100357923

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНОВ

## по продаже недвижимого имущества, находящегося в республиканской собственности, и права заключения договоров аренды земельных участков для его обслуживания, которые составляют единые предметы аукционов

**Организатор аукционов:**
фонд «Минскоблгосимущество»,
г. Минск, ул. Чкалова, 5,
тел.: (8017) 224 39 76,
(8017) 228 60 13
**Место проведения аукционов:**
г. Минск, ул. Чкалова, 5

**Дата и время проведения повторного аукциона: 12 декабря 2011 г. в 11.00**

**Недвижимое имущество** и право заключения договора аренды земельного участка. **Капитальное строение** (инв. № 630/С-42615) – шестиэтажное **здание инженерного корпуса** общей площадью 4816,9 кв.м, 1987 года постройки, стены панельные, кирпичные, перегородки кирпичные, гипсовые. Объект расположен на земельном участке площадью 0,4756 га по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Янки Купалы, д. 130. Срок аренды земельного участка – 30 лет. **Направления возможного использования земельного участка:** разрешено в установленном порядке использовать земельный участок для размещения объектов производственного назначения. **Подробное извещение** о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» за 29 апреля 2010 г. № 82, за 7 мая 2011 г. № 84.

**Начальная цена предмета аукциона: 828 390 371** рубль (в т.ч. объект – 732 222 604 рубля, право заключения договора аренды земельного участка – 96 167 767 рублей). **Размер задатка: 80 000 000** рублей. *Начальная цена продажи объекта понижена на 50 %.*

**Продавец:** производственное республиканское унитарное предприятие «Молодечненский завод порошковой металлургии» (Минская обл., г. Молодечно, ул. Я. Купалы, 130, тел.: (80176) 739010, 732400, 732447). **Арендодатель земельного участка:** Молодечненский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Молодечно, ул. Виленская, 6, тел. (80176) 71663).

**Последний день подачи заявлений** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **8 декабря 2011 г. до 12.00. Задаток** для участия в аукционе перечисляется с даты публикации данного извещения **по 8 декабря 2011 г.** включительно.

**Дата и время проведения аукциона: 16 декабря 2011 г. в 11.00**

**Незавершенное законсервированное капитальное строение** (инв. № 610/U-44586) и право заключения договора аренды земельного участка. Незавершенное законсервированное капитальное строение – **незавершенное строительством одноэтажное здание магазина товаров повседневного спроса** общей площадью 267,2 кв.м, 75 % готовности, стены и перегородки кирпичные, перекрытия железобетонные. Объект расположен на земельном участке площадью 0,1752 га по адресу: Минская обл., Борисовский район, д. Гливин. Срок аренды земельного участка – 30 лет. **Условия использования земельного участка:** использовать земельный участок для обслуживания здания с возможным изменением направления его использования в установленном порядке.

**Начальная цена предмета аукциона: 106 123 266** рублей (в т.ч. объект – 104 305 756 рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 1 817 510 рублей). **Размер задатка: 10 000 000** рублей. *Начальная цена продажи объекта понижена на 20 %.*

**Продавец:** Министерство промышленности Республики Беларусь (г. Минск, пр-т Партизанский, д. 2, корп. 4, тел. (8017) 2249595), имущество находится в безвозмездном пользовании открытого акционерного общества «Борисовский завод «Автогидроусилитель» (Минская обл., г. Борисов, ул. Чапаева, 56, тел.: (80177) 731544, 733317). **Арендодатель земельного участка:** Борисовский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Борисов, ул. Чапаева, 6, тел. (80177) 34016).

**Последний день подачи заявлений** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **14 декабря 2011 г. до 12.00. Задаток** для участия в аукционе перечисляется с даты публикации данного извещения **по 14 декабря 2011 г.** включительно.

**Дата и время проведения аукциона: 16 декабря 2011 г. в 12.00**

**лот № 1**

**Недвижимое имущество** и право заключения договора аренды земельного участка. **Капитальное строение** (инв. № 610/С-43002) – одно-двухэтажное **здание каменного склада** с пристройкой общей площадью 407,4 кв.м, 1897 года постройки, фундамент – камни, стены – камни, кирпич, перегородки кирпичные, перекрытия (чердачное и междуэтажное) деревянные, крыша шиферная. Объект расположен на земельном участке площадью 0,3900 га по адресу: Минская обл., Борисовский район, д. Воровского, назначение: земельный участок для обслуживания здания склада. Срок аренды земельного участка – 30 лет. Введены ограничения в использовании земельного участка в связи с нахождением в водоохранной зоне водных объектов, части земельного участка площадью 0,0236 га в связи с нахождением в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000 вольт. **Направления возможного использования земельного участка:** разрешено использовать земельный участок для обслуживания здания с возможным изменением направления его использования в установленном порядке.

**Начальная цена предмета аукциона: 53 137 660** рублей (в т.ч. объект – 52 546 000 рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 591 660 рублей). **Размер задатка: 5 000 000** рублей. Расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих земельных участков, составляют 1 040 522 рубля (с НДС 20 %).

**лот № 2**

**Недвижимое имущество** и право заключения договора аренды земельного участка. **Капитальное строение** (инв. № 610/С-43004) – одноэтажное **здание склада** общей площадью 201,0 кв.м, 1897 года постройки, фундамент бутовый, стены и перегородки каменные, крыша шиферная. Объект расположен на земельном участке площадью 0,2388 га по адресу: Минская обл., Борисовский район, д. Воровского, назначение: земельный участок для обслуживания здания склада. Срок аренды земельного участка – 30 лет. Введены ограничения в использовании земельного участка в связи с нахождением в водоохранной зоне водных объектов, части земельного участка площадью 0,0131 га в связи с нахождением в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000 вольт. **Направления возможного использования земельного участка:** разрешено использовать земельный участок для обслуживания здания с возможным изменением направления его использования в установленном порядке.

**Начальная цена предмета аукциона: 30 465 130** рублей (в т.ч. объект – 30 103 000 рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 362 130 рублей). **Размер задатка: 3 000 000** рублей. Расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих земельных участков, составляют 1 096 580 рублей (с НДС 20 %).

**лот № 3**

**Недвижимое имущество** и право заключения договора аренды земельного участка. **Капитальное строение** (инв. № 610/С-44118) – одно-двухэтажное **здание цеха по переработке сельскохозяйственной продукции** (цех безалкогольных напитков и картофельный цех) с тремя пристройками общей площадью 1157,2 кв.м, 1895/1945 года постройки, фундамент бетонный, стены кирпичные, блоки, камни, перегородки кирпичные, перекрытия (чердачное и междуэтажное) бетонное, крыша железная. Принадлежности: бутобетонный отстойник (40 кв.м), асфальтовая дорожка (529 кв.м). Объект расположен на земельном участке площадью 3,9920 га по адресу: Минская обл., Борисовский район, д. Воровского, назначение: земельный участок для обслуживания цеха по переработке сельскохозяйственной продукции. Срок аренды земельного участка – 30 лет. Введены ограничения в использовании земельного участка в связи с нахождением в водоохранной зоне малых рек. **Направления возможного использования земельного участка:** разрешено использовать земельный участок для обслуживания здания с возможным изменением направления его использования в установленном порядке.

**Начальная цена предмета аукциона: 304 358 959** рублей (в т.ч. объект – 298 302 749 рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 6 056 210 рублей). **Размер задатка: 30 000 000** рублей. Расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих земельных участков, составляют 1 012 114 рублей (с НДС 20 %).

**Продавец (лоты №№ 1–3):** производственное унитарное предприятие «Бумажная фабрика» Департамента государственных знаков Министерства финансов Республики Беларусь (Минская обл., г. Борисов, ул. Заводская, 55, тел.: (80177) 781446, 781312, 781296). **Арендодатель земельных участков (лоты №№ 1-3):** Борисовский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Борисов, ул. Чапаева, 6, тел. (80177) 34016).

**Последний день подачи заявлений** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **14 декабря 2011 г. до 12.00. Задаток** для участия в аукционе перечисляется с даты публикации данного извещения **по 14 декабря 2011 г.** включительно.

**Дата и время проведения аукциона: 19 декабря 2011 г. в 10.00**

**Недвижимое имущество** и право заключения договора аренды земельного участка. **Капитальное строение** (инв. № 642/С-21104) – одноэтажное **здание столовой** общей площадью 305,8 кв.м, 1976 года постройки, стены и перегородки кирпичные, чердачное перекрытие – железобетонные плиты. Принадлежности: бетонная дорожка (26 кв.м), деревянный решетчатый на бетонных столбах забор. Объект расположен на земельном участке площадью 0,1469 га по адресу: Минская обл., г. Копыль, ул. 50 лет БССР, 13. Срок аренды земельного участка – 50 лет. **Условия использования земельного участка:** разрешено в установленном порядке использовать земельный участок для размещения объектов общественного питания, бытового обслуживания населения и розничной торговли.

**Начальная цена предмета аукциона: 232 308 143** рубля (в т.ч. объект – 182 200 643 рубля, право заключения договора аренды земельного участка – 50 107 500 рублей). **Размер задатка: 23 000 000** рублей. *Начальная цена продажи объекта понижена на 20 %.*

**Продавец:** Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь (г. Минск, ул. Кирова, 15, тел.: (8017) 2273751, 2274296), имущество находится в безвозмездном пользовании открытого акционерного общества «Солигорскводстрой» (Минская обл., г. Солигорск, ул. Строителей, 30, тел.: (80174) 223469, 220510). **Арендодатель земельного участка:** Копыльский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Копыль, ул. Ленина, 6, тел. (801719) 55160).

**Последний день подачи заявлений** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **15 декабря 2011 г. до 12.00. Задаток** для участия в аукционе перечисляется с даты публикации данного извещения **по 15 декабря 2011 г.** включительно.

**Дата и время проведения аукциона: 20 декабря 2011 г. в 10.00**

**Недвижимое имущество** и право заключения договора аренды земельного участка. **Капитальное строение** (инв. № 600/С-70832) – одноэтажное **здание автозаправки** общей площадью 47,3 кв.м, 1972 года постройки, фундамент кирпичный, стены и перегородки кирпичные, чердачные перекрытия – железобетонные плиты, крыша совмещенная рулонная, подведены инженерные коммуникации. Объект расположен на земельном участке площадью 0,1627 га по адресу: Минская обл., Минский район, аг. Колодищи, назначение: земельный участок для обслуживания капитального строения (здания автозаправочной станции). Срок аренды земельного участка – 30 лет. **Условия использования земельного участка:** возможно в установленном порядке изменение целевого назначения земельного участка и использование его для размещения объектов промышленности, транспорта, связи, энергетики, оптовой торговли, материально-технического и продовольственного снабжения, по заготовке и сбыту продукции, коммунального хозяйства, по ремонту и обслуживанию автомобилей (производственная зона). В отношении капитального строения имеется обременение в виде договора аренды сроком до 9 июля 2014 г.

**Начальная цена предмета аукциона: 217 882 127** рублей (в т.ч. объект – 118 219 722 рубля, право заключения договора аренды земельного участка – 99 662 405 рублей). **Размер задатка: 20 000 000** рублей. Расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих земельных участков, составляют 1 110 331 рубль (с НДС 20 %).

**Продавец:** геологоразведочное республиканское унитарное предприятие «Белгеология» (г. Минск, ул. Некрасова, 7, тел.: (8017) 2921483, 2966772). **Арендодатель земельного участка:** Минский районный исполнительный комитет (г. Минск, ул. Ольшевского, 8, тел. (8017) 2044024).

**Последний день подачи заявлений** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **16 декабря 2011 г. до 12.00. Задаток** для участия в аукционе перечисляется с даты публикации данного извещения **по 16 декабря 2011 г.** включительно.

**Дата и время проведения аукциона: 21 декабря 2011 г. в 12.00**

**Недвижимое имущество** и право заключения договора аренды земельного участка. **Капитальное строение** (инв. № 633/С-6759) – одноэтажное **здание аптеки** с пристройкой общей площадью 75,5 кв.м, 1989 года постройки, фундамент бутовый ленточный, стены блочные, облицованы кирпичом, перегородки блочные, кирпичные, чердачное перекрытие деревянное утепленное, крыша шиферная, подведены инженерные коммуникации. Объект расположен на земельном участке площадью 0,0458 га по адресу: Минская обл., Мядельский район, аг. Сватки, назначение: земельный участок для размещения объектов здравоохранения и предоставления социальных услуг. Срок аренды земельного участка – 99 лет. **Условия использования земельного участка:** возможно в установленном порядке изменение целевого назначения земельного участка и использование его для размещения объектов административного назначения, розничной торговли, объектов производственного назначения, которые не являются источниками вредных веществ, шума и вибрации.

**Начальная цена предмета аукциона: 11 624 653** рубля (в т.ч. объект – 10 268 933 рубля, право заключения договора аренды земельного участка – 1 355 720 рублей). **Размер задатка: 1 000 000** рублей.

**Продавец:** торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Минская Фармация» (г. Минск, ул. Чкалова, 5, тел.: (8017) 2245701, 2244628, 2244621). **Арендодатель земельного участка:** Мядельский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Мядель, пл. Ленина, 1, тел. (801797) 55372).

**Последний день подачи заявлений** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **19 декабря 2011 г. до 12.00. Задаток** для участия в аукционе перечисляется с даты публикации данного извещения **по 19 декабря 2011 г.** включительно.

**Дата и время проведения аукциона: 22 декабря 2011 г. в 10:00**

**лот № 1**

**Недвижимое имущество** и право заключения договора аренды земельного участка. **Капитальное строение** (инв. № 612/С-869) – одноэтажное **здание гаража** общей площадью 1688,3 кв.м, 1980 года постройки, фундамент ленточный, железобетонный, стены и перегородки кирпичные, чердачное перекрытие железобетонное, крыша совмещенная с рулонным покрытием, подведены инженерные коммуникации. Принадлежности: асфальтовое покрытие (2365 кв.м). Объект расположен на земельном участке площадью 0,4884 га по адресу: Минская обл., г. Жодино, ул. Труда, д. 2, назначение: земельный участок для содержания и обслуживания здания гаража. Срок аренды земельного участка – 25 лет. Введены ограничения в использовании части земельного участка площадью 0,0820 га в связи с нахождением в охранной зоне сетей и сооружений канализации. **Условия использования земельного участка:** возможно в установленном порядке изменение целевого назначения земельного участка и использование его для размещения объектов административного назначения, объектов производственного назначения, которые не являются источниками вредных веществ, шума и вибрации.

**Начальная цена предмета аукциона: 890 135 619** рублей (в т.ч. объект – 753 189 609 рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 136 946 010 рублей). **Размер задатка: 89 000 000** рублей. Расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих земельных участков, составляют 1 079 780 рублей (с НДС 20 %).

**лот № 2**

**Недвижимое имущество** и право заключения договора аренды земельного участка. **Капитальное строение** (инв. № 612/С-870) – одноэтажное **здание хранилища для цветов** общей площадью 392,9 кв.м, 1980 года постройки, фундамент ленточный, железобетонный, стены и перегородки кирпичные, чердачное перекрытие железобетонное, крыша совмещенная с рулонным покрытием. Принадлежности: асфальтовое покрытие (1810 кв.м). Объект расположен на земельном участке площадью 0,5361 га по адресу: Минская обл., г. Жодино, ул. Труда, д. 2, назначение: земельный участок для содержания и обслуживания здания хранилища для цветов. Срок аренды земельного участка – 25 лет. Введены ограничения в использовании части земельного участка площадью 0,1199 га в связи с нахождением в охранной зоне сетей и сооружений канализации. **Условия использования земельного участка:** возможно в установленном порядке изменение целевого назначения земельного участка и использование его для размещения объектов административного назначения, объектов производственного назначения, которые не являются источниками вредных веществ, шума и вибрации.

**Начальная цена предмета аукциона: 327 280 757** рублей (в т.ч. объект – 176 959 767 рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 150 320 990 рублей). **Размер задатка: 32 000 000** рублей. Расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих земельных участков, составляют 1 168 007 рублей (с НДС 20 %).

**лот № 3**

**Недвижимое имущество** и право заключения договора аренды земельного участка. **Капитальное строение** (инв. № 612/С-873) – одноэтажное **здание склада** с пристройкой общей площадью 850,5 кв.м, 1980 года постройки, фундамент ленточный, железобетонный, стены блочные, кирпичные, перегородки кирпичные, чердачное перекрытие железобетонное, крыша совмещенная с рулонным покрытием. Принадлежности: асфальтовое покрытие (2104 кв.м). Объект расположен на земельном участке площадью 0,4848 га по адресу: Минская обл., г. Жодино, ул. Труда, д. 2, назначение: земельный участок для содержания и обслуживания здания склада. Срок аренды земельного участка – 25 лет. Введены ограничения в использовании части земельного участка площадью 0,0946 га в связи с нахождением в охранной зоне сетей и сооружений канализации. **Условия использования земельного участка:** возможно в установленном порядке изменение целевого назначения земельного участка и использование его для размещения объектов административного назначения, объектов производственного назначения, которые не являются источниками вредных веществ, шума и вибрации.

**Начальная цена предмета аукциона: 484 703 011** рублей (в т.ч. объект – 348 766 451 рубль, право заключения договора аренды земельного участка – 135 936 560 рублей). **Размер задатка: 48 000 000** рублей. Расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих земельных участков, составляют 1 170 653 рубля (с НДС 20 %).

**Продавец (лоты №№ 1–3):** Минское республиканское унитарное предприятие электроэнергетики «Минскэнерго» (г. Минск, ул. Аранская, 24, тел.: (8017) 2184297, 2238103, 2272111). **Арендодатель земельных участков (лоты №№ 1–3):** Жодинский городской исполнительный комитет (Минская обл., г. Жодино, ул. 40 лет Октября, 7, тел. (801775) 32733).

**Последний день подачи заявлений** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **20 декабря 2011 г. до 12.00. Задаток** для участия в аукционе перечисляется с даты публикации данного извещения **по 20 декабря 2011 г.** включительно.

**Текущий (расчетный) счет для внесения задатка для участия в аукционах: № 3642900000841 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, ул. Мясникова, 32, код 795, УНП 100128686, получатель платежа – фонд «Минскоблгосимущество». Назначение платежа: задаток для участия в аукционе.**

Участник аукциона, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких предметов аукциона, вносит задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона.

**Заявления на участие в аукционах** с прилагаемыми к ним документами принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 310, 312.**

**Информация о предметах аукционов дополнительно размещается на сайте Минского облисполкома www.minsk-region.gov.by на странице фонда «Минскоблгосимущество».**

Аукционы проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Для участия в аукционах в указанный в извещении срок необходимо подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, к которому прилагаются следующие документы: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Консолидированные участники для участия в аукционах к соответствующему заявлению прилагают: оригинал и копию договора о совместном участии в аукционе; заверенную банком копию платежного поручения о перечислении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе; сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью. При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

Фонд «Минскоблгосимущество» вправе отказаться от проведения аукционов (продажи конкретного предмета аукциона) в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала проведения аукциона по каждому объекту, выставляемому на аукцион.

Победители аукциона (претенденты на покупку) обязаны: 1. Подписать протокол о результатах аукциона. 2. В течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения исполнительными комитетами), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка. 3. После совершения действий, названных в пункте 2, в течение двух рабочих дней заключить с продавцом договор купли – продажи недвижимого имущества, с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

# ЗЯМЛЯ «ЧЫРВАНАКНІЖНІКАЎ»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Комплексная інвентарызацыя біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Валожынскага раёна дае падставы разлічваць на яго паступовае ператварэнне ў адзін з цэнтраў экалагічнага турызму і істотную крыніцу валютных заробкаў.**

**Уходзе інвентарызацыі мясцовай біяразнастайнасці, якая праводзілася ў рамках міжнароднага праекта Праграмы развіцця ААН і Глабальнага экалагічнага фонду «Інтэграцыя пытанняў захавання біяразнастайнасці ў палітыку і практыку тэрытарыяльнага планавання ў Беларусі», удалося абагульніць і вядомыя, і малавядомыя звесткі аб прыродным патэнцыяле раёна, па-новаму паглядзець на яго выкарыстанне ў рынкавых умовах.**

## ЗАЙЗДРОСНЫ БІЯРЭСУРС

— Валожыншчына — самабытная тэрыторыя, якая мае ўнікальны рэльеф з перападамі вышынь да 200 метраў. Яна знаходзіцца на стыку дзвюх геаграфічных зон. У раёне 39 відаў дзікіх жывёл і 42 віды раслін, якія ўнесены ў Чырвоную кнігу Беларусі. Дастаткова прыгадаць славутую Налібоцкую пушчу з яе багатай фаўнай і флорай, сярод якіх шмат ахоўных відаў раслін, — гаворыць **Аркадзь СКУРАТОВІЧ, старшы навуковы супрацоўнік навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па біярэсурсах.** Сярод так званых «чырванакніжнікаў» (відаў з Чырвонай кнігі) луннік ажываючы, які расце ў розных кутках раёна, у асобных месцах займае нават гектары! Папуляцыя гэтай расліны тут самая вялікая ў краіне. Цыбуля мядзведжая таксама займае вялікія плошчы і, як выказаўся Скуратовіч, не асобныя ўчасткі глебы, а суцэльныя кварталы. Па самых прыблізных ацэнках батаніка — 50 гектараў! Гэта, па яго словах, сапраўднае багацце, значэнне якога мясцовыя жыхары, ды і не толькі яны, не ўяўляюць да канца. Самае цікавае ў тым, зазначае Скуратовіч, што батанікі рэгулярна знаходзяць у раёне ўсё новыя віды раслін, заолагі — насякомых. Напрыклад, адкрыта трэцяе ў краіне месца пражывання рэдкага матыля — пераліўніцы альпійскай.

У раёне расце шмат ядлоўцу. Падобныя ўнікальныя ландшафты зрэдку сустракаюцца ў Беларусі і мала дзе ў Еўропе. У раёне захавалася каля дзвюх сотняў дрэў, узрост якіх перавышае 200 гадоў. Яны — найстарэйшыя дрэвы Беларусі, якія таксама з'яўляюцца ўнікальнымі прыроднымі аб'ектамі, вартымі ўключэння ў турыстычныя маршруты. На погляд спецыялістаў, па багацці і разнастайнасці і флоры, і фаўны асобныя тэрыторыі раёна месцамі пераўзыходзяць Налібоцкую і нават Белавежскую пушчы. У раёне ёсць участкі, дзе захавалася прырода ў яе некранутым выглядзе, нягледзячы на высяканне лясоў, меліярацыю і іншую дзейнасць чалавека. І гэта прыкладна ў ста кіламетрах ад сталіцы. Вось вам стымул для пераўтварэння раёна ў адзін з цэнтраў экалагічнага турызму.

> **Па багацці і разнастайнасці і флоры, і фаўны асобныя тэрыторыі раёна месцамі пераўзыходзяць Налібоцкую і нават Белавежскую пушчы.**

## ФАРЭЛЬ І ХАРЫУС — РЫБА БЕЛАРУСКАЯ

У Беларусі фарэль сёння водзіцца ўсяго ў некалькіх месцах. Папуляцыя гэтай рыбы ў Валожынскім раёне адна з самых значных у краіне. Фарэлі патрэбны неглыбокія, празрыстыя і хуткія, з камяніста-пясочным дном, рэкі. У раёне такія ёсць. Як і ёсць вадаёмы, прывабныя для харыуса еўрапейскага. Ёсць усе шанцы істотна павялічыць папуляцыі гэтых рыб, але трэба прыкласці намаганні. Прычым нічога звышардынарнага рабіць не патрабуецца. Скажам, не араць берагі рэк з гэтай рыбай да самай вады, пакуль у яе зямля не пачне сыпацца. А фарэль нерасціцца толькі ў выключна чыстай вадзе і ні ў якім разе там, дзе ілістае дно. Сур'ёзным бар'ерам для размнажэння фарэлі і харыуса ў прамым сэнсе становяцца плаціны баброў. Іх збудаванні моцна запавольваюць рух рэк, у выніку ствараецца ненармальнае асяроддзе для гэтых рыб. Навукоўцы заначаюць: там, дзе замацаваўся бабёр, паступова знікае фарэль і харыус. На жаль, папуляцыя бабра ў апошнія гады значна вырасла ў раёне, што становіцца фактарам нестабільнасці для нармальнага існавання іншых відаў. Бо адметная рыса раёна — шмат чыстых малых рэк, якія цяпер апанавалі бабры. Іх вялікая колькасць ужо ўваходзіць у канфлікт з іншымі відамі. Таму зараз распрацоўваецца кампраміснае рашэнне па мінімізацыі будаўніцтва бабрамі плацін у вярхоўях малых рэк, куды фарэль і харыус ідуць на нераст.

Не менш за баброў шкодзіць гэтым рыбам непрадуманая меліярацыя, дакладней, выпрамленне рэчышчаў лясных рачулак, паабапал якіх высякаюцца прыбярэжныя кусты. А пад імі менавіта і харчуецца фарэль. Не спрыяе аднаўленню рэдкіх рыб і дробнае бытавое браканьерства. Як заўважылі мінскія біёлагі ў час даследавання прыроднага патэнцыялу раёна, няма яшчэ ў мясцовых рыбакоў натуральнага імкнення выпусціць назад выпадкова злоўленага харыуса ці фарэль, якую ў нас завуць стронгай. Ды і многія дачнікі часта скідваюць у ваду адходы, нешта бруднае мыюць. Паасобку ўсе гэтыя дробныя парушэнні быццам бы і неістотныя, але разам яны перашкаджаюць аднаўленню рэдкіх відаў рыбы з Чырвонай кнігі.

## «ЗЯЛЁНАЕ ПАЛЯВАННЕ» НА РЭДКУЮ ПТУШКУ

А як зрабіць Валожыншчыну прывабнай і вядомай сярод замежных экатурыстаў? **Міхаіл МАКСІМЕНКАЎ, навуковы эксперт па пытаннях біяразнастайнасці і кіравання экасістэмамі,** лічыць, што з еўрапейцамі трэба працаваць па еўрапейскіх стандартах, укараняць новыя падыходы па арганізацыі экалагічнага турызму на тэрыторыі раёна. Каб не быць галаслоўным, эксперт прапанаваў наладзіць у Валожынскім лясгасе «зялёнае паляванне» на прыгожую і вельмі рэдкую птушку, якая амаль знікла ў Еўропе, — глушца. Яе мала і ў Беларусі, але сустракаецца. Ёсць у Максіменкава ўжо і адпаведны бізнэс-план па стварэнні сучаснай, на ўзроўні еўрапейскіх патрабаванняў, інфраструктуры (аўтастаянка, месцы адпачынку і харчавання, замаскіраваная пад навакольнае асяроддзе будка непадалёку ад традыцыйнага месца знаходжання птушак) для адносна камфартабельнага назірання за такаваннем глушцоў. Рэалізацыя плана намечана на будучую вясну. Калі ўсё пойдзе добра, то можна зарабляць тысячы еўра толькі за прадастаўленую магчымасць паназіраць, зняць на фота ці відэа глушцоў на такаванні, палавіць фарэль ці паблукаць з суправаджальнікам па рэліктавых балотах. Вось гэта і будзе гаспадарскае выкарыстанне мясцовага біярэсурсу. Дзіўна: глушэц, які ўключаны ў спіс ахоўных відаў Міжнароднага саюза аховы прыроды, у Беларусі з'яўляецца паляўнічым відам. Відаць, невыпадкова апошнім часам яго колькасць у краіне скарацілася ў некалькі разоў.

## ЦІ ЦЭНІМ ТОЕ, ШТО МАЕМ?

Можна і трэба ў раёне актыўна зарабляць на экатурызме, лічыць Міхаіл Максіменкаў. Ёсць усе ўмовы стварыць, напрыклад, адну з лепшых у краіне экалагічных сцежак, якая б стала і ўзорам для іншых раёнаў, і вядомай далёка за межамі краіны. Не секчы лес, не забіваць звяроў і птушак на паляванні, а хоць бы проста пракласці сцежку. Але такое ўражанне, што прадстаўнікоў мясцовай улады «раскрутка» прыроднага патэнцыялу з мэтай развіцця турызму калі і цікавіць, то ў другую ці трэцюю чаргу. Мяркую па пытаннях і заўвагах, якія прагучалі ў ходзе абмеркавання праекта новай схемы землеўпарадкавання раёна. Яно днямі адбылося ў Валожыне. З дакладамі перад мясцовай уладай выступілі мінскія спецыялісты і навукоўцы. Старшыня райвыканкама Уладзімір Навумовіч і старшыня райсавета Марыя Іода ацанілі значэнне дакумента як вельмі важнага для будучыні раёна і яго жыхароў, асабліва ў частцы выкарыстання біярэсурсаў. А вось кансалідаванае пытанне ад групы старшынь сельсаветаў тычылася таго, як максімальна спрасціць перадачу зямлі ад аднаго ўласніка другому, бо даводзіцца пераадольваць шмат бюракратычных перашкод, марнаваць час на папяровую валакіту. Безумоўна, пытанне актуальнае, але яно, прабачце, не па тэме размовы. Як і пытанне з месца наконт скарачэння колькасці вясковага насельніцтва: як прапанаваная схема можа палепшыць дэмаграфічную сітуацыю ў раёне, дзе з 1959 года на 49 тысяч стала менш людзей?

> **У многіх вяскоўцаў сутнасць агратурызму і экатурызму ўспрымаецца прымітыўна і аднабакова. У першым выпадку турыстаў трэба завесці ў хату і добра напаіць, у другім — добра напаіць на паляне, у будане ці на беразе рэчкі, возера.**

Увогуле мясцовым жыхарам, як здаецца, экалагічны турызм яшчэ не ўяўляецца сур'ёзным рэнтабельным заняткам. Для іх гэта хутчэй нейкае экзатычнае і малазразумелае хобі зацюканых аўтамабільнымі заторамі, смуродам выхлапных газаў заможных іншаземцаў-дзівакоў, якім для поўнага шчасця не хапае толькі паназіраць у лясной цішыні за рэдкімі ў Еўропе дзікімі жывёламі, птушкамі і раслінамі. Можа, таму многія вяскоўцы сутнасць агратурызму і экатурызму ўспрымаюць прымітыўна і аднабакова. У першым выпадку — завесці ў хату і добра напаіць, у другім — добра напаіць на паляне, у будане ці на беразе рэчкі, возера. Анекдот, скажаце. Так, але вельмі блізкі да жыцця. Як і гэты аргумент на карысць развіцця экатурызму. Скажам, можна высекчы ўчастак прыгожага лесу і прадаць драўніну. А можна сюды з году ў год прыводзіць турыстаў і зарабляць на гэтым грошы. Але пакуль неяк больш зразумелай з'яўляецца высечка лесу. Ёсць у раёне палі з нізкім балам зямлі, дзе традыцыйна малая ўраджайнасць. Але чамусьці іх аруць, засейваюць, збіраюць ну вельмі сціплы ўраджай. І гэта пры тым, што выдаткі на паліва, зарплату, плюс амартызацыя тэхнікі, істотныя. А больш рацыянальна было б гэтыя плошчы заняць пад новы лес.

## «ЗОНЫ СПАКОЮ» — ГЭТА ТОЛЬКІ ПАЧАТАК

Зразумела, новая схема землеўпарадкавання раёна арыентаваная ў першую чаргу на вырашэнне эканамічных задач, паляпшэнне сацыяльных умоў жыцця людзей. Разам з тым у схеме прадугледжана захаванне біяразнастайнасці, развіццё экатурызму. Ёсць намер стварыць у раёне новы ландшафтны або геалагічны заказнік рэспубліканскага значэння. Гэта таксама павысіла б шанцы трапіць мясцовым прыродным славутасцям у арбіту міжнародных турыстычных аб'ектаў. Для захавання біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці прымаюцца іншыя захады. Былі ўведзены абмежаванні па паляванні на вадаплаўных і водна-балотных птушак у перыяд іх вясновага пралёту. Тэрыторыям, дзе адзначаецца высокая канцэнтрацыя рэдкіх і ахоўных відаў птушак, нададзены статус «зон спакою». У іх лік увайшло, у прыватнасці, Сакаўшчынскае вадасховішча — там у перыяд міграцыі канцэнтруюцца чароды ў сотні птушак. У «зонах спакою» забаронена паляванне на птушак і жывёл, у першую чаргу на «чырванакніжнікаў». Такія меры прынятыя ўпершыню, і яны ўжо далі эфект. Прадугледжаны мерапрыемствы па рэгуляванні колькасці дзіка, янотападобнага сабакі і лісіцы ў месцах цецеруковых такавішчаў і гнездавання. Гэта дазволіць стварыць спрыяльныя ўмовы для падтрымання колькасці цецерука, папуляцыя якога скарачаецца.

У раёне, як расказалі відавочцы, ёсць удалы прыклад спалучэння азнаямлення турыстаў з нашай культурнай спадчынай і адметнасцямі беларускай прыроды. У самым пачатку Налібоцкай пушчы знаходзіцца вёска Малая Люцінка, слынная тым, што ў ёй пражыў шмат гадоў (з сярэдзіны 1860-х да сярэдзіны 1880-х г.г.) класік беларускай літаратуры, славуты беларускі драматург, паэт, тэатральны і грамадскі дзеяч Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. Менавіта ў вёсцы пачынаецца турыстычны маршрут па мясцовых краявідах. Так, пэўныя зрухі ёсць. Але гэта толькі пачатак асваення ўнікальнага прыроднага патэнцыялу гэтай прыгожай зямлі «чырванакніжнікаў».

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**
*Валожынскі раён.*

# ШАШКІ

*Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА.*

### АЎТАР З НАВАПОЛАЦКА



Ім з'яўляецца Пётр Шклудаў. Па шашачнай кампазіцыі ён быў мацнейшым у 4 і 5 першынствах Беларусі па стварэнні праблем-64, а ў 11-м — у раздзелах праблем-64 і мініяцюр-100. Складальнік і сёння мае тытул чэмпіёна краіны. Таму Міністэрства спорту і турызму прысвоіла яму ганаровае званне нацыянальнага майстра. Пачынаем аўтарскі конкурс-15 на яго прызы. Акрамя таго, гэты конкурс — класіфікацыйны з нормай першага спартыўнага разраду. Усяго будзе 24 заданні. Вось першае з іх:



**Белыя:** c1, дамкі c5, e7 (3). **Чорныя:** a7, c3, дамка a1 (3). Выйгрыш.

### «ПАГОДА Ў ДОМЕ-2011»

Конкурс працягваецца заданнем № 22:



**Белыя:** a3, a5, e3, f2, g3, h2 (6). **Чорныя:** a7, b8, c7, e7, h4, h6 (6). Перамога белых.

* * *

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

### ПЕРШЫНСТВА ПІНСКА-4

На шашачных сайтах апублікаваны яго канчатковыя вынікі. Было яно адкрытым. Вызначаліся ў ім украінцы Міхаіл Левандоўскі (першае месца — 14,5 ачка), Уладзімір Похіл (чацвёртае — 13,25) і Анатоль Ныч (шостае — 12,5), беларусы Пётр Шклудаў (другое — 14,25), Аляксандр Сапегін (трэцяе — 14,0) і Аляксандр Кагоцька (пятае — 13,0).

Пазнаёмцеся з лепшым творам спаборніцтва:

**Белыя:** 24, 25, 30, 35, 40, 41, 47 (7). **Чорныя:** 9, 12, 15, 27, 36, 38, 39 (7). М. Левандоўскі (7,5 ачка): 42 (387) 34, 3, 343, 25, 24, 24+.

### РАШЭННІ

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў.

Аўтарскі-14/19 (В. Шульга): 19, 9, 7, 5, 6, 47x.

**«Пагода ў доме»-8/16** (М. Грушэўскі): h6, g5, e3, a7 (g7A) d4 (h6) c3 (g5) d2 (h4) e1x. A(b4) d4x.

**Бліц-62/5** (І. Івацка): № 1. 42-38, 18, 34, 2, 34x, па-за конкурсам: № 2. 4842, 41, 25, 29x і № 3. 1813, 1711, 2, 48x.

Папярэднія заданні аўтарскіх конкурсаў-11-14, а таксама бліцаў-57-61 правільна выканалі: Аляксандра Камінская (Вілейка), І. Ананіч і К. Козел (Гродна), І. Астроўскі і А. Нікіфараў (Мінск), А. Шурпін (Клімавічы), В. Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна), У. Сапяжынскі (Рагачоў), А. Кіслы (Узда), У. Валчкоў (Маладзечна), А. Белы (Наваполацк), С. Нячаеў (Баранавічы), У. Бандарык (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна) і інш. Сярод іх убачылі іншыя развязкі: І. Астроўскі — 3. 45/40x у заданні № 4 аўтарскага-14, К. Козел — 1. 33/3/5 у заданні № 5 таго ж конкурсу і В. Талкачоў — 1. ed2 c3:e1 2. gh4 3. h:f6/h4/f2x у заданні № 4 бліца-58 і 1. 48-42 38:47 2. 39-34/41-37x у заданні № 4 бліца-59.

## Ну і ну!

### СКРАЛІ ПЕЧ І ПЛІТУ

У Лепельскі раённы аддзел унутраных спраў па дапамогу звярнуўся рабочы, які паведаміў, што нехта, узламаўшы дзвярныя запоры, пракраўся ў яго дачны дом і скраў металічную печ і газавую пліту. Шкоду ацанілі ў 2,2 мільёна рублёў. Падазраецца беспрацоўны, раней судзімы за крадзеж. Заведзена крымінальная справа. Выкрадзенае вернута гаспадару.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Зязюля. Ластаўка. Улар. Уса. Бос. Амба. Полка. Амфара. Норка. Маг. Ротар. Зорка. Топ. Рок. Кран. Карэ. Адамар. Пострыг. «Оза». Атара. Рака. Маркс. Шакал. Баба. Марэна. Арол. Камісіянер. **Па вертыкалі:** Крыжадзюб. Дом. Сфера. Каза. Амар. Арматура. Клімат. Маа. Эрас. Ярус. Гало. Барак. Лабан. Сава. Эра. Біном. Агрэсар. Папа. Алі. Парсек. Рэтра. Літара. Рак. Оптыка. Сівграк. Галкінер.

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.38 | 17.10 | 8.32 |
| Віцебск — | 8.33 | 16.54 | 8.21 |
| Магілёў — | 8.28 | 17.00 | 8.32 |
| Гомель — | 8.18 | 17.03 | 8.45 |
| Гродна — | 8.52 | 17.26 | 8.34 |
| Брэст — | 8.46 | 17.33 | 8.47 |

### Месяц

***Апошняя квадра 18 лістапада. Месяц у сузор'і Льва.***

### Імяніны

***Пр.*** *Еўдакіі, Аляксандра, Васіля, Вікенція, Георгія, Іосіфа, Мікалая.*

***К.*** *МАЦІ БОЖАЙ ВАСТРАБРАМСКАЙ, Гертруды, Малгажаты, Марка.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.




## Дзве даты

## 16 лістапада

**1914 год** — нарадзіўся (вёска Пятровічы, зараз Смалявіцкі раён) Язэп Семяжон (Іосіф Ігнатавіч Семяжонаў), беларускі пісьменнік, перакладчык, заслужаны работнік культуры Беларусі. У ягоным мастацкім перакладзе ў Беларусі выйшлі творы У. Шэкспіра, Р. Бёрнса, Дж. Байрана, Ш. Пецефі, А. Міцкевіча і іншых аўтараў. Пераклаў з лацінскай мовы паэму М. Гусоўскага «Песня пра зубра». Выступаў і як крытык, гісторык і тэарэтык мастацкага перакладу. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1982).



**1581 год** — Іван Грозны ў парыве гнеў забіў свайго старэйшага сына Івана, вельмі падобнага на яго і норавам, і такой жа схільнасцю да жорсткіх і крывавых спраў. Гэтая драматычная падзея не толькі стала пралогам да спынення дынастыі Рурыкавічаў, але і праз трыста гадоў паслужыла падставай для мастака Ільі Рэпіна напісаць знакамітую карціну «Іван Грозны і сын яго Іван». Гэтае палатно, якое знаходзіцца ў Траццякоўцы, у пачатку XX стагоддзя падвергнулася нападу псіхічна хворага, які з крыкам «Даволі крыві!» парэзаў яго брытвай. Карціну выратавалі рэстаўратары, і сёння яна служыць яркім напамінам аб адным з сумных фрагментаў расійскай гісторыі.

## Цытата дня:

***«Толькі нікчэмныя людзі пастаянна думаюць над тым, што трэба паважаць, а што — любіць. Чалавек сапраўды шырокай душы, не задумваючыся, любіць усё, што вартае павагі».***
**Люк дэ Вавенарг (1715—1747), французскі пісьменнік.**

# КУРЫЦА

**Курыца (певень, куры) — свойская птушка, гадаванне якой здаўна стала неад'емнай часткай хатняй гаспадаркі ўсходніх славян, а з цягам часу нават сфарміравалася ў адну з сельскагаспадарчых галін (птушкагадоўлю). У народнай культуры курыца стала сімвалам пладавітасці і надзялялася шлюбна-эратычнай сімволікай.**

- Пасля павароту сонца «на лета» ў народзе казалі, што дзень павялічыўся на «курыны» крок.
- У славян існавала забарона асвячаць курынае мяса на Вялікдзень. Лічылася, што курыца «асвяцілася» яйкам. У адным з паданняў распавядаецца, што на трапезе іўдзеяў, якія высмейвалі ўваскрэсенне Хрыста, смажаны певень раптоўна вярнуўся да жыцця і заспяваў. З тае пары існуе забарона несці курынае мяса ў царкву.
- Курыца стала абрадавай ежай у дні пачатку і заканчэння сельскагаспадарчых работ. Так, на Беларусі ў дзень засевак і дзень заканчэння сяўбы абавязкова рабілі багатую вячэру з курыным супам. Курынымі локшынамі частаваліся ў дні восеньскіх святаў, напрыклад Кузьмінак.
- Пеўня выкарыстоўвалі ў варажбе на Раство: дзяўчаты раскідвалі па падлозе гарошыны і пускалі пеўня. Чыю гарошыну ён здзяўбе першай, тая першай і замуж пойдзе.
- Паўсюдна было вядома павер'е: калі курыца заспявае, як певень, значыць у ёй жыве нячыстая сіла, а таму быць бядзе. Каб папярэдзіць бяду, такую курыцу закопвалі жывой у зямлю.
- Часам курыца асацыявалася з чалавечым глупствам. Выраз «курыныя мазгі» з'яўляецца таму пацвярджэннем.
- У славян практычна паўсюдна забаранялася ўжываць у ежу курыцу-квактуху.
- Забіць курыцу для яды мог толькі мужчына. Жанчыне любога ўзросту было забаронена забіваць птушак. Галаву курыцы трэба было адсекчы на калодцы, на якой seклі дровы.
- У час святочнага абеду курыцу на стол падавалі цалкам. Самы сталы ў сям'і — гаспадар — павінен быў пры ўсіх разламаць курыцу рукамі на столькі частак, колькі чалавек было за сталом.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнемся

Ёсць такія жанчыны — прышые табе вешалку да паліто, а потым будзе казаць, што аддала табе маладосць.

☺

**Прыбіралася ў навушніках... Паўдома прыбрала з выключаным пыласосам.**

☺

Ліст пашукавіку «Гугл».

«Дарагі «Гугл», калі ласка, перастань паводзіць сябе, як мая жонка: дазволь мне заканчваць фразы самому, не падказвай іх заканчэнне».



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by; e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 5485. Нумар падпісаны ў 19.30 15 лістапада 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12